WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

13 СТУДЗЕНЯ 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 6
(26870)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ ПАСТАВІЎ ЗАДАЧУ АПТЫМІЗАВАЦЬ СТРУКТУРУ ІНВЕСТЫЦЫЙ, ЯКІЯ ПРЫЦЯГВАЮЦЦА Ў БЕЛАРУСЬ

Аб гэтым прэм'ер-міністр заявіў учора ў Светлагорску на нарадзе, што праходзіла на базе РУП «СВА «Хімвалакно». На ёй разглядаліся перспектывы развіцця беларускіх прадпрыемстваў, якія выпускаюць хімічныя валокны, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Цяпер у структуры інвестыцыйнага партфеля рэспублікі пераважаюць аб'екты не толькі вытворчага прызначэння, але і сацыяльныя. «Але ёсць рэчы, якія можна адкласці на пасля. Разам з тым інвестыцыі ў машыны, абсталяванне, што вызначае наша далейшае развіццё, неабходна павялічваць», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. «Інвестыцыі — гэта тое, што будзе працаваць на заўтра, што дасць дадатковую вартасць», — дадаў ён.

Міхаіл Мясніковіч лічыць, што ў гэтым пяцігоддзі неабходна ўдзяліць больш увагі хімічнай прамысловасці, а таксама біялагічнай і фармацэўтычнай. Зрабіць гэта трэба для таго, каб забяспечыць выкананне паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, зацверджаных на IV Усебеларускім народным сходзе. Ён нагадаў, што ВУП Беларусі за 2011—2015 гады павінен павялічыцца ў 1,62-1,68 раза. «Але гэта не значыць, што ўсе галіны могуць прыбавіць аднолькава. Мы павінны больш увагі ўдзяліць хімічнай, біялагічнай і фармацэўтычнай прамысловасцям. Астатнія галіны рост больш як у 1,6 раза зрабіць не змогуць», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

Пры гэтым ён дадаў, што хімічная прамысловасць у Беларусі недабудавана яшчэ з часоў Савецкага Саюза. «Нам не хапіла сіл і ў рамках СССР, і ў наступныя гады, а трэба было выходзіць на продаж гатовых вырабаў, а не гандляваць паўфабрыкатамі і сыравінай. Для гэтага былі ўсе падставы», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. Напрыклад, нават цяпер, нягледзячы на тое, што плануецца выйсці на больш глыбокую перапрацоўку нафты, усё роўна большая доля прадуктаў, якія выпускаюцца, — гэта паліўная сыравіна. А трэба ісці на экспарт прадукцыі з больш высокай дабаўленай вартасцю.

«Вядома, мы нарасцілі аб'ёмы вытворчасці за гэты час. Сёння і аб'ёмы не тыя, і прадукцыя не тая. Але і патрабаванні ў свеце зусім іншыя, а ў нас адкрытая эканоміка, і гэта значыць сур'ёзная канкурэнцыя. Але тое, што мы вырабляем і прадаём на экспарт, — таксама не тое. Мы прадаём паўфабрыкаты ў іншыя краіны для таго, каб там з іх зрабілі тавар з больш высокай дабаўленай вартасцю, які ў канчатковым выніку з'яўляецца на нашым рынку», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч і дадаў, што гэту праблему неабходна вырашыць у бліжэйшы час.

«У планах урада — «наваліцца» на хімічную прамысловасць, дабудаваць яе, узняць да сусветнага ўзроўню», — сказаў прэм'ер-міністр. Іншыя краіны гэта таксама робяць. Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, тое, што сёння з'яўляецца прадметам экспарту, заўтра ўжо можа быць не запатрабавана, і тады ў беларускіх прадпрыемствах не будзе перспектыў.

Лельчыцкі торт на стары Новы год!

Жыхары горада Лельчыцы рыхтуюцца да сустрэчы старога Новага года.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«ДЫРЭКТЫВА АЗНАЧАЕ, ШТО ЎЛАДА І ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ РАЗАМ УСВЕДАМЛЯЮЦЬ НАЯЎНАСЦЬ ПРАБЛЕМ І ГАТОВЫЯ ІХ ВЫРАШАЦЬ»

Погляд

Упоўні дзень 2010 года Прэзідэнт падпісаў Дырэктыву № 4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь». Такога дакумента беларускія прадпрымальнікі чакалі з красавіка 2010 года, калі Прэзідэнт у сваім звароце да беларускага народа і Нацыянальнага сходу паабяцаў прыняць гэты дакумент. Яго стварэнне і дапрацоўка цягнуліся ажно да самага канца 2010 года, і некаторыя прадстаўнікі бізнэс-супольнасці ў пэўныя моманты нават выказвалі занепакоенасць ходам распрацоўкі дырэктывы. Але ўсё-такі 31 снежня Дырэктыва № 4 была падпісаная, і прадпрымальнікі такім чынам атрымалі ў нейкім сэнсе падарунак пад Новы год. Сёння мы вырашылі пацікавіцца ў прадстаўнікоў вядучых беларускіх бізнэс-саюзаў, ці задаволеныя дзелавыя колы самім фактам прыняцця дырэктывы і яе зместам.

Аляксандр КАЛІНІН, старшыня ГА «Беларускі саюз прадпрымальнікаў»:

— Менавіта дзелавая супольнасць ініцыявала прыняцце Дырэктывы № 4 як стратэгічнага дакумента, які б зарыентаваў усе нашы дзяржаўныя органы на пэўную лінію развіцця эканомікі. Таму мы з вялікай увагай вывучалі тэкст дырэктывы, знайшлі вельмі шмат нашых прапаноў і ацэньваем гэты дакумент вельмі станоўча, бо там сапраўды дадзены стратэгічны напрамак развіцця эканомікі краіны, закладзены перадумовы для сур'ёзнай лібералізацыі ўмоў эканамічнай дзейнасці. Усталяванне і абвяшчэнне канчатковай мэты лібералізацыі — стварэння безбар'ернага дзелавога асяроддзя — не можа ў бізнэсу выклікаць пытанняў, бо гэта абсалютна правільная мэта. І калі мы гэтага даб'ёмся, то мы ўвойдзем у 30-ку краін у свеце з найлепшымі ўмовамі для вядзення бізнэсу.

— Якія, на ваш погляд, самыя важныя напрамкі ў Дырэктыве № 4?

— Вельмі важным з'яўляецца развіццё канкурэнцыі і мінімізацыя дзяржрэгулявання. Мы вельмі даўно дабіваліся свабоднага цэнаўтварэння — і вось гэта ёсць у дырэктыве. Засталося толькі дачакацца пераліку сацыяльна значных тавараў і пераліку манапалістаў, бо тут пакуль лозунг абвешчаны, але канкрэтнага дакумента няма.

СТАР. 2

МІЛІЦЫЯ ПРАВЕРЫЦЬ НАЧНЫЯ ДЫСКАТЭКІ

Ў гэтыя выхадныя міліцыя правярыць культурна-забаўляльныя ўстановы Мінскай вобласці ўсіх формаў уласнасці і дыскатэк.

Паводле звестак УУС Мінаблвыканкама, звязана гэта, у першую чаргу, з тым, што з 12 студзеня ўступае ў законную сілу Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 лістапада мінулага года «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях». Законам у кодэкс уведзены артыкул 17.12, згодна з якім уладальнікаў начных дыскатэк і клубаў могуць аштрафаваць, калі ў гэтых забаўляльных установах пасля дзесяці гадзін вечара будуць знаходзіцца непаўналетнія. Памеры штрафу могуць складаць ад 10 да 50 базавых велічынь.

Ігар ГРЫШЫН.

Сяргей РУТЭНКА:

«НЕКАТОРЫЯ БАЛЕЛЬШЧЫКІ ЛІЧАЦЬ МЯНЕ ПРАДАЖНЫМ»

Самы дарагі гандбаліст свету, якім беларус Сяргей Рутэнка стаў летам 2009, калі перайшоў у іспанскую «Барселону» (сума яго кантракта склала 1,2 мільёна еўра, а гадавая зарплата каля 240 тысяч еўра), нарэшце можа выступаць за беларускую зборную. Падчас кароткага адпачынку ў клубе спартсмен прыехаў у Мінск на трэніровачны збор нацыянальнай каманды. На сустрэчы з журналістамі гандбаліст расказаў пра стан спраў у камандзе, сваю кар'еру ў «Барселоне» і жыццё ў Іспаніі, а таксама адкрыў некаторыя сакрэты свайго кантракта.

— Сяргей, пачнём з таго, як вы зараз апынуліся ў Беларусі?

— Здарылася нарэшце тое, чаго хацела наша федэрацыя. Я гэтага таксама хацеў. Вось цяпер удалося вырашыць усе юрыдычныя пытанні. І я прыехаў на збор нацыянальнай каманды, каб патрэніравацца разам з хлопцамі, а таксама каб правесці ў Мінску невялікія канікулы, якія дала «Барселона».

— Як складваецца ваша кар'ера ў «Барселоне»?

— Ёсць як плюсы, так і мінусы. Мінусы — гэта спартыўныя дасягненні. Але сезон яшчэ не скончаны. Магчыма, удача не адвернецца ад нас у чэмпіянаце Іспаніі. Пакуль мы лідзіруем.

— Што стала вырашальным момантам у прыняцці рашэння выступаць за зборную Беларусі?

— Я выступаў у складзе моладзевай зборнай Беларусі, але потым гуляў за нацыянальную каманду Славеніі, таму, каб вярнуцца, я мусіў вытрымаць каранцін. А пасля знайшліся юрыдычныя тонкасці, якія маглі трактавацца неадназначна... Іспанцы хацелі, каб я выступаў за іх зборную. Але да маёй вялікай радасці, усе гэтыя спрэчныя моманты ўдалося абысці.

— Не шкадуеце, што не дапамаглі нашай зборнай раней?

— Я выступаў за каманду Славеніі, бо мяне не выклікалі ў зборную Беларусі. Мне трэба было дзесьці трэніравацца, падтрымліваць форму... Не заставалася нічога іншага, і я прыняў такое рашэнне. Я вельмі рады, што з прыходам Уладзіміра Канаплёва (старшыня федэрацыі гандбола. — **Аўт.**) сітуацыя змянілася, усё стала на свае месцы. Як толькі з'явіліся намёкі вярнуцца, я адразу пагадзіўся. Але і пра крокі, якія я зрабіў у мінулым, я не шкадую. Я не хаваў і тады, чаму я так зрабіў. Я ўсіх хлопцаў у камандзе папярэдзіў, ніхто на мяне крыўды не трымаў. Мне вельмі важна было не згубіць у гэтай сітуацыі сяброў, блізкіх людзей, і яны мяне зразумелі.

— Наколькі сур'ёзна разглядалі запрашэнне ад зборнай Іспаніі?

— Тую душэўную раўнавагу, якую я знайшоў тут, нельга ацаніць у матэрыяльным выяўленні. Зразумела, у іспанцаў больш магчымасцяў, але апынуўшыся нават у крыху горшых умовах, чым тыя, у якіх я трэніруюся там, я знайшоў значна больш. Пабыць некалькі дзён побач з людзьмі, блізкімі па менталітэце — гэта вельмі важна. Тым больш што цяпер у зборнай гуляе мой родны брат.

— Летам 2009-га з аднаго іспанскага клуба, «Сьюдад Рэале», вы перайшлі ў іншы, «Барселону». Як вядома, гэтыя каманды і іх заўзятары з'яўляюцца заклятымі супернікамі. Як сустрэлі вас балельшчыкі новай каманды?

— У гэтым плане маё сумленне чыстае. Я не сам перайшоў, мяне прадалі. У клуба былі свае інтарэсы, і «Барселона» зрабіла прапанову, ад якой «Сьюдад-Рэале» не змог адмовіцца. Для некаторых балельшчыкаў я іх гулец. Для іншых я — «прадажны». Але калі пра цябе размаўляюць, значыць, ты нечага варты.

— Як наладжаны ваш побыт у Іспаніі?

— За гэта вялікі дзякуй маёй жонцы. Яна ўсё імкнецца арганізаваць такім чынам, каб я мог займацца сваёй прафесіяй. Магу сказаць, што мой спартыўны рост пайшоў пасля вяселля.

СТАР. 2

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫЗВАЛІЎ ГЕНЕРАЛ-МАЁРА ІГАРА АЗАРОНКА АД ПАСАДЫ КАМАНДУЮЧАГА ВПС І ППА

Прэзідэнт Беларусі ўказам ад 11 студзеня вызваліў генерал-маёра Ігара Азаронка ад пасады камандуючага Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны Узброеных Сіл.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Грошы

ДОЛАРУ ПРАДКАЗВАЮЦЬ РАДАСНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ?

Паводле сцвярджэнняў лепшых валютных аналітыкаў свету па версіі агенцтва Bloomberg, амерыканская валюта сёлета будзе самым выгадным аб'ектам для інвестыцый

Ігар ШЧУЧЭНКА

Упрыватнасці, галоўны стратэг кампаніі Вэлс Фарго (базіруецца ў Сан-Францыска) Нік Бененбрук, які займае верхні радок у рэйтынгу валютных аналітыкаў агенцтва, прагназуе ўмацаванне долара на 5 працэнтаў у пары з еўра ў 2011 годзе. Будзе ён умацоўвацца, лічаць апытаныя Bloomberg аналітыкі, і да японскай іены, і да брытанскага фунта стэрлінгаў. Паводле іх меркавання, паўплывае на гэта тое, што ўзнаўленне эканомікі ЗША будзе ісці больш хутка, чым у еўразоне, Японіі ці нават Вялікабрытаніі. Магчыма, эксперты маюць рацыю, і гэты прагноз цалкам спраўдзіцца. Што, пагадзіцеся, стане шчодрым падарункам для ўсіх, хто трымае свае зберажэнні ў валюце: сумнявацца пры выбары СКВ для назапашання быццам бы не выпадае. Толькі падзеі на валютных рынках далёка не заўсёды апраўдваюць выказаныя аналітыкамі «надзеі», а таму не трэба асабліва разлічваць на абсалютную дакладнасць апошніх.

— Рэкамендацыі арыентавацца на долар даюць рэйтынгавыя агенцтвы ці транснацыянальныя банкі, штаб-кватэры якіх знаходзяцца ў тых жа Злучаных Штатах, — каментуе згаданы прагноз эканамістаў **эксперт «Звязды», дэкан эканамічнага факультэта БДУ, прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ**. — Гэта значыць, магутнасць, сіла долара трымаюцца сёння на мінулым аўтарытэце ЗША, на манаполіі гэтай краіны на фінансавую інфармацыю, на манаполіі Злучаных Штатаў на рэзервовую валюту. Як толькі вера ў долар, як рэзервовую валюту, хоць крыху пахіснецца, так ён і абваліцца, прычым абваліцца вельмі істотна. Запланаваны эканамічны рост у ЗША сапраўды будзе большы, чым у Еўропе, але трымаецца ён на друкаванні ўсё новых і новых долараў.

СТАР. 2

КАНСУЛЬТАЦЫІ НАКОНТ ПРЫЗЫВУ НА ТЭРМІНОВУЮ СЛУЖБУ — ПА ТЭЛЕФОНЕ

або на прыёме ў раённым ваенным камісарыяце, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны.

У ходзе правядзення чарговага прызыву грамадзян на тэрміновую ваенную службу Генеральным штабам Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь да 31 студзеня 2011 года наладжана правядзенне кансультацый. Інфармацыю, якая цікавіць грамадзян, можна атрымаць, патэлефанаваўшы па нумарах 297 18 92 і 297 17 81 штодня, акрамя выхадных і святочных дзён, з 15.00 да 17.00. Да 27 студзеня кансультацыі праводзяцца таксама па чацвяргах з 15.00 да 17.00 у Дзяржаўнай культурна-забаўляльнай установе «Цэнтральны Дом афіцэраў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь» (вул. Чырвонаармейская, 3), кабінет № 14.

Ігар ГОЛАД, *«Мінск—Навіны».*

ВАНДАЛЫ СУПРАЦЬ НАВАГОДНІХ УПРЫГАЖЭННЯЎ

У Магілёве невядомыя зламалі ногі святлодыёднаму аленю.

Прадпрыемства «Магілёўгарсвятло» заявіла аб стратах, звязаных з асвятленнем і ўпрыгажэннем абласнога цэнтра. Навагоднія гірлянды і іншыя святлодыёдныя ліхтары некаторыя грамадзяне спрабавалі перанесці на ўласныя падворкі і ў кватэры. Апошнім пацярпеў алень у кампазіцыі, усталяванай у цэнтры Магілёва насупраць галоўнай ёлкі. Святлодыёдныя ёлкі і жывёлы вельмі радавалі магілёўцаў: усе святы там было не праціснуцца сярод аматараў святочных фотаздымкаў. Аднак знайшліся і тыя, хто захацеў скрасці аднаго з бліскучых аленяў. А калі не атрымалася, дык зламалі яму дзве нагі. У выніку спецыялістам прадпрыемства давялося нанова пераплятаць аленя, што каштавала не толькі шмат часу, але і грошай — каля 7 мільёнаў рублёў.

Ілона ІВАНОВА.

КОММУНАЛЬНОЕ ТОРГОВО-ПРОМЫШЛЕННОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ «БЕЛРЫБА»

в соответствии с решением Минского городского исполнительного комитета от 29 декабря 2010 г. № 3354

СООБЩАЕТ О СВОЕЙ РЕОРГАНИЗАЦИИ

в форме выделения из его состава коммунального дочернего торгово-производственного унитарного предприятия «Нарочь».

Требования кредиторов принимаются по адресу:

г. Минск, ул. Радиальная, д. 56. Телефон для справок: **295 91 25**.

УНП 190000166

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У АЎСТРАЛІІ З'ЯВІЎСЯ «ГОРАД-ЗДАНЬ»

Цэнтр трэцяга па велічыні горада Аўстраліі, Брысбена, цалкам затоплены. Вада накрыла амаль 20 тысяч дамоў, затапленне пагражае больш як 50 прыгарадным зонам.

Каментуючы становішча ў горадзе, у СМІ Брысбен назвалі «горадам-зданню», а адзін з мясцовых жыхароў у гутарцы з BBC News параўнаў яго з месцам здымак фільма-катастрофы. Па словах гараджаніна, Брысбен цалкам разбураны, у затопленыя дамы папросту заплываюць змеі і іншая жыўнасць. Большасць яго суседзяў эвакуявалася, на месцы засталіся толькі тыя шчасліўчыкі, у якіх дамы былі вышэй узроўню затаплення. Выхад з берагоў ракі Брысбен неўзабаве прывядзе да поўнага затаплення больш як дзвюх тысяч дарог, а таксама частковага затаплення 12 тысяч дамоў. Цяпер у горадзе не працуюць аўтобусы, служба вывазу смецця, адключаны святлафоры. Як паведамляюць улады, 12 чалавек загінула, зніклымі без вестак лічацца 43 чалавекі. Стыхійнае бедства на паўночным усходзе Аўстраліі ў штаце Квінсленд было выклікана праліўнымі дажджамі, якія не спыняліся там некалькі тыдняў. Мяркуецца, што шкода ад яго перавысіць шкоду ад паводкі 1974 года, якая да цяперашняга часу лічылася самай разбуральнай за гісторыю штата.

ПОЛЬСКІ ПРЭМ'ЕР СПЫНІЎ АДПАЧЫНАК З-ЗА ДАКЛАДА МАК

Прэм'ер-міністр Польшчы Дональд Туск спыніў адпачынак і вяртаецца ў краіну ў сувязі з апублікаваннем даклада Міждзяржаўнага авіяцыйнага камітэта (МАК) з нагоды крушэння самалёта прэзідэнта Польшчы Леха Качыньскага. На 18 студзеня ў Польшчы запланавана спецыяльнае пасяджэнне камісіі Сойма па абароне, прысвечанае дакладу МАК.

У дакладзе МАК, які быў прадстаўлены ў Маскве 12 студзеня, віна за катастрофу ўскладаецца на экіпаж. На думку экспертаў, дзеянні экіпажа ў метэаўмовах, якія склаліся, былі няправільнымі; акрамя таго, на іх ажыццяўляўся ціск з боку высокапастаўленых пасажыраў самалёта. МАК таксама высветліў, што няправільнае рашэнне пра пасадку магло быць прынятае экіпажам на падставе недакладных сведчанняў прыбораў — значэнні датчыкаў атмасфернага ціску былі рознымі, у сувязі з чым пілот выбраў небяспечную вышыню палёту. Тэхнічна перастаіць ціск датчыка мог або капітан паветранага судна, або штурман, аднак з якой мэтай гэта магло быць зроблена, невядома, адзначылі ў камітэце. У Польшчы з высновамі МАК схільныя не згаджацца — пасля апублікавання даклада сваё негатыўнае да яго стаўленне выказалі некаторыя сваякі загінулых і іх адвакаты.

У ЗША РЭЗКА ВЫРАС ПРОДАЖ ЗБРОІ

У шэрагу штатаў ЗША зафіксаваны рэзкі скачок продажу агнястрэльнай зброі. Пра гэта сведчаць звесткі ФБР.

Так, найбольшы рост продажу зброі зарэгістраваны ў штаце Агаё. Па падліках ФБР, там за 10 студзеня было прададзена на 65 % больш зброі, чым за той жа дзень у 2010 годзе. Павялічыўся продаж зброі і ў штатах Іліной (38 %), Нью-Ёрк (16 %) і Каліфорнія (16 %). У цэлым па краіне патрэба ў агнястрэльнай зброі ў панядзелак, 10 студзеня, выраслa на 5 %. У ліку рэкардсменаў па росце аб'ёмаў продажу апынуўся штат Арызона, дзе 8 студзеня быў здзейснены замах на кангрэсмена Габрыэль Гіфардс. Арызонскія зброевыя крамы ў панядзелак прадалі на 60 % больш зброі, чым за аналагічны перыяд летась. Пры гэтым асаблівай папулярнасцю ў жыхароў штата карысталіся паўаўтаматычныя пісталеты фірмы Glock *(на фота)*, менавіта з такога пісталета Джарэд Лі Лофнер параніў кангрэсмена і застрэліў шасцярых чалавек у арызонскім горадзе Тусоне. Як вынік, эксперты звязваюць узрослую папулярнасць зброі менавіта з нападам на Габрыэль Гіфардс.

У БАНДЭРЫ КАНЧАТКОВА АДАБРАЛІ ЗВАННЕ ГЕРОЯ УКРАІНЫ

Указ прэзідэнта Украіны ад 20 студзеня 2010 года «Аб прысваенні Сцяпану Бандэру звання Герой Украіны» рашэннем суда прызнаны несапраўдным, паведамляецца на сайце кіраўніка дзяржавы.

Які менавіта суд адмяніў прэзідэнцкі ўказ, у паведамленні не сказана, аднак вядома, што 12 студзеня адпаведную справу павінен быў разглядаць Вышэйшы адміністрацыйны суд Украіны, рашэнні якога канчатковыя і абскарджанню не падлягаюць. Раней указ пра ганаровае званне для Бандэры быў прызнаны незаконным у судах ніжэйшых інстанцый. Рашэнне пра прысваенне лідару Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў звання Героя Украіны было прынятае ранейшым прэзідэнтам краіны Віктарам Юшчанкам у канцы тэрміна яго паўнамоцтваў.

Не захацела спакойнай старасці

Жанчына працавала начальнікам адной столінскай установы і мела доступ да грошай, якія ёй не належалі.

Выкарыстаўшы службовыя паўнамоцтвы, начальніца ўкрала больш за 35 млн рублёў.

На маёмасць жанчыны, коштам 92 мільёны, накладзены арышт, а яе саму затрымалі.

Дарэчы, да пенсіі затрыманая недацягнула 1 год.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Значкі часу

Жыхарка горада Горкі Магілёўскай вобласці Вера Аленіна падаравала мясцоваму гісторыка-этнаграфічнаму музею калекцыю значкоў, якую збірала разам з мужам 50 гадоў.

У 14 гадоў першыя значкі Веры падараваў брат. З тых часоў яе апанавала хобі: з любых паездак Аленіна везла дадому ў якасці сувеніраў значкі. Увогуле ўдалося сабраць 3 тысячы значкоў, якія цяпер выстаўлены ў музеі.

Зразумела, у калекцыі шмат савецкіх значкоў. Асобнае месца прысвечана важным персонам — Леніну, Гагарыну, Чайкоўскаму.

У якасці падзякі за свой падарунак жанчына атрымала квіток, які дае ёй пажыццёвае права бясплатна наведваць усе выставы ў Горацкім музеі.

Ілона ІВАНОВА.

ЖОДЗІНСКІЯ ШЧОДРЫКІ

Напярэдадні Каляд у Жодзінскім парку адпачынку створана кампазіцыя з ледзяных фігур.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.01.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▼	1 долар ЗША	3 016,00	1 чэшская крона 160,95	USD	30,3988
▲	1 еўра	3 922,61	1 польскі злоты 1 025,45	10 UAH	38,0651
	1 латвійскі лат	5 611,16	▲ 1 расійскі рубель 99,21	1000 BYR	10,0725
	1 літоўскі літ	1 139,40	1 украінская грыўня 378,06	EUR	39,5154

Агенства ўладзімера гракова

Анатоль РУБІНАЎ:

«Акцэнт робіцца не на адміністрацыйна-каманднае, а на ініцыятыўнае кіраванне...»

На сённяшні дзень прыпадае 14-я гадавіна з дня пачатку работы першай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання. Напярэдадні падзеі старшыня Савета Рэспублікі Анатоль Рубінаў адказаў на пытанні журналістаў, у прыватнасці, падвёў вынікі работы за мінулы год і расказаў аб перспектывах развіцця краіны пасля такіх вызначальных падзей, як чацвёрты Усебеларускі народны сход, прэзідэнцкія выбары, завяршэнне чарговага пяцігадовага перыяду развіцця краіны, прыняцце Дырэктывы № 4.

Пра пяцігодку

— Беларусь канчаткова даказала сваю жыццяздольнасць, права на незалежную дзяржаву, якая можа развівацца пры ўсіх складанасцях і цісках з боку сусветнага грамадства. Мінулы год быў няпростым, нават пераломным, з пэўнымі хваляваннямі, але па выніках — паспяховым. Завяршылася чарговая пяцігодка жыцця краіны, і, нягледзячы на найцяжэйшыя ўмовы (дастаткова прыгадаць, што за гэты час на газ цана выросла ў 4, на нафту — у 2 разы), што ўзнікалі пэўныя складанасці ў гандлёвых адносінах з расійскім бокам, летась мы выйшлі з эканамічнага крызісу, і выйшлі з найменшымі стратамі. Краіна выканала практычна ўсе намечаныя планы. Гэта сведчыць пра наяўнасць пэўных рэзерваў у краіны, а таксама аб эфектыўнай сістэме кіравання.

Думаецца, мы прайшлі крызісную кропку ў адносінах з Расіяй. Паслядоўнасць палітыкі кіраўніка дзяржавы прывяла да таго, што расійскае кіраўніцтва ў поўнай меры ўсвядоміла: да беларускага народа трэба ставіцца з павагай. Пагадненне па адзінай эканамічнай прасторы радыкальна мяняе будучыню нашага развіцця. Цяпер ёсць механізм, у межах якога будуць развівацца стасункі паміж эканамічнымі суб'ектамі...

На чарговым Усебеларускім народным сходзе прадстаўнікі народа прапанавалі курс на наступныя пяць гадоў... Што да самай важнай падзеі — выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, то гэта быў выбар ужо выверанага напрамку, яснай перспектывы, заснаванай на рэальных магчымасцях нашай дзяржавы. Хоць трэба мець на ўвазе, што не галасавала 20 працэнтаў насельніцтва, і гэта не мала. Факт варта асэнсаваць. Аднадушнасці няма ў любым грамадстве, але пэўнае адзінства павінна быць, паколькі мы ўсе плывём у адным караблі. Напэўна, трэба больш уважліва ставіцца да той часткі насельніцтва, якая сёння мае крытычны светапогляд. Сёння справа ў тым, што ўмовы жыцця рэзка палепшыліся, і ў людзей узнікае большая патрэба ў самавыражэнні, у тым, каб іх чулі. Чуць усе слаі насельніцтва — важная задача...

Пра знешнюю палітыку

— Беларусь не атрымала сур'ёзных прэтэнзій у дачыненні да правядзення прэзідэнцкіх выбараў. Так, занадта шмат галасавала датэрмінова, але ў нас прадугледжана такое права. Насамрэч сутнасць у тым, што як толькі адносіны паміж Беларуссю і Расіяй паляпшаюцца, пачынаюцца нападкі з Захаду, аднак гэтыя нападкі скіраваныя па вялікім рахунку супраць Расіі. А як толькі ўзнікае канфліктная сітуацыя ў стасунках з суседняй краінай, Захад адразу гатовы да размовы... Расія — гэта не проста велізарны рынак, энергарэсурсы, але і зразумелая нам краіна па гістарычных і культурных умовах. Інтарэсы нашай краіны ў тым, каб нармальна, устойліва развівацца, што магчыма, калі ў нас будуць нармальныя адносіны з такой магутнай дзяржавай, як Расія. Хоць гэта не азначае, што мы выступаем за адносіны толькі з ёю, і супраць адносін з Захадам. Мы зацікаўленыя ў самых лепшых стасунках з усімі еўрапейскімі і іншымі краінамі свету. Я мяркую, адносіны з Расіяй у нас будуць паляпшацца. Важна разумець, што толькі магутныя аб'яднанні могуць выжываць у сучасным свеце...

Пра Дырэктыву № 4

— Дырэктыва № 4 сімвалізуе новы этап у нашым развіцці. У папярэднія пятнаццаць гадоў нам давялося асвоіць знешнія рынкі, адаптаваць эканоміку да міжнародных стандартаў, пачаць мадэрнізацыю прадпрыемстваў. Краіна стала на ногі, але для гэтага патрабавалася цэнтралізацыя ўлады, адміністрацыйна-камандны стыль кіравання. Сёння мы выйшлі ўжо на іншы этап — актывізацыі творчай актыўнасці людзей на кожным асобна ўзятым участку работы. Дырэктыва змяшчае акцэнт на ініцыятыву канкрэтных удзельнікаў эканамічнага працэсу. Цяпер можна і трэба пазбаўляцца тых бар'ераў, якія раней былі патрэбныя. Наогул дырэктывы прымаюцца па пытаннях доўгатэрміновага характару. Гэта кірунак на будучыню. Дырэктыва павінна ажывіць прадпрымальніцтва. Цяпер у сталіцы прыватны бізнэс фарміруе 25 працэнтаў ВУП. Гэта нямала, але можа быць і больш.

Пра справы ўнутраныя

— Упор робіцца на далейшую мадэрнізацыю нашай эканомікі, вырашэнне аднаго з галоўных эканамічных пытанняў энергазбярожэння, паколькі цана на энерганосьбіты пастаянна расце. Спатрэбіцца актыўнае выкарыстанне новых тэхналогій, бо ў наступную пяцігодку трэба наблізіцца па прадукцыйнасці працы да развітых краін. І для гэтага акцэнт робіцца ўжо не на адміністрацыйна-каманднае, а на ініцыятыўнае кіраванне... Мытны саюз і адзіная эканамічная прастора павінны паспрыяць павелічэнню інвестыцый, стварэнню сумесных вытворчасцяў... Напэўна, трэба падумаць і пра пытанні грамадзянскай супольнасці. У грамадстве заўсёды ёсць апазіцыйныя меркаванні. Але яны павінны выражацца не праз плошчу, а ў межах цывілізаванага ўзаемадзеяння.

Пра парламент

— У наступным годзе парламенцкай сістэме — 15 гадоў... Ніжняя палата, або Палата прадстаўнікоў, як вядома, працуе ў нас на прафесійнай аснове. Што да сенатараў, то яны працуюць у розных галінах, і таму на ўласным вопыце адчуваюць, як могуць паўплываць законы на жыццё грамадства. Роля сенатараў незаменная яшчэ і таму, што яны праводзяць прыёмы грамадзян, дзякуючы чаму на месцах вырашаецца шэраг праблем. Сутнасць тут не толькі ў заканадаўчай дзейнасці, але і ў тым, як гэтая дзейнасць уплывае на жыццё таго рэгіёна, дзе працуюць сенатары, як яны даводзяць да насельніцтва палітыку дзяржавы, сутнасць прынятых законаў.

У краінах, дзе парламент існуе дзясяткі гадоў, уся заканадаўчая база прынятая. І там можна разглядаць адну папраўку шэраг месяцаў, калі не гадоў. У нас жа — новая дзяржава, дзе заканадаўчую базу трэба было ствараць. Нам не да працяглых размоў, спрэчак і баталій. На самым раннім этапе, як толькі заканапраект паступае ў парламент, атрымлівае яго і Савет Рэспублікі, камісіі якога адразу ж уключаюцца ў работу. Калі ўзнікаюць нейкія пытанні, мы адразу іх выносім, каб не зацягваць працэс. Гэтая работа павінна быць аператыўнай, і яна такая ёсць, інакш не магчыма было б прыняць толькі летась 130 законаў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

«ДЫРЭКТЫВА АЗНАЧАЕ, ШТО ЎЛАДА І ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ РАЗАМ УСВЕДАМЛЯЮЦЬ НАЯЎНАСЦЬ ПРАБЛЕМ І ГАТОВЫЯ ІХ ВЫРАШАЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дадатковым крокам наперад з'яўляецца і яшчэ большае спрашчэнне ўваходжання ў бізнэс, напрыклад, увядзенне электроннай рэгістрацыі юрыдычных асоб і ІП, хаця ў нас у краіне і так умовы пачатку бізнэсу дастаткова ліберальныя.

Вельмі важны момант — гарантыі захавання права ўласнасці. На жаль, у нас у недалёкім мінулым вельмі шмат прыкладаў, калі адмяняліся вынікі прыватызацыі, калі адбывалася канфіскацыя ў добрасумленных пакупнікоў маёмасці і неапраўданая канфіскацыя ў выніку адміністрацыйных правапарушэнняў. Ад такой практыкі трэба адмаўляцца, і дырэктыва дае такі напрамак, які, спадзяёмся, будзе напоўнены канкрэтным зместам.

Важным напрамкам з'яўляецца і далейшае зніжэнне падатковага ціску, спрашчэнне падатковай сістэмы. Вельмі даўно бізнэс дабіваўся павелічэння межаў выручкі для прымянення спрошчанай сістэмы падаткаабкладання — у дырэктыве гэта ёсць, і гэта вельмі сур'ёзны крок.

Што тычыцца малога бізнэсу, то тут важны пункт у дырэктыве наконт адмены абавязковай здачы наяўнай выручкі ў банк, адмены ўзгаднення лімітаў астатку ў касе, а таксама адмены патрабавання мэтавага выкарыстання выручкі. Усё гэта дасць большую свабоду малому бізнэсу, бо сур'ёзна знізіць выдаткі на банкаўскае абслугоўванне.

У прапісаным у тэксце дырэктывы далейшым удасканальванні кантрольнай дзейнасці змяшчаецца вельмі важны момант наконт маніторынгу. Калі памятаеце, нядаўна быў прыняты Указ Прэзідэнта № 510 аб удасканальванні кантрольнай дзейнасці. Гэты дакумент вельмі прагрэсіўны, над ім працавалі прадстаўнікі дзелавой супольнасці, і ў тым ліку я сам. Аднак на практыцы прагрэсіўныя нормы 510-га ўказа пачалі абыходзіцца кантрольныя органамі праз розныя маніторынгі, якія былі прыдуманы замест праверак. Зараз жа ў дырэктыве дакладна напісана, што маніторынг не дае права выкарыстоўваць паўнамоцтвы, якія маюцца пры праверках. Такім чынам, толькі пры правядзенні праверак могуць прымяняцца санкцыі, а самі праверкі ў нас ужо добра прапісаны ва ўказе Прэзідэнта.

Добры і важны крок — лібералізацыя ў галіне адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці пры вядзенні прадпрымальніцкай дзейнасці. Бо ў нас сёння дастаткова жорстка-рэпрэсіўнае заканадаўства і шмат якія санкцыі не адэкватныя цяжару правапарушэнняў. Тут вельмі вялікі кавалак працы па ўдасканаленні цэлага шэрагу артыкулаў КаАП і Крымінальнага кодэкса, але сама пастаноўка пытання вельмі правільная — людзі не павінны баяцца займацца бізнэсам. Напрыклад, мы вельмі доўга дабіваліся адмены артыкула 23.17 КаАП, дзе санкцыі прапісаны ў працэнтах ад сумы гаспадарчай аперацыі за фармальныя парушэнні ў афармленні першасных уліковых дакументаў, і нарэшце дырэктывай дзеянне гэтага артыкула спынена да ўнясення папраўак у Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Не магу не адзначыць і лібералізацыю ўмоў найму працаўнікоў і аплаты працы, бо ў нас тут даўно існуе залішняе рэгуляванне. Дзяржава павінна толькі ўстанаўліваць мінімальную зарплату, а ўсё астатняе — па дамоўленасці суб'ектаў гаспадарання і наёмных працаўнікоў.

Ну і, нарэшце, трэба адзначыць важнасць даручэння дзяржорганам пры незразумеласці ці недакладнасці актаў заканадаўства ўсе рашэнні прымаць на карысць суб'ектаў гаспадарання, а таксама важнасць патрабавання афіцыйнага апублікавання праектаў заканадаўчых актаў, іх абмеркаванне з дзелавой супольнасцю. Гэта вельмі важныя пытанні, бо ў нас ужо былі выпадкі, калі нарматыўныя акты, прынятыя без абмеркавання, прыходзілася праз некалькі дзён адмяняць.

Усё гэтыя перадумовы, запісаныя ў Дырэктыве № 4, безумоўна, ствараюць умовы для фарміравання ў бліжэйшы час, магчыма, у бліжэйшы год, сапраўды безбар'ернага асяроддзя. Але тут вельмі важна напоўніць дырэктыву канкрэтнымі дзеяннямі — зараз у трохмесячны тэрмін павінен быць распрацаваны і зацверджаны план мерапрыемстваў па рэалізацыі палажэнняў дырэктывы, і дзелавая супольнасць павінна актыўна працаваць, каб гэты план быў напоўнены максімальна ліберальнымі нарматыўнымі актамі.

— Як лічыце, за 2011 год можа быць рэалізавана большасць палажэнняў дырэктывы?

— Большасць, безумоўна, павінна быць рэалізавана. Больш складанасцяў будзе з рэгуляванням кодэксаў, бо гэта больш працаёмістае, а астатнія рэчы могуць быць вырашаны на працягу месяца пастановамі Саўміна ці Нацбанка.

— А як думаеце, дырэктыва нейкім чынам уздымае статус прадпрымальніка ў вачах чыноўніка?

— Безумоўна! У дырэктыве ёсць асобны 8-ы пункт пра развіццё дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Дый і ў самым пачатку дырэктывы напісана, што «стварэнне спрыяльных умоў для прадпрымальніцкай дзейнасці з'яўляецца адным з асноўных стратэгічных фактараў устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця». Такім чынам дырэктыва безумоўна арыентуе на дапамогу прадпрымальнікам з боку дзяржчыноўніка, на максімальнае разняволенне дзелавой ініцыятывы грамадзян.

Георгій БАДЗЕЙ, старшыня праўлення Бізнэс-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя прафесара М.С. Куняўскага:

— У цэлым фактам прыняцця дырэктывы мы задаволены, тэкстам таксама — нейкіх вялікіх нараканняў у нас няма. Галоўнае, каб гэты дакумент працаваў...

— Гэта вы маеце на ўвазе сітуацыю з «Пінскдрэвам» (3 студзеня 2011 года быў падпісаны Указ Прэзідэнта № 2 «Аб некаторых пытаннях холдынгу «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў», згодна з якім канцэрн Беллеспапрам стаў кіруючай кампаніяй прыватнага холдынгу, і ўсе яго рашэнні абавязковыя для выканання «Пінскдрэвам» без права адхілення ці адмены. — Аўт.)?

— Абсалютна правільна!

— З гэтай нагоды ваш саюз звяртаўся ў дзяржаўныя органы?

— Так, мы звярнуліся ў Савет Міністраў да прэм'ер-міністра і ў Адміністрацыю Прэзідэнта, зараз чакаем адказаў.

— Давайце вернемся да дырэктывы — вашы прапановы ў тэксце дакумента ўлічаныя?

— Так, у цэлым усё ўлічана, хоць ёсць некаторыя ўпушчэнні.

— Як лічыце, наколькі хутка трэба ператвараць у жыццё палажэнні дырэктывы?

— Трэба рабіць і хутка, і разумна. Ніхто ж не кажа, што трэба рабіць па-дурному. А наконт таго, хутка ці павольна, то, вядома, трэба ўсё рабіць хутка. Бо мы ўжо даўно адсталі ад усяго свету — і Еўропы, і іншых краін.

Уладзімір КАРАГІН, старшыня ГА «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў»:

— Усё асноўнае яшчэ трэба будзе зрабіць — гэта значыць, пастанову ўрада. І мы над гэтым будзем шчыльна працаваць разам з урадам (на жаль, Уладзімір Мікалаевіч зараз знаходзіцца ў Польшчы з дзелавым візітам, таму камэнтар атрымаўся такі кароткі. — **Аўт.**).

Віктар МАРГЕЛАЎ, сустаршыня Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва:

— Прадпрымальнікі задаволеныя фактам прыняцця дырэктывы, тым, што яна пракладвае прававое поле для паляпшэння дзелавога асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь. Як вядома, у нас шмат якія рашэнні не знаходзяцца ў кампетэнцыі міністраў і нават віцэ-прэм'ераў, і менавіта на такія лёсавызначальныя пытанні дае адказы дырэктыва. Безумоўна, гэты дакумент пісаўся з удзелам прадпрымальнікаў, таму ў той ці іншай форме дырэктыва адзначае, што ўлада і прадпрымальнікі разам усведамляюць наяўнасць праблем і гатовыя іх вырашаць — і гэта з'яўляецца самым важным у дырэктыве. Акрамя таго, у дырэктыве прапануецца замацаваць узаемадзеянне бізнэсу і ўлады пры прыняцці нарматыўных дакументаў у галіне прадпрымальніцтва. Прапануецца стварыць экспертныя радзы, куды ўключаць не толькі прадстаўнікоў бізнэс-саюзаў, але і экспертаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, і такім чынам зрабіць вялікі крок у напрамку дэмакратызацыі прыняцця рашэнняў у нашай краіне.

Што тычыцца прапаноў, то яны ўсё добрыя і правільныя ў дырэктыве. Але найбольш важна сёння для бізнэсу — гэта ўсё-такі стварэнне канкурэнтнага дзелавога асяроддзя, дзе рэсурсы дзеляцца не па той прыкмеце, хто якому міністэрству падпарадкоўваецца і якую ўласнасць прадстаўляе, а па рыначных прынцыпах.

Другім важным напрамкам дырэктывы, на маю думку, з'яўляецца тое, што штрафы за парушэнні пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці будуць прыведзеныя ў адпаведнасць са ступенню небяспекі і са ступенню нанесенага ўрону дзяржаве. У выпадках, калі ўрону не будзе, то мяркуецца, што штрафы будуць заменены папярэджаннямі. У прынцыпе, гэта дзелавая супольнасць прапануе чацвёрты год, але два разы змены ў КаАП уносіліся толькі дробныя.

Ёсць у дырэктыве і іншыя важныя рэчы — напрыклад, права прадпрымальнікаў пасля 3 гадоў арэнды выкупіць арандаванае памяшканне. Але, высока ацэньваючы саму дырэктыву, самае сёння балючае пытанне — якім чынам прапановы, змешчаныя ў ёй, ператварыць у пакет нарматыўных прававых актаў, якія рэальна б вырашылі абазначаныя праблемы. Бо, як кажуць, д'ябал заўсёды хаваецца ў дробязях: паставіў не там коску — і слушную прапанову можна ператварыць у нішто. Наколькі мне вядома, будуць збірацца працоўныя групы і абмяркоўваць, якім чынам рэалізоўваць дырэктыву. Так што, самае складанае ў нас яшчэ наперадзе.

— Як лічыце, наколькі хутка трэба гэта ўсё рэалізоўваць?

— Трэба было рэалізоўваць яшчэ ўчора. Большасць пытанняў ужо пераспелая, іх трэба было вырашаць пяць гадоў таму — і мы б даўно ўжо жылі ў іншай краіне. Але калі зараз казаць пра рэальныя тэрміны, то я лічу, што даволі шмат пытанняў можна вырашыць на працягу пары месяцаў. Ёсць і цяжкія пытанні, напрыклад, наконт змянення кодэксаў — але, мяркую, паловы года тут дастаткова. Ну а людзі, якія з'яўляюцца рэалістамі, кажуць, што было б вельмі добра, калі б да канца года большасць прапаноў дырэктывы была рэалізавана.

— Віктар Ягоравіч, мы з вамі пару гадоў назад рабілі інтэрв'ю, дзе вы казалі пра неабходнасць своеасаблівага маніфеста, які б паказаў важнасць прадпрымальніцтва ў нашай дзяржаве. Як лічыце, можа, дырэктыва якраз і з'яўляецца такім маніфестам?

— У прынцыпе, можна сказаць і так. Прынамсі, мне расказалі такую гісторыю: аднаму прадпрымальніку не давалі квоты на сыравіну. Ён прыйшоў да чыноўнікаў, паказаў Дырэктыву № 4 і сказаў: «Разумееце, мы ўжо ў іншай краіне жывём — вось дырэктыва, і вы павінны вырашыць маё пытанне, я не магу застацца без сыравіны». І чыноўнікі падумалі-падумалі, і далі квоты на сыравіну. Так што бачыце, ужо сам факт наяўнасці дырэктывы дае пэўныя перавагі, якімі можна скарыстацца. Аднак усё ж варта адзначыць, што, нягледзячы на дырэктывы, прадпрымальнікі ацэньваюць стаўленне да сябе як негатыўнае, і ў першую чаргу з боку дробных чыноўнікаў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

«Прамая лінія»

ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ПАДАЕ ЗРОК?

Нагрузка на вочы ў наш час велізарная. Адсюль і парушэнне зроку. Якія хваробы пагражаюць вачам, як засцерагчыся ад іх і што рабіць, калі вы пачалі бачыць горш? На гэтыя і іншыя пытанні падчас нашай «прамой лініі» адкажа **кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры афтальмалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Галіна Раманаўна СЯМАК.**

«Прамая лінія» з яе ўдзелам адбудзецца **21 студзеня**, у пятніцу, з **12.00** да **13.30** па тэлефонах **8(017) 292 38 92** і **292 38 21**. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах **8(017) 287 18 29** і **287 18 36**.

ДОЛАРУ ПРАДКАЗВАЮЦЬ РАДАСНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Міхаіл Міхайлавіч, «стартаваў» долар сёлета паспяхова ў адрозненне ад еўрапейскай валюты, курс якой аслабеў. Шэраг экспертаў тлумачаць гэтую сітуацыю апасеннямі інвестараў адносна стабільнасці еўразоны.

— У Еўропе па-ранейшаму працягваюцца даўгавыя крызісы асобных краін, сярод якіх згадаем тыя ж Грэцыю, Іспанію, Партугалію, а дзесьці ў сярэдзіне гэтага года будуць вялікія даўгавыя праблемы ўжо ў вельмі вялікай дзяржавы — у Францыі. І кожная такая інфармацыя, зразумела, не спрыяе ўмацаванню еўра. Гэтым і тлумачыцца тое, што на дадзеным адрэзку часу долар умацоўваецца і, напэўна, першыя паўгода з тымі ці іншымі хістаннямі будзе ўмацоўвацца ў адносінах да еўра. Але ў чарговы раз падкрэслю, што даўгавыя праблемы Еўропы — гэта, у асноўным, узаемныя даўгі адно аднаму, знешняму свету Еўрасаюз вінаваты значна менш, чым ЗША. Акрамя таго, цяпер кітайскі цэнтрабанк актыўна ўключыўся ў падтрымку Еўрасаюза. Кітай купляў і працягвае купляць даўгавыя абавязацельствы і Грэцыі, і Іспаніі, і Партугаліі, і ўжо заведама купіць, калі справа дойдзе да гэтага, даўгавыя абавязацельствы Францыі. Таму не трэба чакаць вельмі моцнага ўмацавання долара. На мой погляд, умацаванне амерыканскай валюты будзе часовым, але на працягу, прынамсі, першай паловы 2011 года. З пункту гледжання далейшай стратэгіі, больш доўгачасовых прагнозаў, перавага ёсць у еўра. Што ж датычыцца нашага насельніцтва з яго сціплым дастаткам (па-ранейшаму на кожнага беларуса ў банках прыпадае ў сярэднім менш як 1,5 месячнай зарплаты ва ўкладах), то тут прасцей за ўсё зберагаць сродкі, разбіўшы іх на тры часткі — беларускія рублі, долары і еўра, — і захоўваць іх такім чынам.

— Летась, дарэчы, жыхары краіны ўкладвалі сродкі і ў золата: рэзка павялічыўся аб'ём куплі мерных залатых зліткаў. Відаць, людзей уразіў тэмп росту цэн на каштоўны метал.

— Так, захоўваць свае сродкі ў золаце стала папулярным. За мінулы год даходнасць па золаце і серабры была адна з самых высокіх. Але, калі палічыць на доўгім адрэзку часу (падзяліць на колькасць гадоў, палічыць па формуле складаных працэнтаў), то акажацца, што з 1947 года (тады ўнцыя золата каштавала 35 долараў) па цяперашні дзень (больш як 1400 долараў) даходнасць золата была менш за 8 працэнтаў.

Між іншым, у Беларусі, можна сказаць, наступіла гістарычная падзея, калі ўклады насельніцтва дасягнулі амаль 23 трыльёнаў рублёў у эквіваленце, але і крэдытаў насельніцтву выдадзена таксама практычна на 23 трыльёны. І гэта для эканомікі вельмі дрэнна. Чыстая норма зберажэнняў у беларусаў за мінулы год, як і ў крызісны 2008, стала адмоўнай. Мы па-ранейшаму не столькі назапашваем, адкладваем грошы, у прыватнасці, на навучанне дзяцей, на куплю кватэры, не столькі зберагаем, колькі пазычаем. І фактычна асноўную функцыю ператварэння зберажэнняў у інвестыцыі нашы банкі перасталі выконваць. Яны фактычна бяруць грошы ў адной часткі насельніцтва і аддаюць другой альбо на будаўніцтва кватэр, альбо на куплю імпартных тавараў. Дайшлі да парадоксу, што нават рабочы «Атланта» брэ ў банку крэдыт і ідзе купляць не айчынны халадзільнік, а імпартны. Я хацеў бы звярнуць увагу і насельніцтва, і асабліва нашага рэгулятара — Нацыянальнага банка — на тое, што склалася няпростая сітуацыя. Крэдытаванне насельніцтва павінна быць крыху прытарможана.

— Вы кажаце пра тое, што зберагаюць беларусы няшмат. Разам з тым, толькі ў снежні насельніцтва купіла ў банках на чыстай аснове сотні мільёнаў долараў у эквіваленце. І, мабыць, гэтыя сродкі таксама папоўнілі зберажэнні людзей, якія яны трымаюць на руках?

— На мой погляд, калі вы ўжо купілі валюту, то лепш яе захоўваць у банку. Тым больш, што ў Беларусі дзяржавай сапраўды дадзеныя ўнікальныя гарантыі па стапрацэнтным вяртанні ўкладаў. І ўся папярэдняя гісторыя сучаснай Беларусі кажа пра тое, што калі з некаторымі банкамі і былі праблемы, то рана ці позна насельніцтву вярнулі ўсё да капейкі. Я ўсё ж такі параіў бы тыя долары, якія людзі купілі, аднесці ў банкі. Палічыце самі: калі ў вас захоўваецца на ўкладзе ў банку 1000 долараў, то ў канцы года будзе ўжо каля 1100. Усё ж такі гэта нядрэнны даход. Акрамя таго, у нашай краіне такога роду даходы не абкладаюцца падаткам у адрозненне ад многіх іншых краін свету.

І напрыканцы яшчэ адна парада — не трэба залазіць у даўгі. Лепш накапіце грошай і потым купляйце. Лічыце больш уважліва працэнты. Толькі здаецца, што крэдыт можна ўзяць пад 14-15 працэнтаў. А калі вы палічыце ўсе камісійныя, усялякія платы за абслугоўванне, то ўбачыце, што вам амаль заўсёды трэба вяртаць банку ў 1,5, а бывае — і ў 2 разы больш грошай, чым вы ў яго ўзялі.

Абзац

◢ Сіноптыкі аб'явілі на сёння штармавое папярэджанне. Як папярэджваюць спецыялісты, паніжэнне тэмпературы паветра пасля дажджу і мокрага снегу па ўсёй тэрыторыі краіны можа прывесці да галалёдзіцы.

◢ **Гарналыжны цэнтр плануецца пабудаваць у Браслаўскім раёне. Зараз рыхтуецца праграма развіцця Браслаўшчыны.**

◢ Двое дзяцей загінула ўчора ў ДТЗ ў вёсцы Перкі Кобрынскага раёна. 35-гадовы кіроўца аўтобуса «Сканія» наехаў на хлопчыкаў 9 і 14 гадоў, якія пераходзілі дарогу па пешаходным пераходзе. Дзеці загінулі на месцы. Святлафор знаходзіўся ў рэжыме жоўтага міргання.

◢ **У Мядзельскім раёне на паляванні падстрэлены грамадзянін Расіі. Куля трапіла паляўнічаму ў твар. Грамадзяне Расіі палявалі ў Нарачанскім нацыянальным парку па пуцёўцы. Пацярпелага адвезлі на аперацыю ў бальніцу. Магчыма, куля зрыкашэціла ад якога-небудзь прадмета. Самі ж паляўнічыя сцвярджаюць: здарыўся самастрэл. Вядзецца праверка.**

◢ Першая лінія метро ў Мінску ўчора не працавала 20 хвілін. На тлумачэнні спецыялістаў, ніякіх сур'ёзных інцыдэнтаў не было. Рух спыняўся з-за тэхнічнай няспраўнасці на перагоне паміж станцыямі «Акадэмія навук» і «Парк Чалюскінцаў».

◢ **Зімнія гонкі на сабачых запрэжках упершыню наладзяць у Беларусі 29 студзеня. Спаборніцтвы па ездавым спорце «Завіруха-2011» пройдуць у Валожынскім раёне. Чакаецца, што ўдзел у спаборніцтвах прымуць больш за 50 удзельнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы і Латвіі.**

Поўны абзац

◢ Кантрабандысты спрабавалі пераправіць цыгарэты ў Літву на крызе. Смаргонскія памежнікі заўважылі на крызе на рацэ Вілія каробкі. Як выявілася, кантрабандысты запакавалі ў вялікі поліэтыленавы пакет 30 каробак з цыгарэтамі беларускай вытворчасці. А для таго, каб не згубіць тавар і адсочваць яго рух, схавалі ў ім навігатар. Кошт цыгарэт склаў больш за 18 млн рублёў. Вядзецца праверка.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

У АЎТААВАРЫІ ЗАГІНУЛА ТРОЕ

На магістралі Брэст—Мінск, каля в. Зорная (пад Баранавічамі) кіроўца аўтамабіля «Фальксваген-Пасат» выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з «Таётай-Камры», якой кіраваў жыхар Масквы.

У гэтай аварыі загінулі трое — усе пасажыры «Фальксфагена». Жанчына і мужчына, жыхары Бярозы, памерлі на месцы, а пенсіянерка — пазней у бальніцы. Кіроўцы абодвух аўтамабіляў атрымалі траўмы. На кіроўцу «Фальксвагена» завялі крымінальную справу.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

25 января 2011 года в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. Об изменении размера уставного фонда и номинальной стоимости акций ОАО «Полесьежилстрой».
2. О внесении и утверждении изменений и дополнений в Устав Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Базановой, 19. Начало регистрации участников собрания: 10.30.

УНП 200050191

Утерянную печать кооператива **«Сантехмонтаж»** считать недействительной.

Як нас дураць!

«ПЕРАГОНШЧЫК» ВЫМАНТАЧЫЎ У СТУДЭНТАЎ $ 17 000

Махляр заключаў са сваімі ахвярамі дагаворы, дзе фігуравала фірма-«невідзімка»

Між іншым, даверлівыя маладыя людзі трапілі на вуду да вопытнага прайдзісвета: паводле звестак прэс-афіцэра Маскоўскага РУУС Таццяны Грыб, падазроны раней быў чатыры разы судзімы за махлярства і разбой. На гэты раз 26-гадовы мінчанін вырашыў «зарабіць» на аўтабуме.

Першай ахвярай махляра стаў студэнт сталічнага ВНУ, які, на сваю бяду, запісаў у сябры хітруна. Апошні і прапанаваў юнаку дапамогу ў набыцці аўто: маўляў, ёсць магчымасць даставіць добрага «жалезнага каня» з-за мяжы. Бакі дамовіліся, і студэнт перадаў «дабрадзею» 9 400 долараў ЗША. Адметна, што ў гэтым выпадку быў нават заключаны дагавор, каб гарантаваць выкананне абавязацельстваў. Толькі, як высветлілася пасля, дакумент аказаўся сапраўднай «ліпай». Насамрэч, у ім фігураваў дырэктар фірмы, якая не існуе, — яна раней займалася будаўнічымі работамі, але з 2003 года знаходзіцца ў стадыі ліквідацыі. Пячатка на дагаворы таксама належала арганізацыі-«невідзімцы».

Лёгкасць, з якой прайдзісвету дасталіся вялікія грошы, натхніла таго на чарговую хітрасць па аналагічнай схеме. На гэты раз прасцяк выклаў «перагоншчыку» 7 400 долараў. Спынілі «прыгоды» махляра аператыўнікі Маскоўскага РУУС сталіцы, якія затрымалі зламысніка. У адносінах да затрыманага заведзена крымінальная справа за махлярства — яму пагражае да 7 гадоў пазбаўлення волі. Між іншым, праваахоўнікі не выключаюць, што гэта прадпрымальная асоба мае дачыненне да іншых падобных махлярстваў.

Ігар ГРЫШЫН.

ПАСАДЗІЛІ ЗА ДЗІЦЯ

Ну і ну!

У Полацку асудзілі маладую жанчыну, якая падчас сваркі з суперніцай, з-за рэўнасці да мужчыны, нанесла пашкоджанне двухмесячнай дзяўчынцы — дачцэ суперніцы.

Як паведаміла «Звяздзе» **Наталля Яроменка — пракурор аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў і аналізе судовай практыкі пракуратуры Віцебскай вобласці**, трохвугольнік кахання першапачаткова быў вельмі заблытаным.

Маладая асуджаная жыла з мужчынам, які завёў сабе палюбоўніцу. І гэта нягледзячы на тое, што з цяпер ужо асуджанай у іх было агульнае дзіця. У сваёй кватэры спачатку мужчына жыў са «старэйшай» жонкай, а потым з «малодшай». Калі апошняя паведаміла яму, што цяжарная, вярнуўся да «старэйшай». Калі «малодшая» нарадзіла, зноў запрасіў яе жыць разам... Аднойчы «старэйшая», быццам каб забраць свае рэчы з кватэры, дзе жыла з каханым, прыйшла і пачала «дзяліць мужчыну». Цягалі адна другую за валасы, біліся...

У гэты час маленькае дзіця знаходзілася на канапе. З помсты да суперніцы рапцам госця за ножкі сцягнула немаўля. Тое выцялася галавой аб падлогу і атрымала траўмы...

Прыгаворам суда Полацкага раёна і горада Полацка вінавацтую ў прычыненні цяжкага цялеснага пашкоджання дзіцяці, якое, зразумела, знаходзілася ў бездапаможным стане, асудзілі на пяць гадоў і шэсць месяцаў пазбаўлення волі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РЫХТУЙ САНІ ЛЕТАМ, А АДПАЧНІ ЗІМОЙ

Ва ўсім свеце аб'ём турыстычных паслуг і колькасць падарожжаў прыпадае пераважна на лета. Гэта больш за 60%. Зімой жа спецыялістам, якія працуюць у турыстычнай сферы, трэба сур'ёзна падумаць над тым, як зрабіць адпачынак для людзей цікавым і карысным.

— Зімовы турызм мы разглядаем як стратэгічны напрамак, — адзначыў дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Вадзім Кармазін. — Менавіта добрая арганізацыя адпачынку ў зімовы час дае магчымасць змагацца з сезоннасцю турызму.

Вялікай папулярнасцю ў адпачывальнікаў карыстаюцца гарналыжныя комплексы «Сілічы», «Лагойск», «Сонечная даліна», Мазырскі гарналыжны цэнтр. Вядома, яны не такія маштабныя, як на буйных сусветных курортах, але разам з тым гэтыя аб'екты даказалі сваю запатрабаванасць. Ужо каля 350 тысяч чалавек скарысталіся паслугамі нашых гарналыжных комплексаў.

На момант Новага года было заліта 1200 каткоў. Дзейнічае 420 пунктаў пракату спартыўнага інвентару. Створана 12 канькабежных трас, 812 лыжных трас, абсталяваны 402 хакейныя каробкі.

Цікавыя мерапрыемствы былі арганізаваны на аграсядзібах: у Валожынскім раёне — «Калядныя вечары», у Кобрынскім — «Палескія традыцыі», у Мінскім раёне — «Жані

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

13 студзеня 2011 г. № 1 (239)

Ад перайменавання да аб'яднання

Старажытны Полацк і Наваполацк могуць стаць адным горадам?

У Віцебскім аблвыканкаме ўзнікла ідэя перайменаваць адзін з раёнаў Прыдзвінскага краю.

Кіраўніцтва Віцебскай вобласці прапанавала абмеркаваць магчымасць перайменавання Чашніцкага раёна ў Новалукомльскі. Прычым з цэнтрам менавіта ў Новалукомлі. Акрамя гэтага, агучана ідэя аб'яднання старажытнага Полацка і Наваполацка.

Губернатар Аляксандр Косінец канстатаваў, што Новалукомль добра вядомы далёка за межамі краіны як флагман беларускай энергетыкі. Ёсць і іншыя аргументы на карысць перайменавання раёна. Менавіта ў Новалукомлі знаходзіцца цэнтральная раённая бальніца, хлебазавод, заводы керамзітавага гравію, электрарухавікоў і іншыя вядомыя прадпрыемствы. У Новалукомлі пражывае каля 14,5 тысячы чалавек, а ў Чашніках менш за 9,5 тысячы.

Чашнікі ўпершыню ўзгадваюцца ў летапісе ў 1504 годзе. Чашніцкі раён створаны ў 1924-м. Затое Новалукомль, узведзены ў 1960-х, больш актыўна развіваецца. Тут плануецца пабудаваць лядовы палац, значна палепшыць турыстычны сэрвіс.

Безумоўна, без падтрымкі пераважнай большасці тутэйшых жыхароў ідэя наўрад ці будзе рэалізаваная.

Што датычыцца перспектыў «улівання» Наваполацка ў Полацк, пра што пагаварылі раней, дык гарады ўжо фактычна зблізіліся дзякуючы новабудоўлям. Іх аб'яднанне дазволіць эканоміць нямала фінансавых сродкаў, якія ідуць на ўтрыманне ўпраўленчых структур, і больш эфектыўна вырашаць эканамічныя, сацыяльныя і іншыя пытанні.

У любым выпадку, ідэі маюць нямала падстаў на карысць рэалізацыі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Чашніцкі раён.

ЗНАЙСЦІ СВАЮ «ФІШКУ» І ВЫГАДНА ПРАДАЦЬ

Пра ролю органаў мясцовага самакіравання ва ўстойлівым і комплексным развіцці тэрыторый ішла размова падчас выязнога семінара, арганізаванага для старшынь гарадскіх (гарадоў раённага падпарадкавання) Саветаў дэпутатаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

МЕСЦА для правядзення своеасаблівай вучобы-практыкума — г. Заслаўе Мінскага раёна — выбралі невыпадкова. За апошнія тры гады тут было створана 135 прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнэсу, зарэгістравана 236 індывідуальных прадпрымальнікаў. Да таго ж, так званы вытворчы бізнэс дае фору бізнэсу гандлёваму. А ўвогуле, на прадпрыемствах недзяржаўнай формы ўласнасці Заслаўя за некалькі апошніх гадоў з'явілася больш за тысячу новых працоўных месцаў — гэта вельмі і вельмі нядрэнная лічба. Асабліва калі ўлічыць, што горад знаходзіцца практычна пад бокам у сталіцы, якая імкліва «паглынае» працоўныя кадры ўсіх вялікіх і малых населеных пунктаў, размешчаных паблізу. Пытанне ў тым і заключаецца, каб не даць сваім, мясцовым, кадрам назаўсёды знікнуць у сталічных нетрах. А для гэтага трэба стварыць такія ўмовы жыцця і працы, каб людзям і самім не хацелася адрывацца ад родных «пенатаў».

Чаго хочуць людзі

Фігуральна выказваючыся, мясцовым уладам, кіраўнікам арганізацый і прадпрыемстваў неабходна і далей паварочвацца тварам да людзей. Думаць не толькі пра павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці, а і пра напаўненне сацыяльнага «пакета», экалагічную бяспеку, інфраструктуру, прывабнае асяроддзе і г.д. А галоўнае, умець не толькі слухаць, але і чуць. Словам, для дэпутатаў тут па-ранейшаму неабсяжнае поле для дзейнасці.

— Для таго, каб адкрыць прадпрыемства, мала знайсці інвестара. Неабходна яшчэ і папрацаваць з людзьмі, мясцовымі жыхарамі, пераканаць іх у тым, што менавіта гэтая вытворчасць патрэбна гораду, што яна дасць новыя магчымасці, новыя працоўныя месцы, — лічыць **старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Святлана ГЕРАСІМОВІЧ**. — Часам пэўная частка насельніцтва ўспрымае з'яўленне новага ледзь ці не ў штыкі, як замах на ўласную бяспеку. І тут ужо непасрэдная задача дэпутатаў — праводзіць растлумачальную працу. Увогуле, для таго, каб развіваць рэгіёны ў правільным рэчышчы, трэба ведаць, чаго хочуць людзі. Улічваць меркаванні народа і своечасова інфармаваць насельніцтва пра тыя ці іншыя накірункі дзейнасці мясцовай улады. Тады і скаргаў будзе менш.

Каб такая інфармацыя стала больш даступнай, а яшчэ лепш, наглядней, каб насельніцтва дакладна ведала, што і калі зробяць, пабудуюць, адрамантуюць у іх населеным пункце, у адміністрацыйных будынках сельскіх і пасялковых Саветаў, а таксама райвыканкаме Мінскай вобласці будуць усталяваны спецыяльныя стэнды. Сёння адпаведная інфармацыя ўдакладняецца, звяраецца з планамі мясцовай улады, каб у самым хуткім часе стаць набыткам грамадскасці.

— Ад Саветаў дэпутатаў залежыць і ўдасканальванне прававой базы ў сферы прадпрымальніцтва, а таксама спрашчэнне падатковай сістэмы. Умовы для развіцця дзелавой ініцыятывы, малога і сярэдняга бізнэсу павінны быць створаны самыя прывабныя і камфортныя. Такія задачы ставіць перад «вертыкаллю» і губернатар вобласці, — сказала Святлана Герасімовіч. — Аднак што мы часам назіраем на практыцы? Літаральна днямі ў мяне на прыёме быў прадпрымальнік з Барысаўскага раёна. У свой час ён узяў у арэнду стары будынак школы. А калі адрамантаваў яго і абсталяваў пад свае патрэбы, будынак адразу камусьці спатрэбіўся... Так быць не павінна. Развіццё тэрыторый у вялікай ступені залежыць ад мясцовай «палітыкі», ад таго, як мы падтрымліваем чалавека, яго ініцыятыву. Тут ёсць над чым працаваць. А дэпутацкі корпус на ўсіх узроўнях можа рэальна ўплываць на вырашэнне праблем малога і сярэдняга бізнэсу.

Асабістая адказнасць

Даўно ўжо мінуў час, калі старшыня таго ж раённага Савета дэпутатаў з'яўляўся «прадстаўнічым» дадаткам да старшыні райвыканкама. Сёння і першы, і другі разам вырашаюць канкрэтныя задачы, вызначаныя праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця. Напрыклад, **старшыня Мінскага раённага Савета дэпутатаў Канстанцін ЛІХАЧ** асабіста адказвае за ўвод і будаўніцтва індывідуальнага жылля ў раёне, за падтрымку і развіццё ўласных падсобных гаспадарак, а таксама за добраўпарадкаванне населеных пунктаў. Безумоўна, раённы Савет дэпутатаў не стаіць у баку і ад вырашэння пытанняў інвестыцыйнай дзейнасці, падтрымкі прадпрымальніцтва. Гэта і зразумела: 70 працэнтаў паступленняў у раённы бюджэт складаюць падаткі ад прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасці.

— Раней нас туды не пускалі нават за грошы, не тое што бясплатна. Цяпер пытанне вырашана станоўча і, спадзяюся, Мінскі раён у хуткім часе стане больш чыстым, — сказаў Канстанцін Ліхач.

Гісторыя і сучаснасць

Калі ў доме цёпла, калі з крана і зімой, і летам цячэ гарачая вада, калі аўтобусы ходзяць у адпаведнасці з раскладам, калі школа не перагружана вучнямі, а ў дзіцячым садку хапае месцаў — гэта і ёсць вырашэнне асноўных пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва. Таму практычна ўсе грошы, зароблены Заслаўскім гарсаветам за апошнія гады дзякуючы правядзенню аўкцыёнаў па продажы зямельных участкаў, накіроўваліся менавіта на добраўпарадкаванне горада: закупку сучасных дзіцячых гульнявых пляцовак, замену агароджы, мадэрнізацыю кацельнай, падрыхтоўку праектна-каштарыснай дакументацыі па водазабеспячэнні адной з вуліц, усталяванне пандусаў...

— На жаль, сёлета, з улікам змяненняў кадастравага кошту зямлі, нам удалося прадаць толькі тры ўчасткі, — кажа **старшыня Заслаўскага гарадскога Савета дэпутатаў Ніна БУХАВЕЦ**. — Наш бюджэт не датацыйны. Якім чынам будзем зарабляць сёлета грошы — а нам неабходна прыкладна 300 млн рублёў — пакуль не ведаю. Сёння распрацаваны генеральны план развіцця Заслаўя. Калі яго зацвердзяць, горад зможа атрымаць дадатковыя зямельныя масівы. Шчыра кажучы, мы на гэта вельмі спадзяёмся, таму што ранейшыя зямельныя рэсурсы ўжо вычарпаны.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ВАРШАЎКА — ТАКСАМА СТАЛІЦА

З папулярным некалі назіраннем, што «Польшча — не замежжа», усё ж можна паспрачацца: каб патрапіць за Буг, трэба мець час, грошы і візу. Аднак безвыходных сітуацый амаль не існуе. Пры жаданні можна наведаць калі не Варшаву, дык... Варшаўку. Прычым ёсць шанцы зрабіць гэта хутка і з мінімальнымі выдаткамі.

ВЯСКОЎЦЫ З «ГАРАДСКІМ» ЗАНЯТКАМ

Каб патрапіць у беларускую Варшаўку, нават не абавязкова мець уласны аўтатранспарт. Па-сапраўднаму просты варыянт: дабрацца «пухавіцкай» электрычкай да Рудзенска, а адтуль — пешшу ў напрамку Праўдзінскага. Нават узімку шлях ад рудзенскага вакзала да «патрэбнай» вёскі зойме недзе 15-20 хвілін.

Варта адразу заўважыць, што палякаў у беларускай Варшаўцы сёння няма. Як, дарэчы, няма тут і жыхароў каталіцкага веравызнання. Што ж датычыцца даволі незвычайнай назвы, то мясцовыя краязнаўцы тлумачаць яе так: некалі гэтая зямля належала пану па прозвішчы Маліноўскі. А сам пан, у сваю чаргу, «прыехаў з Варшавы».

Аднак казаць, што заснавальнікам вёскі стаў менавіта пан Маліноўскі, будзе не зусім дакладна. У тыя часы гэта быў звычайны невялікі фальварак. Вёска з'явілася пазней — калі ў пачатку 1920-х гадоў былыя панскія землі сталі раздаваць сялянам з навакольля, якія пачалі тут будавацца.

— Варшаўка ніколі не была вялікай. Пэўна, цяпер дамоў больш, чым у пасляваенны час, — заўважае **былы хірург Рудзенскай бальніцы, жыхар вёскі Іван Ігнацьевіч ЛЯПЁШКА**. — Пасля вайны я прыехаў сюды яшчэ хлопчыкам і магу дакладна сказаць: тут ніколі не было ні царквы, ні касцёла, ні школы, ні дзіцячага садка, ні нават крамы — усё знаходзілася ў Рудзенску. А мясцовай «адметнасцю» лічыліся хіба тое хмызняк і балота. Але іх ужо даўно няма: тое ж балота асушылі недзе напрыканцы 1950-х.

У адрозненне ад польскай сталіцы Варшаўка не мае ўласнай рэчкі. Нібыта недалёка цячэ Пціч, але да яе — пад тры кіламетры. Некалі тут была някепская рыбалка, трапляліся шчупакі, акуні, плоткі, краснапёркі. Цяпер, кажа Іван Ляпёшка, «ужо не тое». Рэчка пакрысе абмялела, і параўноўваць яе з Віслай — справа недарэчная ўдвая.

І ўсё ж пэўныя паралелі з Варшавай правесці тут можна. Сапраўды, перш-наперш беларуская вёска «жыла з зямлі»: мясцовыя людзі трымалі гаспадарку, працавалі ў калгасе. Аднак гэта датычыцца не ўсіх. Многія з нашых варшаўцаў мелі і маюць тыпова «гарадскія» заняткі. Практыка ўладкавання на прадпрыемствах Рудзенска і Мінска тут даволі папулярная, і так павялося яшчэ з «савецкіх» часоў.

ЗА ПАЎКРОКУ АД ЗНІКНЕННЯ

Меркаваць, што ў беларускай вёсцы ўдасца адшукаць велічныя палацы ці касцёлы, вядома ж, наіўна. Адзіны помнік у Варшаўцы пастаўлены ў гонар памяці ахвяр Вялікай Айчыннай: каля вёскі расстралялі каля 300 ваеннапалонных і мірных грамадзян з навакольных населеных пунктаў. Што праўда, сама Варшаўка амаль не пацярпела. У вайну тут спалілі некалькі «партызанскіх» хат, але, дзякуючы богу, на той час іх гаспадары ўжо знаходзіліся ў лесе.

— Майго бацьку забілі, маці працавала ў калгасе. У калгас хадзілі і мы — каб купіць той жа абутак да школы, — узгадвае **жыхарка Варшаўкі, пенсіянерка Людміла Міхайлаўна САПУН**. — Тады было цяжка, гэта не тое, што цяпер. Сёння жыць можна, пенсіі хапае, толькі ўсё больш «нагадвае» аб сабе ўзрост і праблемы са здароўем. Але добра, што з Мінска рэгулярна прыязджаюць унук і пляменнік, ды і сацыяльны работнік заходзіць — словам, дапамагаюць усе.

Пасля вайны Варшаўка аднавілася хутка. У той час, як на адбудову амаль ушчэнт разбуранай Варшавы спатрэбіліся дзесяцігоддзі. Гісторыкі сцвярджаюць, што падчас Другой сусветнай польская сталіца магла ўвогуле знікнуць. Менш вядома пра іншае: «шанцы» поўнага знікнення былі і ў беларускай вёскі. Недзе ў сярэдзіне 1960-х з'явілася задума забяспечыць «кампактнае пражыванне» — Варшаўку планавалі знесці, а людзей з яе перасяліць у Рудзенск. Добра, што да рэалізацыі гэтага плана справа не дайшла.

— Мы і дагэтуль шкадуем аб адным — знікненні самастойнага Рудзенскага раёна ў пачатку 1960-х, — кажа Людміла Сапун. — Тады многія страцілі добрую працу, ды і з інфраструктурай стала горш. Мы адчуваем гэта і дагэтуль: каб зрабіць звычайную флюараграфію, трэба праехаць больш за дзесяць кіламетраў у пасёлак Дружны.

МАЛЕНЬКАЯ? ЗАТОЕ ПЕРСПЕКТЫЎНАЯ

Статыстыка сведчыць, што цяпер у вёсцы налічваецца ўсяго два дзясяткі жылых дамоў і крыху больш за паўсотні жыхароў. Але такія не самыя прыемныя лічбы не павінны ўводзіць у зман. Варшаўка лічыцца перспектыўнай. Адлегласць за 40 кіламетраў да Мінска плюс зноў жа электрычка робяць гэта месца па-сапраўднаму прывабным, сярэдні рыначны кошт дома тут складае каля 20 тысяч умоўных адзінак. Пакрысе змяняецца і сама вёска. Старыя драўляныя хаткі побач з цаглянымі катэджамі — так выглядае яна сёння. Акрамя таго, ужо прынята рашэнне выдзеліць у Варшаўцы дваццаць участкаў зямлі пад індывідуальнае будаўніцтва для «чаргавікоў» з Рудзенска. Збольшага будаўніцтва распачнуць маладыя сем'і. І гэта — яшчэ толькі пачатак.

— Вызначана, што ў будучым сталіца атрымае дзевяць гарадоў-«спадарожнікаў», і ў гэты пералік патрапіў наш гарпасёлак, — распавядае **старшыня Рудзенскага пассавета Вольга РАГАТКА**. — А гэта значыць, што спатрэбяцца новыя плошчы пад забудову, і адной з такіх пляцовак павінна быць менавіта Варшаўка. Па-сутнасці, яна таксама стане часткай Мінска.

Апроч новых прыватных дамоў, тут павінны з'явіцца шматпавярхоўкі. А ў дадатак да іх — крамы і нават уласная школа. Чакаецца, што рэалізацыя гэтага праекта распачнецца ў 2015 годзе.

— Праблем шмат, трэба паляпшаць дарогі, вырашаць пытанні з водаправодам, — адзначае Вольга Рагатка. — І тым не менш мы спадзяёмся, што з цягам часу паступова падобныя пытанні знікнуць. Так, амаль закончана распрацоўка праекта падвядзення да Варшаўкі газу. Хутчэй за ўсё, магчымасць карыстацца ім у жыхароў вёскі з'явіцца ўжо сёлета.

А ў дадатак ёсць намер здзейсніць не менш адметны праект. Каталікі на тэрыторыі пассавета ўсё ж ёсць, яны маюць сваю афіцыйна зарэгістраваную абшчыну і ўжо звярнуліся з просьбай дазволіць будаўніцтва невялікага храма. Цяпер пад яго падбіраюць участак у Рудзенску. І няхай сабе гэта будзе не касцёл, а толькі невялікая каплічка. Затое, як кажуць, свая.

Сяргей ГРЫБ.
Пухавіцкі раён.

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

«Як жывеш, Бобр?»

У рэдакцыю звярнулася былая жыхарка пасёлка Бобр Бобрскага сельсавета Крупскага раёна, якая папрасіла не называюць яе прозвішча ў газеце. Жанчына доўгі час не была на сваёй малой радзіме, і вярнуцца ёй давялося па сумнай прычыне: памерла сваячка. Скаржніцу непрыемна ўразіў заняпад роднага пасёлка: мясцовы Дом культуры не працуе, бо знаходзіцца ў аварыйным стане («моладзі няма куды падзецца»), будынак філіяла завода музычных інструментаў колькі год стаіць пусты («людзям няма дзе працаваць»). Акрамя таго, па ўсім сельсавеце не чысцяцца грамадскія калодзежы, дарогі — у нездавальняючым стане. А самае галоўнае: жанчына не змагла знайсці ў сваім пасёлку адзення і абутку для нябожчыцы («у магазіне з абутку толькі тапкі 33-а памеру; кіраўнік дзяржавы б'ецца над тым, каб разгрузіць склады айчынных вытворцаў, а ў нас у продажы нічога няма»)... «Раней у Бобры было жыць лепш, а цяпер узровень жыцця тут не ўнушае даверу», — падсумавала скаржніца.

Журналіст «Звязды» накіраваўся ў Крупскі раён, каб на свае вочы пабачыць пасёлак Бобр і параўнаць ўбачанае з расказам нашай госці.

Усё ўпіраецца ў грошы

Першым адкрыццём стаў той факт, што Баброў у Бобрскім сельсавеце тры: пасёлак Бобр (431 чалавек), гарадскі пасёлак Бобр (1125 жыхароў) і вёска Стары Бобр (35 чалавек). Дзякуючы дэдуктыўнаму метаду і тлумачэнню **старшыні Бобрскага сельскага Савета Казіміра БУЧЫЛКІ** стала зразумела, што непакоілася скаржніца менавіта за гарадскі пасёлак Бобр, дзе і знаходзіцца аварыйны Дом культуры.

Як патлумачыла **дырэктар Дома культуры Ірына ЯЛЫНКА**, ДК быў узведзены ў 1988-м годзе, будынак даўно патрабуе рамонту. Па прычыне парыву тут часова не працуе сістэма ацяплення. У ДК холадна, як у склепе. А водаправода ўвогуле ніколі не было. Дах падцякае. Нават неспецыялісту зразумела, што для аднаўлення такога аб'екта, як Бобрскі ДК, патрэбны значныя капіталаўкладанні.

— У нас пабывала і мясцовае, і раённае кіраўніцтва, — адзначыла Ірына Іванаўна. — Былі нават прадстаўнікі абласнога ўпраўлення культуры. Аб нашай сітуацыі ведаюць усе. Засталося знайсці сродкі на рамонт. Як заўсёды, усё ўпіраецца ў грошы.

Сёння на тэрыторыі сельсавета толькі адзін Дом культуры ў працоўным стане — у аграгарадку Замкі (аднак гарадскі пасёлак Бобр месціцца менш чым за 3 км ад Замкоў, куды пасялковая моладзь рэгулярна ездзіць на дыскатэкі). У самім г.п. Бобр усе святочныя масавыя мерапрыемствы праводзяцца ў будынку школы, у актавай зале.

Аграгарадок Замкі — пакуль што адзіны на тэрыторыі сельсавета — быў здадзены ў 2005-м годзе. Тут, акрамя ДК, ёсць гасцініца, рэстаран (вельмі папулярнае месца), фізкультурна-аздараўленчы комплекс з двума басейнамі (для дарослых і для дзяцей), са спартыўнай і трэнажорнай залямі — сюды могуць наведвацца і жыхары гарадскога пасёлка. Транспартнае забеспячэнне тут добрае (ходзяць як рэйсавыя аўтобусы, так і аўтобусы мясцовай гаспадаркі ААТ «Кляновічы», якія збіраюць па населеных пунктах усяго раёна сваіх работнікаў).

— Спачатку ўсе сілы былі кінуты менавіта на Замкі, — патлумачыў старшыня сельскага Савета Казімір Бучылка, — цяпер ушчыльную зоймемся гарадскім пасёлкам Бобр.

Сёння там ёсць школа-сад, амбулаторыя, дзіцячая і дарослая бібліятэкі, ашчадная каса, 4 стацыянарныя магазіны, комплексны прыёмны пункт. Казімір Віктаравіч пагадзіўся, што сацыяльная сфера ў гарадскім пасёлку яшчэ развіта недастаткова, але гэта пытанне часу. Існуе распрацаваная і ўжо зацверджаная праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця гарадскога пасёлка Бобр, разлічаная на перыяд з 2010 па 2020 гады, якая прадугледжвае развіццё ўсёй належнай інфраструктуры, у тым ліку і аднаўленне ДК, рамонт якога запланаваны на 2011 год.

Ёсць гаспадарка — будзе і жыццё

Будынак філіяла Барысаўскага завода музычных інструментаў, згаданы скаржніцай, знаходзіцца ў прыватнай уласнасці. Яго выкупляе то адзін прадпрымальнік, то другі. Пакуль што там нічога не зроблена, але ў перспектыве магчыма адкрыццё прыватнага прадпрыемства. Нягледзячы на гэта, у жыхароў пасёлка ды і ўсяго сельсавета ёсць працоўныя месцы, у асноўным дзякуючы ААТ «Кляновічы». Некалі на землях сельсавета знаходзіліся два калгасы, якія пазней аб'ядналі ў адну гаспадарку — яна сёння моцна стаіць на нагах.

— Сам я з Гродзенскай вобласці, — падзяліўся Казімір Віктаравіч, — сюды прыехаў у 1984-м годзе і 15 гадоў адпрацаваў галоўным заатэхнікам. Ведаю з уласнага вопыту: калі на месцы ёсць моцная гаспадарка — будзе добра жыць вёска. А без яе падтрымкі вёска апынецца ў заняпадзе.

Асноўны кірунак ААТ «Кляновічы» — жывёлагадоўля. У Бобры пабудаваны сучасны малочны комплекс, завяршаюцца работы па будаўніцтве комплексу адкорму. Акрамя таго, у структуру ААТ «Кляновічы» ўваходзіць спіртзавод, 13 птушнікаў, цэх забою і цэх перапрацоўкі, яшчэ адзін малочны комплекс. Будуецца камбікормавы завод. Усё гэта — дадатковыя працоўныя месцы. Заробак у работнікаў ААТ «Кляновічы» дастойны — у сярэднім 1,2 мільёна рублёў. Большасць мясцовага насельніцтва працуе менавіта ў «Кляновічах».

У 2010 годзе будаўнікі здалі ў эксплуатацыю 5 домікаў катэджнага тыпу для спецыялістаў ААТ «Кляновічы» (з водаправодам, мясцовай каналізацыяй). Газ падведзены пакуль толькі да самога г.п. Бобр, але ў хуткім часе плануецца і «разводка» па хатах. Цяпер закладзены фундамент яшчэ на 7 домікаў, а ўсяго плануецца пабудаваць 24 такія дамы. Прычым на месцы знесеных старых хат. Такім чынам, развіваецца гаспадарка — ствараюцца новыя працоўныя месцы і будуецца новае жыллё. А значыць, маладзее вёска і гарадскі пасёлак Бобр, у прыватнасці.

Колькі змаглі, столькі зрабілі

Аграгарадок Замкі цалкам забяспечаны водаправодам, гарадскі пасёлак Бобр — на 50 працэнтаў. У пасёлку ёсць толькі калодзежы. За сродкі сельвыканкама сёлета быў пачышчаны і адрамантаваны 21 калодзеж у населеных пунктах сельсавета.

— Колькі змаглі, столькі зрабілі, — прызнаўся старшыня сельскага Савета. — Насамрэч, грамадскія калодзежы афіцыйна ні на чыім балансе не знаходзяцца, асобнага расходнага артыкула на ўтрыманне калодзежаў у бюджэце сельвыканкама няма. Даводзіцца «круціцца». Мы расходуем сродкі, закладзеныя на добраўпарадкаванне, заключаем дагаворы са службай МНС, якая і займаецца чысткай калодзежаў (між іншым, на адзін калодзеж неабходна 120-130 тысяч рублёў). У наступным годзе будзем імкнуцца давесці да ладу астатнія. Усяго на тэрыторыі сельсавета 126 грамадскіх калодзежаў. На баланс камунальнай службы сёлета перададзены толькі водаправоды.

Калодзеж добра функцыянуе, калі ім рэгулярна карыстаюцца. А калі побач з ім жыве адна бабуля, якой шмат вады не трэба, то вада застойваецца. У якасці прыкладу прывяду сітуацыю, якая назіралася ў вёсцы Вялікі Лес. У свой час там праклалі водаправод, вада паступала з мясцовай фермы. Неяк узімку з-за маразоў водаправод месцамі прамёрз, адрамантаваць адразу не атрымалася. І вёску ад сілкавання вадой з фермы часова адключылі. Людзі кінуліся да калодзежаў, а там — гнілая, стаялая вада. Давялося аператыўна іх чысціць. Сёння ў Вялікім Лесе водаправод зноў дзейнічае. Ёсць водаправод у Сакалавічах, у Старым Бобры, Дворышчы, Ерашоўцы.

Мы ўжо выходзілі з прапановай аб перадачы грамадскіх калодзежаў на баланс камунальных службаў. У нашым раёне такой практыкі няма, але, як тлумачаць раённыя ўлады, у блізкай перспектыве гэта будзе зроблена. Пакуль што мы праводзім чыстку там, адкуль нам паступае заяўка на нездавальняючы стан калодзежа. Намагаемся задаволіць усе заяўкі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

«Культурная» талака

13,5 мільярда рублёў затрацілі летась у Гродзенскім раёне на рамонт і аснашчэнне ўстаноў культуры. Сучасны выгляд набылі цэнтры культуры, дзіцячыя музычныя школы і школы мастацтваў, а таксама бібліятэкі ў дзевяці сельсаветах і Скідалі.

Сярод аб'ектаў, якія атрымалі, без перабольшання, другое жыццё, — Дом культуры ў Рацічах. Пасля капітальнага рамонту пад адным дахам размясціліся Цэнтр культуры і адпачынку, музычная школа і бібліятэка. Апошняя, дарэчы, прадастаўляе не толькі шырокі выбар кніг і перыядычных выданняў, але і выхад у інтэрнэт. А ў музычнай школе працуюць класы фартэпіяна, баяна, акардэона, цымбалаў, духавых інструментаў і нават балалайкі.

Адраджэнне Дома культуры ў Рацічах каштавала раённаму бюджэту больш за мільярд рублёў. Сваё плячо, можна сказаць, падставілі і сельгаскааператыў, мясцовыя прадпрымальнікі. Такой жа талакой у раёне збіраюцца аднаўляць і іншыя аб'екты культуры.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЗНАЙСЦІ СВАЮ «ФІШКУ» І ВЫГАДНА ПРАДАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Заслаўе мае 1025 гадоў «ад роду» і надзвычай багатую гісторыю. Тым не менш, горад не старэе — развіваецца. Тут налічваецца пяць раёнаў індывідуальнай забудовы і два раёны — шматпавярховай. Людзі будуюцца ў адпаведнасці з агульнай чаргой, а таксама набываюць кватэры ў прыватных забудоўшчыкаў. Праблем у жыхароў новых мікрараёнаў шмат. Ці можа мясцовая ўлада рэагаваць на іх аператыўна? З якіх крыніц атрымлівае інфармацыю?

— Нам дапамагаюць органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Яшчэ ў 2003 годзе мы зацвердзілі палажэнне аб вулічных і дамавых камітэтах, распрацавалі спецыяльныя пасведчанні. Толькі абапіраючыся на грамадскасць, улада можа дабіцца рэальных вынікаў, — упэўнена Ніна Бухавец.

На тэрыторыі Заслаўя знаходзіцца вядомы гісторыка-культурны музей-запаведнік, які штогод наведваюць сотні гасцей. Прыцягненне турыстаў — яшчэ адзін важны накірунак працы мясцовай улады. Не толькі ў Заслаўі, а і, напрыклад, у горадзе Дзісна Міёрскага раёна.

Не Парыж, але ўсё ж...

Штогод Дзісненскі гарадскі Савет дэпутатаў праводзіць сходы грамадзян, штогод яго старшыня Вольга Мароз выслухоўвае адны і тыя ж нараканні: на дарогі, асвятленне, адсутнасць умоў для занятасці працаздольнага насельніцтва... На жаль, бюджэт горада раённага падпарадкавання да пэўнага часу не меў неабходных сродкаў для вырашэння гэтых пытанняў — пакуль на адным з такіх сходаў Вольга Аляксандраўна не звярнулася да мясцовых жыхароў з пытаннем: якім вы бачыце шлях адраджэння нашага горада? Самы малады удзельнік сходу, студэнт БДУ, прапанаваў адрадзіць горад з дапамогай... турызму.

— Тады я падумала: які турызм? Дзісна — гэта ж не Парыж. Тут няма ні мора, ні гор — чым завабліваць людзей? Але ж «зерне» было пасеяна, мы пачалі пошук новых магчымасцяў. А хто шукае — той, вядома, знаходзіць.

На адной з канферэнцый, прысвечаных мясцоваму самакіраванню, яна пачула, як госць з Польшчы расказваў: маўляў, знаходзім камень, прыдумваем яму легенду, а потым водзім да яго турыстаў і збіраем грошы. А ёй і прыдумваць нічога не трэба было: усё наваколле «дыхала» легендамі і цікавымі гісторыямі, якія пры жаданні і пэўнай фінансавай падтрымцы можна было ператварыць у брэнд...

— У той жа Польшчы нават старыя малаказавод выкарыстоўваецца ў якасці турыстычнага аб'екта. А мы літаральна штодзень сутыкаемся з такімі «фішкамі» і не разумеем, што іх можна «прадаваць» — выкарыстоўваць для патрэбаў цікаўных турыстаў. У выніку мы падалі заяўку на ўдзел у праекце ПРААН, прысвечаным распрацоўцы і рэалізацыі нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця. І, як ні дзіўна, выйгралі.

«Стратэгія ўстойлівага развіцця Дзісненскага краю» стала першай у Беларусі Мясцовай павесткай для сельскіх рэгіёнаў.

— Па вялікім рахунку, мы з вамі ўсе прадпрымальнікі, — сказаў, звяртаючыся да ўдзельнікаў семінара, **генеральны дырэктар сумеснага нямецка-беларускага прадпрыемства «Хенкель Баўтэхнік», дэпутат абласнога Савета Сяргей НАВІЦКІ**. — А таму не павінны сябе адзін аднаму проціпастаўляць. Калі чалавек імкнецца займацца прыватным бізнэсам, трэба даць яму такую магчымасць. Няхай ён робіць тое, што хоча — зразумела, у межах дзейнага заканадаўства. Ініцыятыву неабходна стымуляваць.

Наталля КАРПЕНКА.

Мінск—Заслаўе.

ДЫК КОЛЬКІ КРЫНІЦ?

Работнікі пракуратуры ў Віцебскай вобласці праверылі, як выконваюцца патрабаванні закона аб пітным водазабеспячэнні. Некаторыя вынікі проста не могуць не здзіўляць.

У прыватнасці, высветлілася, што на момант праверкі гарадскія і раённыя выканкамы, органы кантролю нават не валодаюць дакладнай інфармацыяй аб колькасці крыніц пітнога водазабеспячэння. Напрыклад, у Пастаўскім раёне, паводле інфармацыі мясцовага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, налічваецца 65 такіх крыніц, а па звестках інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, іх нават больш за 150! І гэта пры тым, што ў раённым Савеце дэпутатаў у свой час налічылі... толькі 100. Блыталіся ў адпаведных лічбах і ў Мёрскім, Шумілінскім, Сенненскім раёнах... Даванне дакладных звестак можна было лічыць хутчэй выключэннем.

У выніку атрымалася, што ў цэлым па вобласці, паводле звестак Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, знаходзіцца 3356 крыніц пітнога водазабеспячэння, а па інфармацыі Віцебскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя — толькі 2666.

Устанавілі, што не распрацаваны ў адпаведнасці з патрабаваннямі праекты зон санітарнай аховы для большасці такіх крыніц. У Лёзненскім раёне, у вёсцы Перамонт, менш чым за трыццаць метраў ад артэзіянскай крыніцы чамусьці зрабілі пляцоўку для выгулу жывёлы. У Сенненскім раёне, у населеным пункце Ульянавічы, ля воданапорнай вежы знаходзіліся цыстэрны з вадкім угнаеннем. Зафіксаваная і іх уцечка.

З парушэннямі размешчаныя водазаборы падземных вод на тэрыторыі прадпрыемстваў і жылой забудовы. У Аршанскім раёне водазаборы знаходзяцца на тэрыторыі мясакансервавага камбіната, ільнокамбіната, хлебазавода і гэтак далей. У Гарадку ў жылых кварталах месяцца тры водазаборы...

Рэалізацыя раённых праграм «Чыстая вада», абмежаваных 2006—2010 гадамі, знаходзіцца пад пытаннем. У Докшыцкім і Глыбоцкім раёнах такія праграмы наогул не распрацоўваліся і раённымі Саветамі не зацвярджаліся.

Як паведаміла Валянціна Хадасевіч, старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці па наглядзе за выкананнем прыродаахоўнага заканадаўства, органы пракуратуры вобласці падрыхтавалі тры дзясяткі актаў рэагавання з мэтай устаранення парушэнняў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Як і сто гадоў таму — каб не прапасці ў агні

Аказваецца, так званаму Вольнаму пажарнаму таварыству ў Брэсце больш за сто гадоў. У XIX стагоддзі горад моцна цярпеў ад пажараў. Найбольш жорсткія і ахвярныя з іх здараліся ў 1802, 1822, 1828, 1835 гадах. Не пакінула гэтая навала горад і пазней. І вось у 1897 годзе кіраўніцтва горада заснавала названае вышэй таварыства. Мецэнаты ахвяроўвалі сродкі, гараджане арганізоўвалі пажарныя каманды.

Традыцыя дажыла да нашых дзён. Сваё ўвасабленне яна мае ў цяперашнім рэспубліканскім дзяржаўна-грамадскім аб'яднанні «Беларускае добраахвотнае пажарнае таварыства». Цяпер гэта, вядома, іншая арганізацыя, чым была стагоддзе таму. Яна мае свае прадпрыемствы, вытворчасцю разнастайнага супрацьпажарнага абсталявання і іншых тавараў зарабляе грошы. Але галоўная мэта аб'яднання, як і сто гадоў таму — навучаць людзей бяспецы, дапамагаць захоўваць меры прафілактыкі.

І. Аўсянік, В. Астапаў (у цэнтры), К. Шаршуновіч.

Нядаўна на канферэнцыі быў абраны новы старшыня савета Брэсцкай абласной арганізацыі Ігар Аўсянік. Ігар Анатольевіч шмат гадоў праслужыў у сістэме МНС, мае вопыт работы ў гарадскім Савеце дэпутатаў. Таму яго кандыдатуру таварышы па арганізацыі падтрымалі амаль аднадушна. Удзельнікі сходу абмяняліся думкамі наконт паляпшэння сваёй работы і шляхоў развіцця арганізацыі.

Валерый АСТАПАЎ, старшыня Рэспубліканскага савета добраахвотнага пажарнага таварыства сказаў, што дзяржаўна-грамадская арганізацыя не карыстаецца ніякімі датацыямі з бюджэту:

— Што можам, тое і зарабляем. Хоць ва ўмовах рынку пры жорсткай канкурэнцыі годна выглядаць у эканамічным плане робіцца ўсё больш складана, лічым сваім абавязкам кожны год не менш за 10-15% ад прыбытку накіроўваць на арганізацыю прафілактычных мерапрыемстваў. Актывісты БДПТ не толькі праводзяць прапагандысцкія і асветніцкія мерапрыемствы, але і аказваюць шэраг адпаведных паслуг насельніцтву, устанаўліваюць пажарныя апавяшчальнікі ў якасці дапамогі ветэранам вайны, састарэлым, адзінокім людзям, шматдзетным сем'ям.

Новы **старшыня абласнога савета Ігар АЎСЯНІК** акрэсліў свае бліжэйшыя планы так:

— Найперш трэба ўмацаваць структуры нашага таварыства ў кожным раёне. А потым працаваць з канкрэтнымі камандамі прадпрыемства, сельсавета, СВК. Трэба, каб добраахвотных пажарных каманд было як мага больш. Людзі, якія ўваходзяць у гэтыя фарміраванні, як правіла, годна паводзяць сябе ў экстрэмальнай сітуацыі. Сёння мы можам ганарыцца ўчынкам нашага актывіста, лесніка Гарадзішчанскага лясніцтва Баранавіцкага лясгаса Мікалая Сташэўскага. Ён бясстрашна ўвайшоў у палаючы дом аднавяскоўца і выцягнуў з пажару гаспадара. А зусім нядаўна, у снежні мінулага года, добраахвотнікі СВК «Рубельскі» Столінскага раёна выратавалі у начным пажары адразу двух чалавек.

Начальнік Брэсцкага абласнога МНС Канстанцін ШАРШУНОВІЧ выказаў сваю пашану арганізацыі, якая праводзіць вялікую работу па прафілактыцы пажараў і навучанню насельніцтва азам бяспечных паводзін у сваім штодзённым жыцці.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ОАО «НАФТАН» РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ (с повышением начальной цены) НЕИСПОЛЬЗУЕМОЕ ИМУЩЕСТВО:

- **КУЛЬТИВАТОР б/у, 2002 г.в., начальная цена — 142 440 руб. РБ;**
- **БОРОНА б/у, 2002 г.в., 2 шт., начальная цена — 179 229 руб. РБ за 1 шт.;**
- **КОСИЛКА б/у, 2002 г.в., начальная цена — 625 125 руб. РБ;**
- **ПЛУГ б/у, 2002 г.в., начальная цена — 108 069 руб. РБ.**

Назначение — навесное оборудование к мини-трактору МТЗ-082.
Состояние — хорошее.

Предложения принимаются по адресу: 211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101 с пометкой «В комиссию по реализации неиспользуемого имущества» (навесное оборудование к мини-трактору) до 8 февраля 2011 года. Извещение на проведение конкурса размещено на сайте www.naftan.by.

Контактные телефоны: 8 (044) 758 08 33, 8 (0214) 55 79 07.

УНП 300042199

ОАО «ЛИФТСЕРВИС» извещает о созыве годового собрания акционеров

Собрание состоится 17 февраля 2011 г. по адресу: г. Минск, 1-й Велосипедный пер., 5, 4 этаж, актовый зал. Регистрация участников собрания с 12.00 до 12.45. Начало работы собрания в 13.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2010 г. и основных показателях производственной программы и финансового плана на 2011 год.
2. Отчет Наблюдательного совета Общества.
3. Отчет Ревизионной комиссии Общества.
4. О выборах Наблюдательного совета Общества.
5. О выборах Ревизионной комиссии Общества.
6. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционер ОАО «Лифтсервис» принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности.

Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт и доверенность.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества.

УНП 100088852 ***Наблюдательный совет.***

«Як жывеш, Бобр?»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

...Сёлета ўсе дарогі сельскі населеных пунктаў Бобрскага сельсавета перададзены на баланс ДРБУ. За выключэннем гарадскога пасёлка Бобр, якому перашкаджаў трапіць да дарожнікаў яго статус: гарадскі пасёлак усё ж не вёска.

— Па вялікім рахунку, тут патрэбна стварыць сваю камунальную службу. Аднак я ж ўсё роўна пакуль што заключаю дагавор на чыстку дарог з ДРБУ, таму на ўзроўні раёна было прынята рашэнне, згодна з якім у бюджэт Бобрскага сельвыканкама будуць закладвацца мэтавыя сродкі, якія пойдуць на аплату работ дарожнай арганізацыі па рамонце дарог у гарадскім пасёлку Бобр. Пакуль што стан нашых дарог, у тым ліку і ў самім гарадскім пасёлку Бобр, — далёкі ад ідэальнага. Безумоўна, гэта не тычыцца цэнтральных, «скразных» дарог — яны на належным узроўні.

Ведаць, куды звяртацца

У г.п. Бобр працуе 4 стацыянарныя магазіны (два — ад райпа і два — прыватныя). Ва ўсіх прапануюцца тавары паўсядзённага попыту.

— З'яўленне прыватных магазінаў стала добрым стымулам для сістэмы райпа, — падкрэсліў Казімір Віктаравіч. — Асартымент у іх магазінах цяпер больш разнастайны, чым раней. У чалавека сёння ёсць выбар — куды пайсці і дзе патраціць свае грошы. З прадуктамі харчавання, з прамысловымі таварамі паўсядзённага попыту ў гарадскім пасёлку Бобр пытанняў не ўзнікае. А што тычыцца вопраткі, то мясцовыя жыхары едуць па абноўкі на рынак у райцэнтр (Крупкі ўсяго за 8 кіламетраў ад нашага пасёлка). Аўтобусы ходзяць рэгулярна. У святочныя і выхадныя дні ў самім Бобры ўстанаўлівае сваю гандлёвую палатку прадпрымальнік. Бытавую тэхніку можна заказаць у любым магазіне райпа. Вы афармляеце заяўку і праз некалькі дзён забіраеце яе ў сваім вясковым магазіне. Скаргаў на асартымент і на работу магазінаў у гарадскім пасёлку ў сельвыканкам не паступала.

З адзеннем для нябожчыкаў таксама праблем няма, падкрэсліў старшыня. Крупкі — недалёка. Матэрыяльную дапамогу на пахаванне ўсё роўна трэба атрымліваць у райвыканкаме (сельвыканкам толькі выдае патрэбныя дакументы). Пры крупскім моргу ёсць магазін рытуальных паслуг. Акрамя таго, усё неабходнае можна набыць у крупскім КБА (які аказвае ўвесь комплекс паслуг — ад продажу вянкоў да прадастаўлення рабочых).

— Набыць вянок, труну, крыж, падпісаць стужку на вянку можна і ў нашым КПП, што ў самім гарадскім пасёлку Бобр.

Як кажуць, лепш раз убачыць, чым сто разоў пачуць. Таму, каб праверыць інфармацыю пра беднасць пасялковых магазінаў на тавары, я завітала ў два з іх. Першым патрапіўся магазін № 5 Крупскага райпа ў г.п. Бобр.

— Скаргаў на асартымент у нас няма, — патлумачыла **загадчыца магазіна Зоя ЖОРАВА**, — усе папярэднія заяўкі мы выконваем літаральна ў 3-4 дні. Вось бачыце, толькі што пыласос набылі. Заказваюць у нас самае рознае, што каму трэба: цюнеры, будаўнічыя матэрыялы, перад Новым годам заказалі шмат тартоў.

Хлеб і малако завозім кожны дзень, апроч нядзелі (пастаўкі з Барысава, Жодзіна, Беразіно). Да калядна-навагодніх свят папоўнілі запасы шампанскага, тартоў (з Крупак, Барысава, Жодзіна, Беразіно). Я працую тут з 1980 года і бачу, як змяніліся нашы спажыўцы. Яны сталі больш патрабавальнымі, больш пераборлівымі. Тым не менш, мы ім ніколі не адмаўляем.

...У дзень майго візіту на паліцах магазіна № 5 былі выстаўлены хлебабулачныя (Жодзіна, Барысаў, Беразіно), малочныя вырабы (з 4 малаказаводаў вобласці), яйкі, мясныя і рыбныя паўфабрыкаты (пельмені, галубцы, катлеты, свініна, мяса птушкі, шпік, сала і г.д.), свежая садавіна-гародніна, крупы, сумесі для дзіцячага харчавання і інш. Большасць найменняў прадукцыі магазіна была прадстаўлена адразу ў некалькіх «версіях» — ад розных вытворцаў, каб забяспечыць пакупніку выбар. Патрапіліся на вочы пакеты з кормам для катоў, ды яшчэ ў разнастайным асартыменце.

— А што вы думалі, — патлумачыла Зоя Іванаўна, — у нас цяпер многія і катоў, і сабак кормяць спецыяльнай ежай, таму гэты тавар у нас заўсёды ёсць у наяўнасці.

На 56-ці квадратных метрах гандлёвай залы магазіна № 5 знайшлося месца для спадарожных тавараў (сродкаў асабістай гігіены, бытавой хіміі, цвікоў, сезоннага абутку, электралямпачак і г.д.). Тут жа чакалі сваіх пакупнікоў заказаныя раней мікрахвалевыя печкі і духавыя шафы. А ўбаку, ля сцяны, нагадвалі аб вечнасці рытуальныя прыналежнасці — пахавальны вянок, адзенне для нябожчыкаў (касцюм, сукенка). У продажы таксама аказалася ніжняя бялізна для нябожчыкаў, хусткі, кашулі, туфлі.

— Можа здарыцца так, што ў магазіне не будзе патрэбнага памеру, — патлумачыла загадчыца, — але ў нашай сістэме райпа ёсць свой спецыялізаваны магазін. Мы тэлефануем туды, і нам адразу прывязуць тое, што неабходна (на такі выпадак заўсёды падрыхтавана дзяжурная машына). Пытанні з адзеннем і абуткам для нябожчыкаў можна вырашыць аператыўна. Не разумею, чаму чалавек, у якога, як вы кажаце, узнікла з гэтым праблема, не звярнуўся да мяне.

Побач з магазінам райпа ў гарадскім пасёлку Бобр знаходзіцца яго канкурэнт — прыватны магазін УП «КірПалс», дзе таксама можна знайсці багаты выбар тавараў паўсядзённага попыту. Нягледзячы на больш сціплую плошчу, тут, як і ў суседа з сістэмы райпа, дастойна прадстаўлены малочная і мясная групы тавараў, хлебабулачныя вырабы, рыба і паўфабрыкаты. Ёсць пральныя парашкі, мыла, сродкі гігіены, цацкі, алкаголь, садавіна.

— Мы вывучаем попыт і імкнёмся прапанаваць нашаму насельніцтву ўсё неабходнае, — патлумачыла **загадчыца магазіна Ірына НЕВЯДОМСКАЯ**, якая працуе тут 10 гадоў. — Прычым мы чаргуем пастаўшчыкоў: адзін тыдзень заказваем прадукцыю Слонімскага і Мінскага мясакамбінатаў, другі — Барысаўскага і Слуцкага. Людзі маюць магчымасць пасмакаваць усё і зрабіць свой выбар.

— Нашы мясцовыя жыхары на ўмовы пражывання не скардзяцца, — падкрэсліў Казімір Бучылка. — Скардзяцца тыя, хто з'ехаў у Мінск, у іншыя буйныя гарады і цяпер «прымярае» гарадскія стандарты на вёску. Трэба рабіць пэўную папраўку, улічваць спецыфіку сельскай мясцовасці.

...Хочацца спадзявацца, што такая «спецыфіка» не стане перашкодай на шляху вырашэння элементарных пытанняў жыццезабеспячэння людзей.

Інга МІНДАЛЁВА.

Крупскі раён.

ДВА ЗАЛАТЫЯ МЕДАЛІ НАСТАССІ ЗАБЛОЦКАЙ

Гродзенская школьніца Настасся Заблоцкая вызначылася ў Мінску на чэмпіянаце Рэспублікі Беларусь па тэнісе сярод дзяўчат да шаснаццаці гадоў. Яна заваявала два залатыя медалі ў адзіночным і парным разрадах, выканаўшы нарматыў майстра спорту. У пачатку лютага Настасся Заблоцкая пад нумарам «1» будзе прадстаўляць нашу краіну на чэмпіянаце Еўропы.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

№ лота	Наименование объекта/Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Открытый склад № 2** с пропарочными камерами (инв. № 350/С-85654)/ общая площадь 2049 кв.м; фундамент – ж/б блоки, стены – сборно-железобетонный каркас, перекрытия – металлические фермы	149 295 960	14 930 000
2	**Здание растворного узла № 2** с пристройкой (инв. № 350/С-44483) и галереей/ кирпичное 4-этажное здание общей площадью 255,84 кв.м	59 355 180	5 936 000

Продавец имущества: Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Центрального района, адрес объектов: **г. Гомель, ул. Борисенко, 7.** Шаг торгов – 5 %.

Срок подачи заявления	**До 17.00 26 января 2011 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а
Дата, время, место проведения аукциона	**27 января 2011 г. в 12.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиала РУП «Жилкоммунтехника» Центр «Белтехинвентаризация»
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012029970016 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по г. Минску, код 334, ОКПО 55484006, УНН 102353509
Условие пользования	Объекты продаются в собственность

Более подробная информация о перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» за № 209 от 26.10.2010 г.

Дополнительная информация по тел.: 8 (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс), www.bti.by

Управляющий по делу о банкротстве ЧП «Автомобильный дом СИБЕЛГ» Монтик Д.Н. – организатор торгов сообщает о проведении ТОРГОВ по продаже транспортных средств ЧП «Автомобильный дом СИБЕЛГ», а именно:

№ лота	Наименование лота	Количество	Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС)	Шаг торгов, бел. руб. (5 % от начальной цены)	Задаток, бел. руб. (5 % от начальной цены)
1	Седельный тягач МЕРСЕДЕС-БЕНЦ 1843, рег. номер АА2508-4, 2002 г.в.	1	97918460	4895923	4895923

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

Торги состоятся 27 января 2011 года в 15.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5.

До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: ЧП «Автомобильный дом СИБЕЛГ», р/с 3012000003533 в филиале № 6 ОАО «Белгазпромбанк» г. Гродно, код 194, УНП 500520667.

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления до 15.00 26.01.2011 по адресу: 230001, г. Гродно, а/я 27 или по факсу 8(0152)526859. Задаток должен поступить на указанный счет не позднее 15.00 26.01.2011.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5, тел. 8(029)6309211, тел./факс 8(0152)526859.

Извещение о повторном открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно

№ лота	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Площадь земельного участка (га)	Кадастровый номер	Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1.	Земельный участок У-54К*	м-н «Южный-4»	0,1195	440100000003004043	1 610 806	21 000 000	2 100 000
2.	Земельный участок У-56К*	м-н «Южный-4»	0,1161	440100000003004045	1 610 806	21 000 000	2 100 000
3.	Земельный участок У-57К*	м-н «Южный-4»	0,1181	440100000003004046	1 610 806	21 000 000	2 100 000

**Земельный участок победителю аукциона предоставляется на праве собственности. Инженерные коммуникации на участках отсутствуют.*

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

Юридическое лицо: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

Физическое лицо: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за объект осуществляется по безналичному расчету в течение 10-ти рабочих дней с момента вынесения решения горисполкома о передаче земельного участка победителю аукциона.

3) Победитель аукциона обязан в течение 10-ти рабочих дней с даты принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

Аукцион состоится 25 января 2011 года, в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2. Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 **с 13 января 2011 г. по 19 января 2011 г.** Телефон для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: www.gorod.grodno.by

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.

Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

ЗВЯЗДОЎСКІ ПРЫЗ — НА ПРАСПЕКТ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

Падпіска-2011

Ва ўчарашнім нумары газеты быў змешчаны анонс розыгрышу прызоў сярод нашых прыхільнікаў, якія аформілі падпіску на старэйшае беларускамоўнае выданне на першы квартал ці 1-е паўгоддзе 2011 года.

Прыемна адзначыць, што і на гэты раз звяздоўцы праявілі актыўнасць, даслаўшы ў рэдакцыю нямала запоўненых купонаў. Адразу просім прабачэння ў тых, калі ў сённяшняй публікацыі ў назвах населеных пунктаў ці прозвішчаў укралася недакладнасць, бо не ўсе квіткі запоўнены разборліва.

Як і раней, і на гэты раз каштоўныя прызы — тэлевізары і мікрахвалевую печ — супрацоўнікі газеты даставяць вам, паважаныя падпісчыкі, па месцы вашага пражывання ў перыяд падпісной кампаніі на 2-гі квартал бягучага года і ўручаць ва ўрачыстай абстаноўцы ў прысутнасці работнікаў РУП «Белпошта» і кіраўніцтва мясцовай «вертыкалі». Зрэшты, калі ў вас не будзе магчымасці (пры абавязковай наяўнасці грамадзянскага пашпарта і падпіснай квітанцыі) атрымаць у рэдакцыі, пачынаючы з сённяшняга дня, іншыя прызы, мы таксама ў бліжэйшы час прывязём іх па адрасах шчасліўчыкаў.

Яшчэ раз віншуем сённяшніх уладальнікаў новай бытавой тэхнікі. Асаблівыя словы падтрымкі і электрачайнік у прыдачу — мінчанцы Любові Якаўлеўне Нікіфаравай, якая жыве ў Мінску на праспекце газеты «Звязда». Прасілі б не засмучацца тых, каму птушка ўдачы на гэты раз не ўсміхнулася. Гуляйце і выйгравайце!

Кар. «Звязды».

11 студзеня 2011 года адбыўся розыгрыш прызавога фонду рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», арганізатарам якой з'яўляецца ўстанова «Рэдакцыя газеты «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Рэкламная гульня «Падпішыся на «Звязду» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 3 лістапада 2010 года (пасведчанне № 1794) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 13 лістапада 2010 года па 31 сакавіка 2011 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» першага квартала або першага паўгоддзя 2011 года.

Удзел у гульні прынялі 1089 падпісчыкаў газеты «Звязда». Прызавы фонд гульні разыграны поўнасцю.

Прызы сярод удзельнікаў гульні размеркаваліся наступным чынам:

ЭЛЕКТРАЧАЙНІКІ «ВІЦЯЗЬ 101» выйгралі:

Некраш Святлана Андрэеўна, г. Брэст,

Анікіевіч Ларыса Аляксееўна, в. Васількова Сенненскага раёна,

Цяслюк Яўгенія Іванаўна, п. Зашыр'е Ельскага раёна,

Жыдзель Іван Станіслававіч, г. Іўе,

Казачонак Іван Уладзіміравіч, г. Магілёў,

Жук Канстанцін Канстанцінавіч, г. Жодзіна,

Нікіфарава Любоў Якаўлеўна, г. Мінск;

МАШЫНЫ КУХОННЫЯ ЭЛЕКТРЫЧНЫЯ «БЕЛВАР» КЭМ-36/220-4-24 выйгралі:

Пабягайла Валянціна Іванаўна, г. Ляхавічы,

Дзянісава Браніслава Данатаўна, в. Плюсы Браслаўскага раёна,

Міраеўская Яўгенія Дзмітрыеўна, г. Жлобін,

Крыцкая Ніна Уладзіміраўна, г. Свіслач,

Міранавіч Міхаіл Іванавіч, в. Мышкавічы Кіраўскага раёна,

Васілеўская Ганна Іосіфаўна, в. Блеўчыцы Капыльскага раёна,

Клокель Уладзімір Уладзіміравіч, г. Мінск;

ТЭЛЕВІЗАРЫ «ВІЦЯЗЬ» 54 CTV 760-7 выйгралі:

Гатоўчыц Ірына Вячаславаўна, в. Крывошын Ляхавіцкага раёна,

Тамашоў Васіль Іванавіч, г.п. Ушачы,

Федасенка Мікалай Клімавіч, в. Страдубка Лоеўскага раёна,

Бузук Анатоль Аляксандравіч, в. Малыя Шастакі Дзятлаўскага раёна,

Сімановіч Марыя Міхайлаўна, в. Усціж Асіповіцкага раёна,

Шыманская Наталія Мікалаеўна, пас. Новагарадзейскі Нясвіжскага раёна,

Філічонак Л.А., г. Мінск;

ПЕЧ ЗВЧ «ВІЦЯЗЬ» 1378-МП 17-700-2 выйграў:

Шмігельскі Іван Аляксандравіч, в. Баяры Мядзельскага раёна.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні: (017) 287 19 68.

Вяртаючыся да надрукаванага

Цёпла ў кватэры стала толькі на паперы?..

У нумары «Звязды» ад 21 снежня мінулага года пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» быў змешчаны матэрыял «Прыйшла сяброўка ў госці. Засталася ў верхнім адзенні — холадна». Як ужо вынікае з загалоўка, гаворка ішла пра ацяпленне жытла: мінчанка з дома № 6 па 2-м завулку Р. Люксембург не першы год пакутуе ад халадэчы ва ўласнай кватэры, а звароты ў ЖЭС не вельмі дапамагаюць — дакладней, кардынальна сітуацыю не выпраўляюць. Вось і ў гэты раз, ужо не спадзеючыся на ЖЭС-14, жанчына папрасіла дапамогі ў газеты.

«У кватэры плюс 15 градусаў. Хварэю трэці тыдзень, і палёгкі няма», гаварыла яна тады. Нагадаем, зварот прагучаў напярэдадні абяцанага пахаладання. Мы звязаліся з галоўным інжынерам ЖЭСа, якая пасля праверкі выкладзеных фактаў паведаміла, у прыватнасці, што па цеплавузле ніякіх праблем няма, там усё — згодна з графікам. Гэтак жа як і з батарэямі — паветра ў сістэме няма. Тэмпература ў жыллі заяўніцы складае плюс 18 градусаў, што адпавядае мінімальнай санітарнай норме. Яшчэ запэўніла, што будзе праведзена спецыяльнае абследаванне кватэры з мэтай высвятлення, ці трэба ўцяпляць сцены, бо, магчыма, справа ў іх прамярзанні.

Праз некалькі дзён ад чытачкі стала вядома, што ў кватэры стала значна цяплей. А ўжо ў пачатку студзеня гэтага года рэдакцыя атрымала і афіцыйнае рэагаванне на публікацыю з дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка». Наконт, як гаворыцца ў паперы, «неадпаведнасці тэмпературы паветра ў жылым памяшканні сацыяльным стандартам».

«Прадстаўнікамі УП «ЖРЭА Маскоўскага раёна г. Мінска» 13.12.2010 г. праведзена камісійнае абследаванне кватэры... Падчас яго слядоў сырасці і цвілі на сценавых панэлях не выяўлена. Сістэма вентыляцыі знаходзіцца ў працоўным стане.

З мэтай вызначэння адпаведнасці тэрмічнага супраціўлення агароджваючых канструкцый кватэры нарматыўным патрабаванням... праведзена інструментальнае абследаванне сценавых панэляў. Тэмпература сценавых панэляў склала ад плюс 14,2 да плюс 16,8 градуса. Тэмпература паветра ў кватэры ў дзень абследавання, пры тэмпературы вонкавага паветра мінус 6 градусаў, склала плюс 20 градусаў, што адпавядае санітарным нормам і сацыяльным стандартам.

Эксплуатуючай арганізацыяй 16.12.2010 г. паўторна праведзены замеры тэмпературы паветра ў кватэры. Пры тэмпературы вонкавага паветра мінус 8 градусаў тэмпература паветра ў кватэры адпавядала сацыяльным стандартам, паколькі склала плюс 20,5 градуса».

Здавалася б, праблема канкрэтнага чалавека вырашана і можна толькі парадавацца за яго. Аднак гісторыя мела працяг. Зноў даём слова заяўніцы.

— Замяраць тэмпературу прыходзілі яшчэ 29 і 31 снежня. Паветра ў кватэры сапраўды прагравалася да плюс 20 градусаў. Але ўжо з 2 студзеня тэмпература пачала паніжацца. 3-га чысла была плюс 17, 6-га — плюс 16. Зноў была вымушана тэлефанаваць у ЖЭС. Прыйшла майстар — сапраўды, пацвердзіла, у кватэры было плюс 16. Пры гэтым заўважыла, што нешта там ужо выправілі і тэмпература павінна павялічыцца. Папрасіла 7 студзеня патэлефанаваць дыспетчару і паведаміць тэмпературу. Патэлефанавала і сказала: усё тыя ж плюс 16 градусаў, — распаўзяла чытачка. — 9 студзеня батарэі былі ўвогуле халодныя. У чарговы раз звярнулася ў ЖЭС, дзе мне заўважылі, што з нашага пад'езда ўжо паступіла аналагічная скарга. 10 чысла я напісала пісьмовую заяву на адрас 6-га ўчастка ЖРЭА Маскоўскага раёна. 11-га зноў прыйшлі замяраць тэмпературу. Паклалі побач два градуснікі. На маім было плюс 17, на жэсаўскім — плюс 18. «А што вы хочаце, мінімальны сацыяльны стандарт», — зноў пачула я. У гэтай сувязі ў мяне скаліся некаторыя ўражанні. У прыватнасці, што тэмпературу спецыяльна павялічваюць перад замерамі. І яшчэ — холадна толькі па нашым «стаяку», суседзі з іншых такіх праблем не маюць. Між тым квартплату мы плацім усе аднолькавую. Толькі ў маёй кватэры па-ранейшаму холадна...

Дык што ж атрымліваецца: цёпла ў кватэры стала толькі пасля звароту ў рэдакцыю — да новага года? А потым усё добра — толькі на паперы?..

Сяргей РАСОЛЬКА.

Як нас дураць

Пад «шыльдай» ахоўнікаў правапарадку

Амаль на 300 тысяч рублёў «кінулі» занадта даверлівага мужчыну два «міліцыянеры», адзін з якіх на самай справе з'яўляўся... сантэхнікам аднаго з гродзенскіх прадпрыемстваў, а другі... наогул нідзе не працаваў.

Да Мікалая Сяргеевіча, які быў моцна «пад мухай», яны падышлі каля адной з крам у абласным цэнтры, прадставіліся супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з п'янствам Міхаілам Міхайлавічам і Мікалаем Мікалаевічам і папрасілі паказаць, што ў пакеце. Маўляў, праводзіцца нейкая праверка. А ў пакеце — віно. Гэтага аказалася дастаткова для пакарання, прычым афармленне адпаведных дакументаў вырашана было правесці не ў аддзяленні міліцыі, а ... на кватэры затрыманага. І тут жа ў яго ўзялі штраф, паабяцаўшы выдаць квітанцыю пазней.

Мікалая Сяргеевіча не насцярожыла ні назва аддзела, дзе служаць «Міхаіл Міхайлавіч» і «Мікалай Мікалаевіч» (такога падраздзялення ў органах унутраных спраў няма), ні парадак прад'яўлення штрафных санкцый. Нават дакументамі «ахоўнікаў правапарадку» ён не пацікавіўся. А калі так, то чаму б не прадоўжыць «прафілактыку»?

Увечары на наступны дзень «аператыўнікі» зноў прыйшлі ў тую ж кватэру, але цяпер ужо з пытаннем, на каго яна афармлена. На сястру? Гэта няправільна, заявіў «Міхаіл Міхайлавіч» і прапанаваў свае паслугі ў пераафармленні кватэры на Мікалая Сяргеевіча. Маўляў, у яго ёсць сувязі ў судзе, а юрыдычную дапамогу ён бярэ на сябе. Дык што, яшчэ ўчора — супрацоўнік аддзела па барацьбе з п'янствам, а сёння ўжо адвакат?

Аднак і гэтая нестыкоўка не перашкодзіла «адвакату», які міманодзь паказаў нейкі «сертыфікат», тут жа атрымаць аванс у памеры 100 тысяч рублёў — у абмен на распіску і нумары сваіх кантактных тэлефонаў. Пасля чаго, як кажуць, пайшло-паехала... З Мікалая Сяргеевіча бралі грошы быццам на бензін для аўтамабіля судовага выканаўцы, які прыедзе па пытаннях пераафармлення кватэры (замест яго, зразумела, зноў наведаліся махляры), проста ў доўг і нават на... на паездку ў вёску да хворай бабулі.

Пры гэтым у яго, відавочна, не маглі не з'явіцца падазрэнні аб махлярстве. Аднак перспектыва быць пастаўленым на наркалагічны ўлік з накіраваннем у лячэбна-працоўны прафілакторый, чым прыстрашылі Мікалая Сяргеевіча, спачатку стрымлівала яго ад звароту да сапраўдных праваахоўнікаў. Да таго часу, пакуль «Міхаіл Міхайлавіч» і «Мікалай Мікалаевіч» не страцілі цікавасць да сваёй ахвяры (не было ўжо чаго «пазычаць»), а ў Мікалая Сяргеевіча не атрымалася вярнуць хоць бы ўзятае ў доўг, бо пакінутыя «адвакатам» нумары тэлефонаў належалі, як аказалася, зусім іншым людзям.

Праўда, падчас следства з ім усё ж разлічыліся, што было ўлічана судом пры вызначэнні махлярам пакарання: волю ім абмежавалі, але без знаходжання ў папраўчай установе. Акрамя таго, аднаго з іх накіравалі на прымусовае лячэнне ад хранічнага алкагалізму сярэдняй стадыі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Сам сабе псіхолаг

ДА КАГО КРАДЗЕЦЦА СТРАШНЫ СТРЭС?

Многія лічаць, што ўсе хваробы «ад нерваў». Некаторыя трымаюцца з апошніх сіл, каб не сарвацца. Ёсць і шчасліўчыкі з непрабівальнай псіхікай. А наколькі блізкія да стрэсу вы? Ці можна пазайздросціць вашым нервам?

- Ці раздражняе вас, калі занадта доўга трэба чакаць аўтобус, электрычку, стаяць у заторы?
- Ці выводзяць вас з сябе тыя, хто пастаянна спазняецца?
- Ці пакутуеце вы ад бяссонніцы?
- Ці можа вас вывесці з сябе нейкая дробязь?
- Ці адчуваеце вы пастаянную трывогу?
- Ці ўпэўненыя вы, што алкаголь здымае стрэс?
- Ці пазбягаеце вы яркіх тонаў у адзенні, аддаючы перавагу шэраму, чорнаму, някідкаму?
- Ці залежыць ваш настрой, самаадчуванне ад надвор'я?
- Ці ўзнікае ў вас адчуванне, што вы нікому непатрэбныя, кінутыя?
- Ці часта вы вінаваціце навакольных у сваіх няўдачах?
- У вас мала (або няма) сяброў?
- Вы пакутуеце ад страты апетыту?
- Ці згодныя вы, што, калі стрэс не «здымаць», гэта дрэнна закончыцца?
- Ці лічыце вы, што жыццё несправядлівае, асабліва да вас?
- Ці даводзяць вас да шаленства аднастайнасць, руціна ў жыцці, у працы?
- Ці раздражняюць вас тыя, хто вельмі шмат і гучна гаворыць?
- Ці раздражняе вас надта моцны пах парфумы?

ПАДЛІЧЫМ БАЛЫ

Калі вы адказалі «так» 5 і менш разоў, то вашай нервовай сістэме можна толькі пазайздросціць.

Адказаў «так» ад 6 да 10. Стрэс да вас ужо падбіраецца. Сцеражыцеся!

Адказаў «так» ад 11 да 15. Часам вам цяжка справіцца са складанай сітуацыяй. Даводзіцца мабілізаваць усе рэзервы. І чым больш ачкоў вы набралі, тым горш.

Калі адказаў «так» 16 і больш, то вашы нервы на мяжы. Вам тэрмінова неабходны адпачынак. Ідэальна: водпуск або хаця б поўны спакой на выхадныя. Паспрабуйце не ўсё прымаць усур'ёз, стаўцеся да жыцця па-філасофску.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

ДАРЭЧЫ

Спецыялісты нагадваюць: перш чым ужываць заспакаяльныя прэпараты і антыдэпрэсанты, трэба навучыцца адрозніваць хранічны стрэс ад дэпрэсіі, паколькі гэтыя станы патрабуюць лячэння зусім рознымі сродкамі.

Калі чалавек адчувае нервовасць, раздражненне і гатовы вось-вось сарвацца — значыць, ён блізкі да стрэсу. У гэтым выпадку могуць дапамагчы прэпараты, якія аказваюць мяккае седатыўнае дзеянне (напрыклад, экстракты мяты перцавай, мелісы ці валяр'яну).

Пры дэпрэсіі чалавек, наадварот, адчувае прыгнечанасць, хранічную стомленасць і эмацыйнае знясіленне. І яму неабходныя сродкі, здольныя палепшыць стан нервовай сістэмы. Сярод лекавых траў такой уласцівасцю вызначаецца святаяннік.

Як бачым, пры стрэсе чалавеку трэба супакоіцца, а пры дэпрэсіі, наадварот, узбадзёрыцца. Таму важна правільна ацаніць свой стан і выбраць адпаведнае лячэнне. І вядома ж, лепш гэта зрабіць з дапамогай урача.

Во даюць!

Доктара чую, а бормашыну — не...

Як паведамляе ВВС, у Вялікабрытаніі распрацаванае прылада, якая дапаможа пацыентам пераадолець страх перад візітам да стаматолага. Яно ўяўляе сабой спецыяльныя навушнікі, у якіх выкарыстоўваецца тэхналогія падаўлення шуму. Падчас візіту да стаматолага пацыент зможа падключыць гэтыя навушнікі да свайго плэера ці да мабільнага тэлефона і слухаць музыку. Замацаваныя ў стаматалагічным кабінеце мікрафоны ўлоўліваюць усе гукі, якія затым апрацоўваюцца лічбавым працэсарам. Працэсар адсякае шум бормашыны пэўнай частаты, і той не трапляе ў навушнікі. У той жа час пацыент можа чуць тое, што яму кажа ўрач.

Адзін са стваральнікаў цуда-навушнікаў Марк Этэртан адзначыў, што падчас маніпуляцый стаматолагу трэба падтрымліваць кантакт з пацыентамі, у сувязі з чым для абароны ад гука бормашыны нельга выкарыстоўваць звычайныя берушы. Зараз распрацоўшчыкі шукаюць спонсараў для камерцыйнага прасоўвання новай прылады.

Шакаладныя лекі

Брытанскія навукоўцы падышлі да завяршальнага этапу клінічнага тэсціравання новых лекаў, створаных на аснове рэчыва, што ўтрымліваецца ў какава-бабах. Навукоўцы кажуць, што ўжо праз два гады з дапамогай іх шакаладных лекаў людзі змогуць лячыцца ад кашлю.

Прыкладна сем з паловай мільёнаў брытанцаў церпяць ад пастаяннага кашлю. У аснове большасці сучасных сіропаў ад кашлю ляжыць кадэін, але такія сіропы не лечаць, а толькі часова ліквідуюць сімптомы. Да таго ж прэпараты, створаныя на аснове кадэіну, катэгарычна проціпаказаны дзецям да 18 гадоў.

Лонданскі Нацыянальны інстытут сэрца і лёгкіх правёў даследаванні, якія даказалі эфектыўнасць у лячэнні кашлю алкалоіду тэабраміну, які ўтрымліваецца ў складзе какава-бабоў. Паводле даследаванняў, тэабрамін змагаецца з кашлем на 33 працэнты больш эфектыўна, чым кадэін.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»

220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А
режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00,
тел.: 227 52 36, 226 03 01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2009 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36, д. 38.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 3 по генплану» в г. Минске.

Свидетельство (удостоверение) № 500/451-3910 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права собственности на него от 03 марта 2010 г.

Земельный участок площадью 0,2187 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома запроектировано из шести секций. Количество жилых помещений жилого дома – 214. Серия жилого дома – 3А-ОПБ.

Начало строительства – январь 2011 года.

Окончание строительства в соответствии с ПОС – июль 2011 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 30.07.2010 № 687-60/10.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться как с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по направлениям администраций районов г. Минска на строительство квартир с № 37 по № 140, так и с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на строительство квартир с № 1 по № 36 и с № 141 по № 214.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с учетом выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет – 2 675 560 руб. – для граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий; 3 056 180 руб. – для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 01.11.2010 № 31с-11-2010, генподрядчик – ОАО «МДК».

Информацию о строительстве жилого дома и объектах долевого строительства можно получить в каб. 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

Генеральный директор Е.И. Вовна

ЗАО «Белорусская сеть коммуникаций» (торговая марка life:))
ИНФОРМИРУЕТ
ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ УСЛОВИЙ ОБСЛУЖИВАНИЯ

При активации с 29.01.2011 стартовых пакетов «Бесконечный life:)» стоимостью 0 руб.:

- Плата за услугу «Бесконечное общение» составит 6 900 руб./месяц.
- Тариф на вызовы в сети других операторов Беларуси – 199 руб./мин.
- Вызовы тарифицируются по 30 секунд.
- При списании платы за услугу «Бесконечное общение» в течение месяца после активации стартового пакета, абоненту предоставляется 30 бесплатных минут вызовов в сети других операторов Беларуси на 30 дней с момента списания платы.

Для стартовых пакетов «Бесконечный life:)» стоимостью 7 500 рублей условия обслуживания остаются неизменными.

Информация доступна на сайте www.life.com.by и по телефонам:
+375 (17) 295 99 99 (круглосуточно);
909 — бесплатный короткий номер для абонентов life:)

ЗАО «Белорусская сеть коммуникаций» УНП 190579561,
Лицензия Министерства связи и информатизации РБ зарегистрирована в реестре за № 1315, выдана 23.11.2009 г., действительна до 28.08.2018 г.

Рыбацкі ветразь

Рыбак на вадасховішчы ў Раўбічах.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Імпрэза

Неабавязкова быць казачнай Папялушкай, каб паехаць на баль

НАПЯРЭДАДНІ СТАРОГА НОВАГА ГОДА НА БАЛЬ ЗАПРАШАЕ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БЕЛАРУСІ

Усё як мае быць: прыгожыя сукенкі пажаданыя, а казачную атмасферу створаць майстры. З дапамогай танцаў, музыкі, паэзіі, жартаў, інтрыг, якія заўсёды ўзнікаюць падчас маскараду. Аднак можна і не «маскіравацца» і быць самім сабой, жывымі эмоцыямі рэагаваць на тое, што адбываецца навокал...

А навокал прамільгнуць розныя эпохі — у тэатры ў гэты вечар можна будзе сустрэць вядомых гістарычных асоб. Шпацыруючы па прыступках і фае, можна перасоўвацца па розных краінах — калі яшчэ спраўдзіць гэтую мару, калі не ў той вечар, які поўны чараўніцтва. Вечар 13 студзеня, напярэдадні старога Новага года, які ў памяці народа застаецца як Шчадрэц. А гэта значыць, што можна сябе не абмяжоўваць у жаданнях і марах, прынамсі культурніцкіх. І як след падрыхтаваць сябе да сустрэч, пра якія можна здагадвацца. Таму што святочны баль пачнецца а палове на дзясятую гадзіну вечара і пэўна ж перасягне апоўнач. А там — закруціць казачны Венскі баль...

Гэта не страшна, запэўніваюць арганізатары, ніякай варажбы, а чараўніцтва будзе хіба што мастацкае — ад музыкантаў, спевакоў і артыстаў балета, якія працуюць у тэатры. І нават запрошаныя з іншых краін, якія адмыслова ехалі, каб павіншаваць беларускіх аматараў баляў з Новым годам. Праграму стараюцца пабудаваць так, каб госці аказаліся не толькі гледачамі, але і непасрэднымі ўдзельнікамі балю. А які баль без танцаў? Сёлета арганізатары спецыяльна пашырылі танцавальную праграму, у адрозненне ад мінулага года, калі баль у Нацыянальным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі прайшоў упершыню. Цяпер у тэатры працуе школа бальных танцаў, і кожны чалавек, які набывае білет на баль, будзе мець магчымасць навучыцца танцаваць вальс, польку ці паланэз. Вось і сюрпрыз, аднак!..

Ларыса ЦІМОШЫК.

ПАСЛУГІ Ў ПАКЕЦЕ: ВЫГАДНА ЎСІМ!

З 10 студзеня «Белтэлекам» прапануе сваім кліентам новы выгадны пакет паслуг «Оптымум», які ўключае ў сабе высакахуткасны доступ у інтэрнэт by fly і інтэрактыўнае тэлебачанне ZALA. Пакетная прапанова дае абанентам магчымасць карыстацца безлімітным доступам у інтэрнэт на хуткасці 1 Мбіт/с і інтэрактыўнымі функцыямі пастаноўкі тэлебачання ў паўзу, перамотцы эфіру, запісу тэлепередач, а таксама іншымі магчымасцямі інтэрактыўнага тэлебачання ZALA.

Кошт пакета паслуг «Оптымум» складае 68 тысяч рублёў у месяц (гэта намнога танней, чым падключэнне кожнай з паслуг паасобку). За падключэнне плата не спаганяецца, а абсталяванне (ADSL-мадэм для інтэрнэт-спалучэння і прыстаўка для інтэрактыўнага тэлебачання) прадастаўляюцца абанентам у карыстанне на ўвесь перыяд дзеяння дагавора.

«Оптымум» — ужо другая пакетная прапанова ад «Белтэлекама». Упершыню комплексна паслугі кампаніі былі прадстаўлены ў пакеце «Эканом», у які ўключаны доступ у інтэрнэт на хуткасці 1 Мбіт/с і 1000 хвілін мясцовых тэлефонных перамоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

З НАЖОМ — НА ДЗІКА

У паляўнічых угоддзях Лідскага лясгаса работнікі Лідскай міжрайінспекцыі затрымалі пенсіянера. Высветлілася, што пры паляванні на пушныя віды жывёлы той здабыў дзіка-сяголетка. Як? З дапамогай паляўнічага нажа і з выкарыстаннем паляўнічага сабакі. Шкода ацэнена ў 2,1 мільёна рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Стандарты

ДЗІЦЯЧАЕ «ХАЧУ ЎСЁ ВЕДАЦЬ» — ДЛЯ БАЦЬКОЎ

З 1 студзеня ў краіне ўведзены ў дзеянне новыя дзяржаўныя стандарты на плодаагароднінную прадукцыю для харчавання дзяцей ранняга ўзросту (да трох гадоў). Яны распрацаваныя РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні» на сокі, нектары, напоі, якія змяшчаюць сок, і морсы, паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Дзяржстандарта, — з мэтай гарманізацыі ўнутранай тэрміналогіі з міжнароднай.

Так, з увядзеннем аднаго са стандартаў сокавая прадукцыя будзе вырабляцца наступных відаў: сок прамога адціскання, адноўлены сок, нектар, напой, які змяшчае сок, і морс. Сок прамога адціскання для дзіцячага харчавання атрымліваюць непасрэдна з садавіны і гародніны. Адноўлены сок — шляхам аднаўлення канцэнтраванага соку падрыхтаванай пітной вадой у суадносінах, што забяспечваюць захаванне арганалептычных, фізіка-хімічных уласцівасцяў і харчовай каштоўнасці сокаў з аналагічнай садавіны ці гародніны, з дабаўленнем або без дабаўлення сокаў прамога адціскання, пюрэ.

Нектар для дзіцячага харчавання вырабляюць з соку і (ці) пюрэ аднаго або некалькіх найменняў садавіны (гародніны) з дабаўленнем цукру і падрыхтаванай пітной вады, у якім масавая доля соку і (ці) пюрэ павінна быць не ніжэй за вызначаны ў стандарце ўзровень. Напрыклад, для яблычнага нектару мінімальная масавая доля садавінай часткі складае 50 працэнтаў, чарнічнага нектару — 40 працэнтаў, слівавага — 30 працэнтаў, маркоўнага нектару — 50 працэнтаў і г.д.

Напой, які змяшчае сок, для дзіцячага харчавання атрымліваюць шляхам змешвання соку і (ці) пюрэ з падрыхтаванай пітной вадой, цукрам, з масавай доляй соку і (ці) пюрэ не менш за 10 працэнтаў. Морс атрымліваюць з ягад шляхам здабывання з іх соку ці пюрэ з дабаўленнем падрыхтаванай пітной вады, цукру, з масавай доляй ягаднага пюрэ і (ці) пюрэ не менш за 15 працэнтаў.

У адпаведнасці з новым стандартам, кансервы для дзіцячага харчавання на агароднінай аснове ў залежнасці ад ступені здрабнення і выкарыстанай сыравіны будуць вырабляцца пюрэпадобнымі, буйназдробненымі ці нарэзанымі кавалачкамі. Стандартам прадугледжана таксама магчымасць вырабу першых і другіх страў для дзіцячага харчавання, у тым ліку з дабаўленнем мяса (мясных субпрадуктаў). Класіфікацыя кансерваў для дзіцячага харчавання на аснове садавіны, згодна з новым стандартам, залежыць ад выкарыстанай сыравіны (пюрэ пладовае, пладова-агароднінае, пладовае ці пладова-агароднінае з дабаўленнем крупаў, мукі, малочных прадуктаў), ступені здробненасці (працёртае, гамагенізаванае), спосабу кансервавання (пастэрызаванае, стэрылізаванае).

Варта дадаць, што ў названых стандартах вызначаны новыя патрабаванні да паказчыкаў бяспекі, якасці і харчовай каштоўнасці кансерваванага дзіцячага харчавання, што адпавядаюць міжнародным нормам і скіраваныя на ўмацаванне здароўя дзяцей. Напрыклад, для кансерваў колькасць цукру, што дабаўляецца, не павінна перавышаць 10 працэнтаў, павараннай солі — 0,4 працэнта. У кансервах з дабаўленнем тлустых малочных прадуктаў і алею масавая доля тлушчу не павінна перавышаць 4,5 працэнта.

Сокі прамога адціскання для дзіцячага харчавання вырабляюцца без дабаўлення цукру. Для карэкціроўкі смаку ў адноўленыя сокі дапускаецца дабаўленне цукру ў колькасці не больш за 1,5 працэнта, у нектары і сокаўтрымліваючыя напоі — не больш за 10 працэнтаў, у морсы — не больш за 12 працэнтаў.

Уся сокавая прадукцыя можа быць дадаткова ўзбагачаная вітамінам С. Узбагачаць бэта-каратынам дапускаецца толькі агароднінныя сокі, нектары і напоі, якія змяшчаюць сок. Трэба падкрэсліць, што абавязковай умовай для вырабу прадукцыі дзіцячага харчавання з'яўляецца выкарыстанне толькі натуральнай сыравіны, адсутнасць фарбавальнікаў, араматызатараў, кансервантаў і іншых рэчываў. Адначасова пашыраныя патрабаванні па маркіроўцы кансерваў: разам з указаннем асноўных харчовых рэчываў (вугляводаў, бялкоў, тлушчаў) дадаткова прадугледжана інфармаванне аб утрыманні клятчаткі, насычаных тлустых кіслот (у сокавай прадукцыі), прыродных вітамінаў і мінеральных рэчываў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЯК СНЕГ НА ГАЛАВУ

Дах жылога дома, што ў вёсцы Варняны Астравецкага раёна не вытрымаў грузу снегу, які ляжаў на ім, і... праваліўся.

Інцыдэнт адбыўся на вуліцы Цвяточнай, 4 у панядзелак, прыкладна а палове дзявятай на раніцу. Вось што расказаў сын гаспадароў — Дзмітрый:

— Дома быў толькі я адзін, займаўся хатнімі справамі. Неўзабаве пачуў, што трашчыць сталяванне. Выбег на вуліцу. Калі ўсё скончылася, патэлефанаў страхаўшчыкам. У выніку здарэння пашкоджаны дах, перакрыцце і сцены дома.

Пацярпелыя, па ўсёй верагоднасці, атрымаюць кампенсацыю — іх жыллё было застрахаваным.

Аляксандр СЯНЮЦЬ.

Уладзімір ШОСТАК:

«АД НАС, КАМУНАЛЬНІКАЎ, ЗАЛЕЖЫЦЬ НАСТРОЙ ЛЮДЗЕЙ»

Так, работа камунальных службаў на слыху і ў полі зроку кожнага з нас невыпадкова. Бо ад яе сапраўды залежыць многае. І калі што не так, мы гатовы крытыкаваць камунальнікаў, указваць на розныя недахопы, скардзіцца. Што ж, бывае такое. Праўда, людзі не заўсёды хочуць разумець, чаму ў тых службаў здараюцца збоі, якія праблемы іх турбуюць, якая дапамога ім патрэбна. Нам, карыстальнікам камунальна-жыллёва-бытавых паслуг (і ў гэтым няма ніякіх папрокаў) адно на мэце: каб у жыцці было як мага меней нязручнасцяў. А калі дакладней, дык каб іх наогул не было. Так што, напярэдадні камунальнікі!

Такія вось думкі агортвалі нас, калі мы перад самым Новым годам дабіраліся да невялікага, прыгожага і ўтульнага палескага гарадка Петрыкава, наваколлі якога былі засыпаны таўшчэзным снежным покрывам...

А снег усё падаў і падаў...

З дырэктарам камунальнага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Петрыкаўскі райжылкамгас» Уладзімірам Шостакам мы сустракаліся раней ужо неаднойчы і таму бадай што з першых хвілін размовы падкінулі яму такую «штучку»:

— Уладзімір Мікалаевіч, пакуль ішлі да вас у кабінет, ажно тры скаргі атрымалі ад жыхароў райцэнтра на тое, што па вуліцах ні прайсці ні праехаць з-за снегу.

Тон у нас быў даволі сур'ёзны, толькі дырэктар адразу ж раскусіў гэты жарт, сказаўшы:

— Нябесная канцылярыя клопатаў сапраўды нам дае сваімі зімовымі атакамі. Ды для ўсіх гэта радасць: больш снегу — больш надзей на добры ўраджай. У 2009 годзе, памятаю, сумёты былі такія, што даводзілася нам, кажучы па-народнаму, выяваць з імі, закасаўшы рукавы. Ды нічога, справіліся. Не пасуем перад снегам і пасаваць не будзем і сёлетняй зімой.

Што гэта так, мы бачылі на свае вочы і тады, калі ехалі з чыгуначнай станцыі Муляраўка да Петрыкава, і калі пазней у суправаджэнні начальніка вытворчасці па цеплавой энергіі райжылкамгаса Мікалая Арцемянюка наведвалі некаторыя аб'екты прадпрыемства. Вуліцы былі або ўжо расчышчаны, або расчышчаліся з дапамогай адпаведнай тэхнікі, а тратуары нават падмецены.

— Ведаеце, — працягваў свой расказ Уладзімір Мікалаевіч, — снегапады нас знянацку застаць не могуць. Бо не дапускаем мы гэтага. Прыбіраем снег рэгулярна, іншым разам тэхніка працуе суткамі, і даводзіцца на трактар садзіцца яшчэ аднаму трактарысту. На замену. Каб не перашкаджаць нікому ўдзень з прыборкай снегу, выкарыстоўваем начны час — з 20 да 8 гадзін. А ў светлы час сутак працуем на другарадных вуліцах райцэнтра і ў прыватным сектары.

Надзея — на саміх сябе

— Прыбіранне снегу — гэта толькі адзін з элементаў дзейнасці вашага калектыву зімой, якую нездарма называюць строгім экзаменатарам. А як з іншымі напрамкамі работы, як ішла падрыхтоўка да яе і чым яшчэ заняты зараз вашы людзі?

— Наша праца па сваёй сутнасці — гэта сапраўдны комплекс самых руцінных, але вельмі неабходных работ. Іх цяжка нават пералічыць, і яны вядомыя ўсім. А падрыхтоўка да зімова-ацяпляльнага сезона (такая ў нас ужо традыцыя) не перапыняецца ніколі пасля папярэдняга такога сезона, калі мы стараемся ўсе нюансы яго ўлічыць. Трэба і дровы, і пячны мазут нарыхтоўваць, і рэвізію абсталявання рабіць, і прафілактычным і капітальным рамонтам займацца, і шмат яшчэ чым іншым. Адкладваць усё на апошні месяц — не ў нашых правілах. Не буду прыводзіць тут нейкія даволі значныя лічбы, назаву толькі адну. Мы замянялі каля 80 працэнтаў цеплавых сетак на перадызаляваныя трубы як найбольш эфектыўныя і надзейныя ў эксплуатацыі.

— Ведаем, што названыя работы даволі адказныя і складаныя. І ў вас ёсць ліцэнзія на іх?

— Ёсць. І не толькі на іх, але і на іншыя: капітальны рамонт жылля, напрыклад, рэканструкцыю кацельняў і г. д.

— Здаецца гэта называецца так: работы выконвае прадпрыемства гаспадарчым спосабам...

— Абсалютна правільна. Ён нам вельмі дапамагае і добры ўжо тым, што дазваляе зарабляць грошы ў саміх сябе. Патлумачу, што да чаго. На ўказаныя і іншыя работы, калі б мы не маглі справіцца з імі самі, нам давялося б заключаць дамовы з нейкімі пабочнымі арганізацыямі — генпадраднымі і субпадраднымі — і плаціць ім адпаведна. Па-другое, гэта — не нашы структурныя падраздзяленні, якія, скажам, адпрацавалі тыя восем гадзін — і ўсё, на адпачынак. А мы, калі патрабуюць абставіны, і дванаццаць гадзін працаваць можам, і больш, і выхадныя прыхопліваць.

За чыстую ваду

— Уладзімір Мікалаевіч, 2010 год завяршыў пяцігодку. Чым вызначыўся ён для вашага калектыву?

— Шмат намаганняў было прыкладзена для таго, каб у Петрыкаве з'явіліся новыя гарадскія ачышчальныя збудаванні, дзе работы вяліся на працягу некалькіх гадоў па дзяржаўнай праграме «Чыстая вада». Трэба адзначыць, што генеральным праекціроўшчыкам аб'екта выступілі «Мінксельбудпраект», а генпадрадчыкам — адкрытае акцыянернае таварыства «Спецмантажбуд № 177» з Гомеля. Кошт гэтага праекта ў сённяшніх цэнах — 12873,6 мільёна рублёў, доля фінансавання якога з фонду аховы прыроды складае 40 працэнтаў.

— Што сабой уяўляе гэты аб'ект?

— Станцыю поўнай біялагічнай глыбокай ачысткі гарадскіх сцёкаў прадукцыйнасцю 2,2 тысячы кубічных метраў у суткі з выпускам іх (ужо ачышчаных) у раку Прыпяць. Тут жа дзейнічае пяць блочных каналізацыйна-помпавых станцый, пабудавана 15 кіламетраў (у дзве ніткі) каналізацыйных сетак напорнага і зліўнога калектараў, інжынерных сетак жыццязабеспячэння работы ачышчальных збудаванняў, выканана добраўпарадкаванне і азеляненне тэрыторыі.

У адпаведнасці з Указам кіраўніка краіны ад 17 снежня 2009 года ўвод аб'екта ў эксплуатацыю планаваўся ў 2011 годзе. Але, улічваючы рэальны ход будаўніцтва і дастатковы аб'ём выдаткаваных летась фінансавых сродкаў, ён уступіў у строй у снежні 2010 года.

— Здаецца, падобнага аб'екта ў нашай краіне няма?

— Так. Ачыстка гарадскіх сцёкаў праводзіцца па тэхналогіі, распрацаванай чэшскімі спецыялістамі такім чынам, што ачышчаная вада праз трубы скідваецца ў Прыпяць, што працякае ў чатырох кіламетрах ад гэтых, можна сказаць, унікальных для Беларусі збудаванняў.

— Дык яны ўжо дзейнічаюць?

— Дзейнічаюць. З мая месяца, калі была адладжана ўся тэхналогія. Застаецца толькі ліквадаваць дробныя недаробкі па адміністрацыйным корпусе.

ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ, ЗЕМЛЯКІ!

Ад усёй душы віншую вас і нашых дзелавых партнёраў з навагоднімі святамі і Нараджэннем Хрыстовым! Жадаю вам моцнага здароўя на доўгія гады, добрага настрою, поспехаў ва ўсіх справах, фінансавага дабрабыту, творчага натхнення, шчасця.

Дырэктар КВУП «Петрыкаўскі райжылкамгас» Уладзімір ШОСТАК.

Адступленне

З работай ачышчальных збудаванняў нас пазнаёміў майстар вадаправоднага ўчастка прадпрыемства Сяргей Рог.

Тут прадугледжаны два біялагічныя рэактары, кожны з якіх раздзелены на тры зоны: дэмітрыфікацыі, актывацыі і сепарацыі. У іх сцёкавая вада ачышчаецца ў зададзенай ступені ад розных арганічных рэчываў. Назіралі мы і за работай абсталявання, дакладнай працай аператараў. У зменне было пяць чалавек. А неўзабаве будзе прыняты яшчэ і лабарант, у абавязкі якога ўвойдуць даследаванні ачышчанай вады. Як было сказана вышэй, праектная прадукцыйнасць новабудоўлі 2200 кубаметраў вады ў суткі, на сённяшні дзень яна складае 1300-1400 кубаметраў. І яшчэ Сяргей Іванавіч падкрэсліў наступнае: адпрацаваная чыстая вада аднаўляе ўсім устаноўленым экалагічным патрабаванням.

Дарэчы, калі ўжо зайшла размова аб вадзе, дык мы пацікавіліся і тым, а якую ж ваду спажываюць жыхары райцэнтра. З гэтай мэтай пабывалі на водазаборы «Беланавічы», што недалёка ад ачышчальных збудаванняў, і вось пра што даведаліся.

Станцыя гэта ўзводзілася ажно чатырнаццаць гадоў, бо не хапала фінансавых сродкаў: яны то адкрываліся, то перапыняліся. А між тым мясцовая вада ўтрымлівала вялікую колькасць жалеза — тры міліграмы на кубічны дэцыметр вады пры норме 0,3 міліграма. Так было раней: у дзесяць разоў перавышэнне! І вось у снежні 2004 года нарэшце з'явіўся той водазабор, які складаецца са станцый другога пад'ёма вады і абязжалезвання, дзе і адбываецца ачышчэнне яе ад жалеза (ад 0,21 міліграма і не больш як да 0,3 міліграма).

Вада паступае з чатырох артэзіянскіх свідравін, якія знаходзяцца на поўнай адлегласці адна ад адной і маюць праектную магутнасць 4650 кубаметраў у суткі. Глыбіня іх 90 метраў, а сам забор вады ідзе з 60-метровай глыбіні. Першая аэрацыя яе праходзіць у прыёмнай камеры станцыі, дзе жалеза ападае ў выглядзе мяккіх камякоў, пасля чаго вада размяркоўваецца па фільтрах.

Не будзем расказваць аб далейшай тэхналогіі, толькі засяродзім увагу на наступным. Якасць вады правяраецца па 15 паказчыках у акрэдытаванай ведамаснай лабараторыі, а таксама спецыялістамі раённага і Мазырскага занальных цэнтраў гігіены і эпідэміялогіі, Калінкавіцкага міжрайцэнтра стандартызацыі і метралогіі. Нараканняў на якасць вады няма.

Добры дзень, міні-ЦЭЦ!

— Уладзімір Мікалаевіч, у горадзе ў 2010 годзе з'явілася яшчэ новабудоўля, важнасць якой цяжка пераацаніць — міні-цеплаэлектрацэнтраль. Калі ласка, падрабязней пра яе.

— Асноўным распрацоўшчыкам праекта з'яўляецца ўнітарнае прадпрыемства «Белпрампраект», а генпадрадчыкам па будаўніцтве — унітарнае прадпрыемства «Палессебуд» (Мазыр). Нарматыўны тэрмін узвядзення — 16 месяцаў, кошт будаўніцтва аб'екта ў бягучых цэнах — 42 мільярды рублёў. Увод яго з выхадам на праектную магутнасць быў запланаваны на лістапад 2010 года.

— Наколькі нам вядома, будаўніцтва працягвалася куды больш намечаных тэрмінаў, і ўвод яго ў строй пераносіўся.

— Гэта сапраўды так. Будаўніцтва вялося ў залежнасці ад фінансавання. Асаблівых праблем з пастаўкай абсталявання не было, у адрозненне ад тэмпаў будаўніча-мантажных работ. На праектную магутнасць міні-ЦЭЦ не выйшла па сённяшні дзень, і таму мы нясём страты. Нягледзячы на тое, што яна цалкам забяспечвае горад гарачай водой і ацяпляе два жылыя мікрараёны.

— А што з выпрацоўкай электраэнергіі?

— Пачалі яе падаваць у электрасеткі. Нагадаю: згодна з праектам гадзінная выпрацоўка электраэнергіі — 1,2 мегавата і 5,5 гігакалорый цяпла.

Адступленне

Будоўля была эксперыментальнай, і падобнай да яе на тэрыторыі беларускага Палесся няма. Як паведаміў нам старшы майстар міні-ЦЭЦ Яўген Чабатароў, магутны кацёл набыты ў аўстрыйскай фірмы «Палітэхнік», а парагенератар паставіў Пралетарскі завод Санкт-Пецярбурга, з прыкамандзіраваным прадстаўніком якога сюды Уладзімірам Андрэевым мы і пазнаёміліся.

Начальнік вытворчасці па цеплавой энергіі Мікалай АРЦЕМЯНЮК і старшы майстар міні-ЦЭЦ Яўген ЧАБАТАРОЎ абмяркоўваюць рабочыя моманты.

Установка электрафільтра на 99,9 % забяспечвае ачыстку дымавых газаў ад міні-ЦЭЦ.

Дзяжурная змена пад кіраўніцтвам Аляксандра КРЫВІНА.

Дык вось, на аб'екце ў той дзень, калі мы наведалі яго, ішлі пусканаладачныя работы, а за тэхналагічным працэсам, які праходзіў у аўтаматычным рэжыме, сачыла змена Аляксандра Крывіна. Уся інфармацыя аб ім паступала ў аператарную, дзе мы заспелі электраманцёраў Васіля Гарошку і Аляксандра Яворскага, электроніка Яўгена Скакоўскага, машыніста катла Аляксея Добаша і названага вышэй Уладзіміра Андрэева.

Апошні, напрыклад, сказаў нам, што міні-ЦЭЦ паказвае высокую прадукцыйнасць, але яшчэ трэба папрацаваць, каб яна выйшла на праектную магутнасць. А Яўген Чабатароў падкрэсліў: цеплаэлектрацэнтраль за суткі «з'ядае» 70 кубаметраў шчэпак (пры поўнай яе загрузцы). Гэтае паліва вырабляе лясгас на закупленай шчэпказдрабляльнай машыне. Райжылкамгас запланаваў набыць такую ж для сябе, каб знізіць выдаткі. «Ежай» для міні-ЦЭЦ з'яўляецца таксама пілавінне. Запасы гэтых мясцовых відаў паліва робяцца на сем дзён, і доля спажывання іх з выхадам аб'екта на поўную праектную магутнасць у паліўным балансе раёна складзе 90 працэнтаў.

ў рэспубліцы па добраўпарадкаванні. А як вы ацэньваеце вынікі работы прадпрыемства ў 2010 годзе?

— Не маю намеру хваліцца, але лічу, што свае абавязацельствы перад дзяржавай і насельніцтвам калектыў выконвае як мае быць. Працавалі мы напружана і дасягнулі вызначанага рубяжа па павышэнні зарплаты *(цяжка ўздыхае)*. Але тут вось што атрымліваецца. Мы аказваем паслугі насельніцтву ў межах зацверджаных нарматываў і стандартаў. Вядома, вярнуць нам затраты на іх у памеры 23 працэнтаў, а бюджэту запланавана было на 2010 год выдзеліць нам датацыі на жыллёва-камунальныя паслугі ў памеры 59,6 працэнта. Гэта, на жаль, не было зроблена, і недафінансаванне склала 1 700 мільёнаў рублёў (датацыя склала толькі 56 працэнтаў ад запланаванага). Усё гэта лягло на нашы плечы цяжкім грузам. Прадпрыемства раней было прыбытковым, а па выніках работы за 11 месяцаў мы панеслі 270 мільёнаў рублёў страт. Калі нічога не зменіцца, сітуацыя яшчэ больш абвострыцца. Упершыню за шэсць гадоў майго дырэктарства мы вымушаны былі ўзяць крэдыт на зарплату. Не ўяўляю, у якую бездань мы маглі б трапіць, калі б асноўныя работы не выконвалі гаспадарчым спосабам і не зараблялі б дадатковыя грошы.

Між тым, зазначу, што па выніках работы і за 2009 год бюджэт не дадаў нам 814,3 мільёна рублёў. Сітуацыя, як бачна, паўтарылася. Крыўдна ўсё гэта для калектыву, які ўмее добра працаваць. Тым больш што гэта намі зароблены грошы, нам яны вельмі патрэбны як абаротныя сродкі, для паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы і г. д.

— І якая на ўсё гэта, Уладзімір Мікалаевіч, рэакцыя фінансавага ўпраўлення аблвыканкама?

— Адказ там адзін: укладвайцеся ў свае затраты, зніжайце іх. А як гэта зрабіць, калі газ у 2010 годзе тры разы даражэў, а электраэнергія — двойчы, а ўдзельная вага іх у сабекошце паслуг складае 50 працэнтаў? Вось і круціся, як хочаш. Мы ўсё ж спадзяёмся, што вышэйшыя арганізацыі зразумеюць гэтую нашу вялікую праблему.

* * *

...А снег у той дзень усё падаў і падаў, і ўначы таксама. Калі б прыборка яго была толькі адзіным клопатам райжылкамгаса! Перад яго ж калектывам многа задач на сёлетні год стаіць, і ён ужо ўзяўся за іх выкананне. З уласцівым яму стараннем і настойлівасцю.

Матэрыялы падрыхтавалі Алена ДАЎЖАНОК, В. БОЙКА, Іна ЛІШЫК (фота).

УНН 490318904.

На галоўнай плошчы Петрыкава.

Крыўда

— Уладзімір Мікалаевіч, па выніках работы за 2009 год ваш калектыў выйшаў пераможцам у сваёй групе прадпрыемстваў абласнога ўпраўлення ЖКГ. Асабіста вы атрымалі тады падзяку ад старшыні Гомельскага аблвыканкама. Ёсць вялікая заслуга вашага калектыву і ў тым, што Петрыкаў заняў першае месца



Галоўны бухгалтар Людміла ПАРАЖЫНСКАЯ.

Самае лепшае абсталяванне па ачыстцы вады знаходзіцца менавіта ў Петрыкаве. На здымку: майстар водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі Сяргей РОГ: «Праграма «Чыстая вада» — наш гонар».

Бягоніі і пеларгоніі вырошчваюцца ў цяпліцах для ўпрыгожвання горада.

Галоўны эканаміст Валянціна ДАШКЕВІЧ.

Людміла ПРАКОФ'ЕВА:

«ДОБРЫ МАРКЕТОЛАГ НА ВАГУ ЗОЛАТА»

«Віцебскі абласны цэнтр маркетынгу» — добра вядомае па-за межамі Віцебска прадпрыемства людзям нават вельмі далёкім ад таго самага для многіх таямнічага слова «маркетынг». Менавіта дружная каманда цэнтра ўжо не першы год паспяхова арганізуе шматлікія і разнастайныя выставы, кірмашы. Своеасаблівымі «брэндамі» сталі будаўнічая выстава «Сучасны дом», спецыялізаваныя выставы-кірмашы «Мой дом», «Дом і сад» і іншыя. Падчас міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар» традыцыйна праводзіцца выстава-кірмаш «Малы бізнэс у фестывальным Віцебску», якую наведваюць і дзе робяць пакупкі дзясяткі тысяч гараджан і гасцей фестывалю. Сярод натоўпу пакупнікоў іншы раз можна сустрэць і ўсім вядомых персон. І навагоднія кірмашы, і фестывалі па нетрадыцыйных метадах лячэння, як і бізнэс-форумы, міжнародныя эканамічныя форумы, — усё гэта прыдумалі і арганізавалі на самым высокім узроўні супрацоўнікі «Віцебскага абласнога цэнтра маркетынгу» .

Наш карэспандэнт пагутарыў з дырэктарам прадпрыемства Людмілай Леанідаўнай ПРАКОФ'ЕВАЙ. У яе тры вышэйшыя адукацыі. Апошняя па спецыяльнасці — менеджар знешніх эканамічных сувязяў.

Карэспандэнт «Звязды» шчыра паспрабаваў зразумець, што ж такое насамрэч сучасны маркетынг. І чаму некаторыя кіраўнікі і зараз думаюць, што мо і не трэба асабліва на яго траціцца? Маўляў, вырабілі якасную прадукцыю, купяць! Але ж рыначныя перамены заставяць па-іншаму працаваць. І, калі маркетынг на прадпрыемствах слабаваты, кіраўнікам наўрад ці можна спадзявацца на поспех ва ўмовах рыначнай эканомікі.

— Людміла Леанідаўна, калі ласка, давайце адразу дамовімся, што як мага даступна пастараемся раскрыць таямніцы маркетынгу, менеджменту. І хочацца, каб у рамках нашай размовы вы б нешта маглі параіць дырэктарам прадпрыемстваў, прадпрымальніцкіх структур: як працаваць так, каб твая прадукцыя, паслугі прыносілі добры прыбытак. З чаго вы распачналі свой бізнэс?

— Дамовіліся. Мы з калегамі ў цэнтры ніколі не стараемся хваліць сябе: маўляў, мы такія разумныя і хочам кагосьці вучыць. Самі прайшлі нялёгкі шлях станаўлення прадпрыемства. Літаральна з азоў больш за 13 гадоў таму пачалі адкрываць для сябе, як вы сказалі, таямніцы маркетынгу. Распачналі інтуітыўна. Пачалі са стварэння інфарматыўнай базы прадпрыемстваў, якія тады існавалі на тэрыторыі Віцебскай вобласці. Ці ёсць яшчэ нейкае прадпрыемства, ці ўжо закрылася, якія сферы дзейнасці, кантактныя звесткі? — гэта нас цікавіла. Мы не проста карпатліва сабіралі інфармацыю, але і выдалі наш першы зборнік — прадукт, за які атрымалі грошы. Да гэтага месяцы тры заробак не атрымлівалі, працавалі на голым энтузіязме.

Было гэта ў няпростым 1997 годзе. Амаль паўгоддзе працавалі над стварэннем зборніка. Паралельна збіралі рэкламу, каб выдаць зборнік. Атрымаўшы базу звестак, змаглі наладзіць супрацоўніцтва з прадпрыемствамі, фірмамі: прапаноўвалі ім распрацоўку бізнэс-планаў, рэкламныя паслугі. Потым абнаўлялі інфармацыю і зноў друкавалі зборнік праз два-тры гады. Тады ж мы першымі пачалі арганізоўваць выставы-кірмашы прамысловых тавараў нашых вытворцаў у Расіі, Латвіі... Вельмі цікава было тады за мяжой прадстаўляць прадукцыю нашых прадпрыемстваў, фірмаў.

Зараз займаемся ў ліку іншага і ацэнкай нерухомасці, праводзім аўкцыёны па продажы нерухомасці, займаемся выдавецкай дзейнасцю, распрацоўваем сайты, фірменныя стылі, брэнды... Заўсёды трымаем нос па ветры. Хочам распрацоўваць праграмы для ўнутраных патрэб прадпрыемстваў: па лагістыцы, бухгалтэрыі, для складскіх структур.

Мы — камерцыйная арганізацыя, якая прайшла дзве перарэгістрацыі. Раней падпарадкоўваліся Нацыянальнаму цэнтру маркетынгу, а ў 2007 годзе нашым заснавальнікам стаў Віцебскі аблвыканкам. Мы — камунальнае кансалтынгавае ўнітарнае прадпрыемства. Яшчэ з'яўляемся цэнтрам падтрымкі прадпрымальніцтва з базавым статусам: дапамагаем іншым цэнтрам падтрымкі ў плане перадачы вопыту, навучання, кансультавання. Робім таксама ўпор на сельскія раёны.

— Мне расказвалі, што вы цесна супрацоўнічаеце з мясцовымі ўладамі для станаўлення і развіцця бізнэсу ў правінцыі.

— Бясплатна ў раённых цэнтрах на нашых семінарах можна шмат карыснага пачуць ад вядучых спецыялістаў. Атрымаць вельмі добрыя веды па менеджменце, маркетынгу, інфармацыйных тэхналогіях, па таму, як пачаць бізнэс, наладзіць карысныя кантакты. На семінары разам з намі прыязджаюць прадстаўнікі банка, падатковай інспекцыі, цэнтра занятасці, Віцебскага абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці «Віцебскаблмаёмасць»... Яны адказваюць на пытанні, адразу кансультуюць тых, хто пачынае бізнэс. Такія семінары ідуць на карысць і адказным асобам у глыбінцы. Бо не ўсе, напрыклад, ведаюць, што пад стварэнне новых рабочых месцаў бясплатная арэнда прадугледжваецца згодна з адпаведнай пастановай. Мяняецца заканадаўства сёння вельмі хутка, становіцца больш дэмакратычным для ахвотных займацца бізнэсам.

У мінулым і бягучым гадах правялі маштабнае маркетынгавае даследаванне ва ўсіх сельскіх раёнах Віцебшчыны з мэтай даследавання незанятых рыначных ніш для развіцця прадпрымальніцтва ў гэтых раёнах. А іх усяго 21. Апытвалі насельніцтва, юрыдычных асоб. І зрабілі захады — у чым мае патрэбу кожны з вывучаных раёнаў. Больш за тое — прыкладныя бізнэс-планы распрацавалі. Напрыклад, як пачаць бізнэс па рамонце аўтатранспартных сродкаў, ці пякарню або цырульню адкрыць, і гэтак далей. Па выніках даследаванняў паспелі і семінары правесці ў Аршанскім, Дубровенскім, Шумілінскім, Гарадоцкім і Лепельскім раёнах. І расказалі, якія нішы там яшчэ не занятыя, які бізнэс можна распачаць.

Пры падтрымцы ўпраўлення прадпрымальніцтва Віцебскага аблвыканкама плануем аналагічныя семінары правесці і ў іншых раёнах. Прыемна, што аблвыканкам рэкамендуе выкарыстоўваць вынікі нашай работы пры распрацоўкі планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця раёнаў. Зацікавіліся нашым вопытам работы ў глыбінцы нават у Мінску.

— Колькі разоў, на жаль, прыходзілася на асабістым вопыце пераконвацца, што маркетынгавыя службы на многіх беларускіх прадпрыемствах, мякка кажучы, працуюць па прынцыпе аддзелаў збыту прадпрыемстваў савецкіх часоў.

— Згодна з вамі. Маркетынг вельмі важны і пры правільным падыходзе можа ў разы павялічыць збыт прадукцыі, аказанне паслуг. Так, на прадпрыемствах часта лічаць: «Самі з вусамі». Самі, маўляў, зробім бізнэс-план, маркетынгавую стратэгію распрацаваць. Могуць і самі. Але вынікі такой дзейнасці якія? Чамусьці не лічыцца, што маркетынг дастойны таго, каб на яго траціцца. Вось, для параўнання, купіць сыравіну, грошы ў банку атрымаць — важна, а маркетынг? План выконваем і добра. Навошта грошы траціць? А потым пытанні ўзнікаюць: чаму гэтая прадукцыя ў мяне на складах ляжыць, чаму прадукцыя расійскіх, напрыклад, канкурэнтаў больш запатрабавана ў крамах пакупнікамі?

Адказ часта бывае вельмі простым. У прыватнасці, памянялі б упакоўку, вучылі б у тых жа канкурэнтаў, хоць і ў якіх, дарэчы, бывае, цана на прадукцыю, аналагічную вашай, у два разы большая, але і збыт лепшы...

Трэба абавязкова мяняць мышленне кіраўнікоў — у тым ліку і пры дапамозе прэсы, тэлебачання. Расказваць аб паспяховых прадпрыемствах, дзе развітае граматнае кіраванне — менеджмент. А гэта і правільныя стасункі з кадрамі (іх навучанне), стымуляванне работы супрацоўнікаў. Карысныя сюжэты, артыкулы пра тыя ж вядомыя фірмы «Дарыда», абутковыя «Марка», «Белвест». Хоць яны ўжо і так даволі вядомыя брэнды. А цікава: як жа змаглі паспяхова наладзіць збыт сваёй прадукцыі? Вось па тэлебачанні нядаўна выступаў заснавальнік «Дарыды», які вельмі правільна і шчыра сказаў, што людзі купляюць не ваду, а брэнды. Калі якасць вады ў іншага вытворцы няхай і вышэйшая, але, калі яе не рэкламаваць, брэнда не раскручваць, будзе стаяць тая вада на складзе.

І пра маленькія фірмы трэба расказваць. У прыватнасці, ёсць у Віцебску «Спецсістэма», дзе робяць розныя лічыльнікі, прыборы. Гэта сямейны бізнэс. Могуць ужо навучыць і другіх таму, як правільна рэкламаваць сваю прадукцыю. І будзе здорава, калі СМІ раскажуць пра прадпрыемствы, якія, дзякуючы новым падыходам, «выкарабкаліся», пачалі працаваць упэўнена. У Віцебску ёсць мэблевая фабрыка «Зара», склады якой былі калісьці поўныя. А цяпер бачылі б вы іх мэблю для офіса і дома!

І не трэба шкадаваць грошы на рэкламу. Калі б нашы вытворцы, як на Захадзе, на рэкламу трацілі 20 працэнтаў з даходаў, гэта было б ідэальна. А ў нас бывае ўсяго 4 працэнты і таго менш... Трэба разумець, што твой пакупнік, а не проста рэкламаваць нешта па тэлебачанні. Тым больш што каштуе гэта шалёных грошай. А рабіць тую ж рэкламу па тэлебачанні разумна. Калі гэта граматны маркетолаг, то ён пільна і падрабязна абавязкова вывучыць нішу збыту, сегмент рынку. Дзеці? Рэкламуй прадукцыю ў дзіцячых перадачах, на дзіцячых акцыях, праз бацькоў. Калі выбіраеш, напрыклад, катлы, арганізуй прэзентацыі сярод прафесіяналаў, патэнцыйных заказчыкаў. Дай адрасную рэкламу...

І чаму няма білбордаў з брэндамі віцебскіх фірмаў на галоўнай трасе вобласці Мінск — Масква? Павінны быць абавязкова. Брэнд «Савушкін прадукт» ведаюць усюды, а вось аналагічная прадукцыі віцебскага вытворцы не так папулярна па той жа прычыне: брэнд яшчэ недастаткова раскручаны.

Трэба ведаць, колькі вырабіць прадукцыі, якой, каб была запатрабавана. Чаму ў прыватнікаў рэдка што ляжыць на складзе? Таму што яны зацікаўлены ўсё рэалізаваць. Дзяржаўным прадпрыемствам трэба аналагічна падыходзіць да збыту. І гэта зусім не значыць, што пры гэтым трэба змяншаць выраб пэўнай прадукцыі, а з тымі ж аб'ёмамі вырабляць розную прадукцыю для розных катэгорый пакупнікоў. Прыкінуць, што лепш прадаць у Беларусі, а што лепш пойдзе за мяжой.

— Я поўнасцю магу пагадзіцца з вамі, але калі кіраўнік, як кажуць, чалавек «таго часу» і не хоча мяняць свае погляды?

— А ў чым праблема? Мне, напрыклад, не соромна і зараз вучыцца. Сяджу на семінарах і слухаю з задавальненнем карыфеяў у нашай сферы.

У нашай газеце «Гасціны двор» друкуем артыкулы заснавальніка маскоўскай трэнінгавай кампаніі Вадзіма Мальчыкава — такія цікавыя ідэі падхопліваем!

Я сама вельмі шмат вучылася і ў Германіі, у Польшчы, ЗША і Чэхіі. Там маркетынгавы бізнэс лічыцца элітарным і добра аплачваемым. У той жа Германіі, дарэчы, бізнэс часцей за ўсё перадаецца ў спадчыну. І дзіця, як гавораць, з пялёнак вучыцца таму, як бацька вядзе бізнэс, як рэагаваць на змяненні рыначных умоў...

У Беларусі маркетолагі і кіраўнікі з рыначным падыходам толькі параўнальна нядаўна сталі запатрабаванымі. Мы правядзём шмат мерапрыемстваў, дзе можна многаму навучыцца як маркетолагам, так і кіраўнікам. Трэці год запар праводзім форум «Твой бізнэс», адзін са складнікаў якога — менавіта навучанне. На жаль, на семінарах ня шмат кіраўнікоў у сферы бізнэсу.

Каштоўныя парады можна і пры пакупцы атрымаць. Можа, будзеце смяяцца, але вось я купляю пасту «СПЛАТ» для чысткі зубоў вельмі якасную — маскоўскай фірмы, і толькі таму, што ў кожнай упакоўцы ёсць чарговы зварот кіраўніка гэтай расійскай кампаніі, якая яе вырабляе: аб адносінах да жыцця, эканамічных рэалій. Для самаадукацыі чытаю. Цікава, напрыклад, было прачытаць, як ён стымулюе дзейнасць сваіх супрацоўнікаў. І пагадзіцеся, добры маркетынгавы ход: паста для зубоў і парады таму, хто ёй карыстаецца!

Добрыя маркетолагі — гэта «фантаны» ідэй! Такіх трэба падбіраць. Класныя маркетолагі на вагу золата. Стары заклік «Кадры вырашаюць усё!» будзе актуальным заўсёды. І гэта не трэба забываць кіраўнікам.

— А як вам удалося падабраць кадры?

— У нас у штаце працуе больш за трыццаць чалавек. Усе яны прафесіяналы з вялікай літары, якія ўмеюць працаваць у камандзе. Мы падбіраем самыя лепшыя кадры. Які б ты ні быў разумны, але, калі ты «воўк» — адзіночка, надоўга такі чалавек у нас не затрымаецца. У цэнтры мы, як у сям'і: хоць кожны займаецца сваім накірункам, але ўсё роўна мы ўсе разам. І калі чалавек без ініцыятывы, без творчага мышлення, таксама ў нас доўга не затрымаецца. Кожны раз прыдумваем і арганізуем нейкія новыя акцыі: бізнэс-форумы, сустрэчы, ажыццяўляем новыя праекты... Трэба заўсёды нешта прыдумваць. Напрыклад, паспяхова глянцавыя спецыялізаваныя часопісы выдаём па ландшафтным дызайне, «напаўненні» для стварэння сучаснага і ўтульнага дома. А яшчэ каталог «Маладая сям'я», які раздаюць тым, хто прыходзіць у ЗАГС, каб напісаць заявы на рэгістрацыю шлюбу. У выданні ёсць рэклама фірмаў, якія аказваюць паслугі па пракаце вясельных строяў, арганізацыі вясельных лімузінаў і картэжаў і гэтак далей. Цікавая ідэя вырабу буклета добра сябе апраўдала.

— А як вам удаецца захаваць калектыў работнікаў, якіх, напэўна, перыядычна пераманьваюць у камерцыйныя і дзяржаўныя структуры?

— У нас вельмі цікавая сістэма стымулявання работнікаў. І мы яе не ўтойваем. Мы — камерцыйная арганізацыя на гаспадарчым разліку. Але ёсць у нас і ўнутраны гаспадарчы разлік. Усе нашы аддзелы атрымліваюць свой план. У аддзела па арганізацыі выстаў адна планка ў «здабычы» фінансаў, у інфармацыйнага — іншая. Тая ж газета вельмі стратная, хоць і карыстаецца нядрэннай папулярнасцю сярод прадстаўнікоў бізнэсу. Але і па рэкламе даводзім план...

Калі ты перавыканаў план на 10 працэнтаў — атрымліваеш 10 працэнтаў прэміі. Калі на 100 — атрымліваеш два аклады. Некаторыя спецыялісты ў нас атрымліваюць больш, чым дырэктар. І я рада гэтаму. Прыходзяць дамоў самыя актыўныя супрацоўнікі бліжэй да ночы, але ведаюць, што стараюцца нездарма. І мне прыходзіцца, бывае, працаваць па начах. Можа, яшчэ і таму, што, калі наша каманда бярэцца за нейкую справу, не можам зрабіць яе няякасна. І гэта не прыгожыя словы, а наш дэвіз. Думаю, таму і нашы партнёры не шукаюць больш даступныя і прывабныя варыянты, а наладжваюць менавіта з намі пастаянныя дзелавыя стасункі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Жанчына за рулём

Нумералогія і ваш аўтамабіль

Ніхто не можа дакладна сказаць, калі і дзе зарадзілася нумералогія — старажытная эзатэрычная навука аб ліках. Але вядома, што асноўныя прынцыпы цяперашняга варыянта заходняй нумералогіі былі распрацаваныя ў VI стагоддзі да н.э. старажытнагрэчаскім філосафам і матэматыкам Піфагорам, які аб'яднаў матэматычныя сістэмы арабаў, друідаў, фінікійцаў і егіпцян з навукамі аб прыродзе чалавека.

Нумералогію часта называюць магіяй лікаў. У ёй кожны адназначны

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі

Прыняты Палатай прадстаўнікоў *2 снежня 2010 года*
Ухвалены Саветам Рэспублікі *22 снежня 2010 года*

Артыкул 1. Унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі ад 23 ліпеня 2008 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 187, 2/1522; 2010 г., № 120, 2/1672) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. Абзац сёмы артыкула 24 дапоўніць словамі «, а таксама выпадкі, калі іншыя арганізацыі могуць быць залогатрымальнікамі зямельных участкаў, права арэнды зямельных участкаў».

2. У артыкуле 50:

частку першую дапоўніць словамі «, а ў выпадках, вызначаных заканадаўчымі актамі, выдадзенымі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, — па іншых дагаворах, якія заключаюцца з іншымі арганізацыямі»;

частку сёмую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Залогатрымальнікамі зямельных участкаў і права арэнды зямельных участкаў могуць быць банкі, якія адпавядаюць патрабаванням, вызначаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, а таксама іншыя арганізацыі ў выпадках, вызначаных заканадаўчымі актамі, выдадзенымі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.»;

у частцы дзявятай слова «банк-залогатрымальнік» замяніць словам «залогатрымальнік».

Артыкул 2. Гэты Закон уваходзіць у сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

7 студзеня 2011 года, г. Мінск.
№ 232—З

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб ратыфікацыі Пагаднення аб патрабаваннях да абмену інфармацыяй паміж мытнымі органамі і іншымі дзяржаўнымі органамі дзяржаў-членаў мытнага саюза

Прыняты Палатай прадстаўнікоў *21 снежня 2010 года*
Ухвалены Саветам Рэспублікі *22 снежня 2010 года*

Ратыфікаваць Пагадненне аб патрабаваннях да абмену інфармацыяй паміж мытнымі органамі і іншымі дзяржаўнымі органамі дзяржаў-членаў мытнага саюза, падпісанае ў г. Санкт-Пецярбургу 21 мая 2010 года.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

10 студзеня 2011 года, г. Мінск.
№ 233—З

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб ратыфікацыі Пагаднення аб свабодных складах і мытнай працэдуры свабоднага склада

Прыняты Палатай прадстаўнікоў *21 снежня 2010 года*
Ухвалены Саветам Рэспублікі *22 снежня 2010 года*

Ратыфікаваць Пагадненне аб свабодных складах і мытнай працэдуры свабоднага склада, падпісанае ў г. Санкт-Пецярбургу 18 чэрвеня 2010 года.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

10 студзеня 2011 года, г. Мінск.
№ 234—З

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб ратыфікацыі Пагаднення аб узаемнай адміністрацыйнай дапамозе мытных органаў дзяржаў-членаў мытнага саюза

Прыняты Палатай прадстаўнікоў *22 снежня 2010 года*
Ухвалены Саветам Рэспублікі *22 снежня 2010 года*

Ратыфікаваць Пагадненне аб узаемнай адміністрацыйнай дапамозе мытных органаў дзяржаў-членаў мытнага саюза, падпісанае ў г. Санкт-Пецярбургу 21 мая 2010 года.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

10 студзеня 2011 года, г. Мінск.
№ 235—З

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб ратыфікацыі Пагаднення аб прадстаўленні і аб абмене папярэдняй інфармацыяй пра тавары і транспартныя сродкі, якія перамяшчаюцца праз мытную мяжу мытнага саюза

Прыняты Палатай прадстаўнікоў *22 снежня 2010 года*
Ухвалены Саветам Рэспублікі *22 снежня 2010 года*

Ратыфікаваць Пагадненне аб прадстаўленні і аб абмене папярэдняй інфармацыяй пра тавары і транспартныя сродкі, якія перамяшчаюцца праз мытную мяжу мытнага саюза, падпісанае ў г. Санкт-Пецярбургу 21 мая 2010 года.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

10 студзеня 2011 года, г. Мінск.
№ 236—З

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб ратыфікацыі Пагаднення аб асаблівасцях мытнага транзіту тавараў, якія перамяшчаюцца чыгуначным транспартам па мытнай тэрыторыі мытнага саюза

Прыняты Палатай прадстаўнікоў *22 снежня 2010 года*
Ухвалены Саветам Рэспублікі *22 снежня 2010 года*

Ратыфікаваць Пагадненне аб асаблівасцях мытнага транзіту тавараў, якія перамяшчаюцца чыгуначным транспартам па мытнай тэрыторыі мытнага саюза, падпісанае ў г. Санкт-Пецярбургу 21 мая 2010 года.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

10 студзеня 2011 года, г. Мінск.
№ 237—З

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб ратыфікацыі Пагаднення аб падставах, умовах і парадку змянення тэрмінаў аплаты мытных пошлін

Прыняты Палатай прадстаўнікоў *22 снежня 2010 года*
Ухвалены Саветам Рэспублікі *22 снежня 2010 года*

Ратыфікаваць Пагадненне аб падставах, умовах і парадку змянення тэрмінаў аплаты мытных пошлін, падпісанае ў г. Санкт-Пецярбургу 21 мая 2010 года.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

10 студзеня 2011 года, г. Мінск.
№ 238—З

Тэкст з'яўляецца неафіцыйным перакладам Закона.

Афіцыйнае апублікаванне ажыццяўляецца ў афіцыйным перыядычным выданні «Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь».

«Хоўм Крэдыт Банк» пашырыў банкаўскую сетку

ААТ «Хоўм Крэдыт Банк» адкрыў у новым годзе два новыя цэнтры банкаўскіх паслуг — у Мінску па вуліцы Раманаўская Слабада, 13 і Барысаве па вуліцы Гагарына, 58б.

Сёння ў краіне дзейнічае пятнаццаць цэнтраў банкаўскіх паслуг «Хоўм Крэдыт Банка». Увесь пералік паслуг аказваюць тры цэнтры ў сталіцы, а таксама ва ўсіх абласных цэнтрах і буйных гарадах. Паводле слоў старшыні праўлення ААТ «ХКБанк» Альгердаса Табатадзэ, місія кампаніі — рабіць жыццё лепш: «Сёння ўсе цэняць час, якасць і камфорт. Таму пры стварэнні і адкрыцці нашых цэнтраў банкаўскіх паслуг мы кіраваліся менавіта гэтымі крытэрыямі. Спадзяюся, нашы кліенты ацэняць хуткасць і якасць абслугоўвання, высокі ўзровень аказання паслуг і прапанаваны камфорт».

Група «Хоўм Крэдыт» з'яўляецца адным з лідараў на рынках спажывецкага крэдытавання Чэшскай Рэспублікі, Славацкай Рэспублікі, Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Казахстан, Украіны і Беларусі. «Хоўм Крэдыт Банк» выйшаў таксама на рынкі Кітая і В'етнама.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Наспеў час уніфікацыі сістэм адукацыі Расіі і Беларусі

НАПРЫКАНЦЫ мінулага года відэамост Масква—Мінск стаў пляцоўкай для зацікаўленай размовы экспертаў па дзіцячай і моладзевай палітыцы на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Гутарка ішла аб выпрацоўцы адзінай стратэгічнай праграмы ў галіне забеспячэння правоў дзяцей, уніфікацыі сістэм адукацыі Расіі і Беларусі, распрацоўцы саюзных праграм для адораных дзяцей. Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Павел Барадзін назваў гэтую працу адной з галоўных задач для абедзвюх дзяржаў. З гэтай нагоды плануецца на сродкі Саюзнай дзяржавы пабудаваць, напрыклад, расійска-беларускі дзіцячы анкалагічны цэнтр, ажыццявіць новыя праграмы для моладзі.

У сваю чаргу член Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Уладзімір Здановіч прапанаваў правесці ўніфікацыю сістэм адукацыі Расіі і Беларусі. На яго погляд, менавіта сфера адукацыі ў найбольшай ступені цяпер аб'ядноўвае расіян і беларусаў. Але, як адзначыў дэпутат, нават такое простае пытанне як узаемнае паступленне ў ВНУ абедзвюх краін не сінхранізавана ў часе. У Беларусі ў чэрвені ўжо ідзе здача цэнтралізаваных тэстаў, а ў Расіі хлопцы і дзяўчаты толькі заканчваюць школу. Уладзімір Здановіч таксама выказаў надзею, што гэты працэс уніфікацыі не будзе зацягнуты. У прыватнасці, на яго думку, стварэнне адзінай эканамічнай прасторы і ўступленне Беларусі ў «балонскі працэс» будзе спрыяць збліжэнню адукацыйных сістэм, і хутка для моладзі будуць створаныя сапраўды роўныя ўмовы для атрымання адукацыі любога ўзроўню.

Павел Барадзін падтрымаў беларускага парламентарыя. Ён выказаўся за прынятыце канцэпцыі сацыяльнага развіцця на 2011-2015 гады, дзе будзе выразна прапісана, што неабходны дзяржаўны падыход і пэўныя дзеянні да рашэння праблем дзяцей і моладзі.

Леанід ТУГАРЫН.

БУДАЎНІКІ — НАЙБОЛЬШ ВЫСОКААПЛАТНЫЯ З ЛІКУ ЗАНЯТЫХ У МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ СТАЛІЦЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Учынулых студзені—лістападзе сярэднямесячныя налічаныя заробкі занятых у будаўнічай галіне Мінска склалі 2 млн 40 тыс. рублёў, у тым ліку за лістапад 2 млн 305 тыс. Гэта больш чым на чвэрць вышэй за сяредненгарадскі ўзровень аплаты працы.

Сярэднямесячныя заробкі транспартнікаў за студзень—лістапад 2010 года аказаліся на 28% ніжэйшыя, чым у будаўнікоў, яшчэ менш — на 32,5% — налічвалася работнікам прамысловасці. Зрэшты, і ў самой будаўнічай галіне ўзровень аплаты дыферэнцаваны, у тым ліку па формах уласнасці прадпрыемстваў. За 11 месяцаў мінулага года найбольш высокія заробкі склаліся ў арганізацыях замежнай формы ўласнасці — 2 млн 933 тыс. руб.

У дзяржаўных будаўнічых фірмах працаўнікам налічвалася ў сярэднім па 2 млн 191 тыс. руб., а ў прыватных — па 1 млн 990 тыс. руб.

Алег ПАХОЛКІН, *«Мінск—Навіны».*

ЛЯСАМ МІНШЧЫНЫ НЕ ПАГРАЖАЕ МАСАВАЕ ЎСЫХАННЕ ЕЛАК

Вучоныя інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі абнародавалі трывожны прагноз: у рэспубліцы, перш за ўсё ў паўднёвых раёнах, з-за зменаў клімату пачалося масавае ўсыханне ельнікаў. Ратуючыся ад спёкі, гэтыя дрэвы мігруюць на поўнач.

— Елкі вельмі адчувальныя да неспрыяльных умоў надвор'я, — паведаміў вядучы інжынер-лесапаталог Мінскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання Андрэй Будзько. — У іх тонкая кара і, у адрозненне ад соснаў, паверхневая каранёвая сістэма. У апошнія гады анамальна спякотнае лета, паніжэнне ўзроўню грунтовых вод, ветравалы і, як вынік, хваробы і шкоднікі сталі прычынай аслаблення і ўсыхання елачных насаджэнняў у Мінскай вобласці, але ў невялікіх аб'ёмах.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, *«Мінск—Навіны».*

ДЕПАРТАМЕНТ
ПО ЦЕННЫМ БУМАГАМ
Министерства финансов
Республики Беларусь
ЗАВЕРЕНО
«29» декабря 2010 г.
_____ Гальперин А.Л.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» для юридических лиц девяностого выпуска

1. Наименование эмитента:

открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк») (далее – Банк);

адкрытае акцыянернае таварыства «Белаграпрамбанк» (ААТ «Белаграпрамбанк»).

2. Место нахождения Банка, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)

Местонахождение Банка: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.
Телефон: (017) 229 63 26, факс (017) 229 64 43
Электронный адрес E-mail: info@belapb.by
УНП 100693551, ОКПО 00040577.

3. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерский баланс, отчет о прибыли и убытках, и сроки их публикации

Бухгалтерский баланс и отчет о прибыли и убытках Банка ежегодно будет публиковаться в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.

Бухгалтерский баланс на 1 января 2010 года и отчет о прибыли и убытках за 2009 год опубликованы Банком 30.03.2010 в газетах «Звязда» и «Рэспубліка».

4. Размер уставного фонда Банка

Уставный фонд Банка составляет 4 003 635 046 000 (Четыре триллиона три миллиарда шестьсот тридцать пять миллионов сорок шесть тысяч) белорусских рублей.

5. Депозитарием, обслуживающим Банк, является Депозитарий ценных бумаг Банка, расположенный по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, регистрационный номер 02200/0385618, срок действия лицензии до 18.07.2012.

6. Дата, номер государственной регистрации Банка и наименование органа, его зарегистрировавшего

Банк преобразован из Белорусского республиканского банка Агропромбанк СССР учредительной конференцией 11.02.1991 и зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 03.09.1991, регистрационный № 20. Устав Банка утвержден общим собранием акционеров 11.02.1991 (протокол № 1).

Банк в своей деятельности руководствуется законодательством Республики Беларусь, международными договорами Республики Беларусь, локальными нормативными правовыми актами Банка, а также Уставом Банка.

7. Сведения о проведении открытой продажи облигаций девяностого выпуска

7.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение

Решение о выпуске именных облигаций девяностого выпуска для юридических лиц в соответствии с Уставом Банка утверждено Наблюдательным советом Банка 10.12.2010, протокол № 35.

7.2. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество и вид облигаций

Форма выпуска облигаций – бездокументарные.

Объем эмиссии облигаций составляет 100 000 000 000 (Сто миллиардов) белорусских рублей.

К открытой продаже предлагаются 100 000 (Сто тысяч) штук процентных облигаций.

Серия ОБ90, номера 000001 – 100000.

Вид облигаций – процентные, именные, неконвертируемые.

7.3. Номинальная стоимость облигации

Номинальная стоимость облигации – 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей.

7.4. Цель выпуска облигаций

Выпуск облигаций осуществляется в целях привлечения денежных средств юридических лиц для финансирования реального сектора экономики.

7.5. Выпуск облигаций согласован Национальным банком Республики Беларусь (постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 27.12.2010 № 578)

7.6. Период проведения открытой продажи облигаций

Размещение облигаций осуществляется с 26.01.2011 по 25.08.2012 включительно, если больший срок не будет определен Правлением Банка. Срок открытой продажи может быть сокращен в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

7.7. Место и время проведения открытой продажи облигаций

Размещение (продажа) облигаций Банка производится после согласования Национальным банком Республики Беларусь выпуска облигаций, регистрации в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций, опубликования заверенной Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь краткой информации об открытой продаже облигаций девяностого выпуска.

Первичное размещение облигаций осуществляется на внебиржевом рынке путем открытой их продажи в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени до момента полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

Владельцами облигаций могут быть юридические лица. Юридические лица, изъявившие желание приобрести облигации, обязаны перечислить денежные средства в безналичном порядке с текущих (расчетных) счетов на счет Банка, указанный в договоре.

Продажа облигаций осуществляется по текущей стоимости на дату совершения операции и рассчитывается по формуле:

С = Н + Дн,

где:
С – текущая стоимость облигации;
Н – номинальная стоимость облигации;
Дн – накопленный процентный доход.

В день начала открытой продажи облигаций текущая стоимость облигации равна ее номинальной стоимости.

Начиная со второго дня открытой продажи, покупатель также уплачивает сумму накопленного процентного дохода, рассчитываемую по следующей формуле:

Дн = (Н*П1*Т1 + Н*П2*Т2 + …. + Н*Пп*Тп) / (365(366)*100),

где:
Дн – накопленный процентный доход;
Н – номинальная стоимость облигации;

П1, П2, Пп – ставка процентного дохода (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, уменьшенной на 0,5 (Ноль целых пять десятых) процентных пункта;

Т1, Т2, Тп – количество дней соответствующей части периода начисления процентного дохода, в пределах которой ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма Т1 + Т2 +…+ Тп должна быть равна количеству дней в соответствующем периоде начисления дохода.

Расчет осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году (365 или 366 в високосном году).

7.8. Срок и порядок обращения облигаций

Срок обращения облигаций – 1096 календарных дней с 26.01.2011 по 26.01.2014. День начала размещения облигаций и день начала погашения облигаций считаются одним днем.

Совершение сделок купли-продажи облигаций при их обращении осуществляется юридическими лицами на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и (или) биржевом рынке в соответствии с порядком, установленным ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа).

Сделки с облигациями на вторичном рынке прекращаются за два рабочих дня:

- до даты выплаты процентного дохода за каждый период начисления дохода в течение всего срока обращения облигаций;
- до даты погашения облигаций.

7.9. Дата начала погашения облигаций

Дата погашения облигаций – 26.01.2014.

7.10. Порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты

Выплата дохода по облигациям производится в виде процентного дохода 1 раз в 3 месяца за истекший период начисления дохода в соответствии с графиком выплаты дохода на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления в безналичном порядке суммы процентного дохода на счет владельцев облигаций в белорусских рублях. Реестр владельцев облигаций составляется на дату, предшествующую двум рабочим дням дате выплаты процентного дохода за соответствующий период начисления дохода.

График выплаты процентного дохода по облигациям

Порядковый номер периода начисления дохода	Начало периода	Конец периода, дата выплаты дохода	Продолжительность периода (дней)
1	2	3	4
1	26.01.2011	26.04.2011	90
2	27.04.2011	26.07.2011	91
3	27.07.2011	26.10.2011	92
4	27.10.2011	26.01.2012	92
5	27.01.2012	26.04.2012	91
6	27.04.2012	26.07.2012	91
7	27.07.2012	26.10.2012	92
8	27.10.2012	26.01.2013	92
9	27.01.2013	26.04.2013	90
10	27.04.2013	26.07.2013	91
11	27.07.2013	26.10.2013	92
12	27.10.2013	26.01.2014	92
ИТОГО:	x	x	1096

В случае если дата выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата процентного дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим. Проценты на сумму процентного дохода по облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочими днями в настоящей Краткой информации понимаются выходные дни, государственные праздники и праздничные дни, являющиеся нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Процентный доход по процентным облигациям за первый период начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой начала размещения облигаций по дату его выплаты включительно. День начала размещения облигаций и день выплаты дохода за первый период начисления дохода считаются одним днем.

Процентный доход по процентным облигациям за последующие периоды начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период начисления дохода по дату выплаты дохода за соответствующий период начисления дохода (дату погашения). День выплаты дохода за предшествующий период начисления дохода и день выплаты дохода за текущий период начисления дохода (дата погашения) считаются одним днем.

Начисление процентного дохода осуществляется в течение срока обращения облигаций. Со дня истечения срока обращения облигаций процентный доход не начисляется.

Расчет процентного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за период начисления дохода, определенный в соответствии с настоящей Краткой информацией, по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения), уменьшенной на 0,5 (Ноль целых пять десятых) процентных пункта.

Расчет процентного дохода осуществляется по следующей формуле:

Д = (Н*П1*Т1 + Н*П2*Т2 + …. + Н*Пп*Тп) / (365(366)*100),

где:
Д – процентный доход по процентным облигациям, выплачиваемый периодически в течение срока их обращения;
Н – номинальная стоимость облигации;

П1, П2, Пп – ставка процентного дохода (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, уменьшенной на 0,5 (Ноль целых пять десятых) процентных пункта;

Т1, Т2, Тп – количество дней соответствующей части периода начисления процентного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма Т1 + Т2 +…+ Тп должна быть равна количеству дней в соответствующем периоде начисления дохода.

Расчет процентного дохода осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году (365 или 366 в високосном году).

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций (не представления владельцами облигаций измененных данных о банковских реквизитах), не переоформления счетов «депо» на новых владельцев в соответствии с законодательством Республики Беларусь, а также в иных случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на соответствующем счете Банка до непосредственного обращения владельцев облигаций (уполномоченных лиц). Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

При обращении владельцы облигаций представляют в Банк письменные заявления с указанием новых (измененных) банковских реквизитов, которые могут быть переданы нарочным (курьером) и (или) с использованием факсимильной связи с последующим обязательным представлением оригиналов заявлений на бумажном носителе. При необходимости переоформления счетов «депо», открытых в депозитарии Банка, владельцы облигаций обязаны предоставить документы, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

Выплата причитающейся владельцам облигаций суммы производится не позднее 1 (Одного) рабочего дня после представления Депозитарию ценных бумаг Банка необходимых документов.

Облигации предоставляют владельцу право на получение процентного дохода, а также номинальной стоимости облигаций при их погашении в денежных единицах, в которых выражена их номинальная стоимость. Процентный доход выплачивается только за полностью истекшие периоды начисления дохода.

7.11. Условия и порядок досрочного погашения облигаций

Досрочное погашение облигаций не производится.

7.12. Порядок погашения облигаций

Погашение облигаций производится 26.01.2014 на основании реестра владельцев облигаций. В случае если дата погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций (не представления владельцами облигаций измененных данных о банковских реквизитах), не переоформления счетов «депо» на новых владельцев в соответствии с законодательством Республики Беларусь, а также в иных случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на соответствующем счете Банка до непосредственного обращения владельцев облигаций (уполномоченных лиц). Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

При обращении владельцы облигаций представляют в Банк письменные заявления с указанием новых (измененных) банковских реквизитов, которые могут быть переданы нарочным (курьером) и (или) с использованием факсимильной связи с последующим обязательным представлением оригиналов заявлений на бумажном носителе. При необходимости переоформления счетов «депо», открытых в депозитарии Банка, владельцы облигаций обязаны предоставить документы, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

Выплата причитающейся владельцам облигаций суммы производится не позднее 1 (Одного) рабочего дня после представления Депозитарию ценных бумаг Банка необходимых документов.

При погашении облигации владельцу выплачивается в безналичном порядке номинальная стоимость облигаций, а также процентный доход за последний период начисления.

7.13. Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей погашения облигаций

Реестр владельцев облигаций составляется на дату, предшествующую двум рабочим дням дате начала погашения облигаций, указанной в пункте 7.9 настоящей Краткой информации (по состоянию на 23.01.2014).

7.14. Условия и порядок приобретения облигаций Банком до даты начала их погашения

В период обращения облигаций Банк может осуществлять досрочный выкуп облигаций у их владельца по истечении срока размещения облигаций, указанного в пункте 7.6 настоящей Краткой информации, ежеквартально в следующие даты: 26.08.2012, 26.11.2012, 26.02.2013, 26.05.2013, 26.08.2013, 26.11.2013. Выкуп облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке на основании договора купли-продажи, заключенного между владельцем облигации и Банком, и (или) на биржевом рынке в соответствии с регламентом Биржи, по текущей стоимости на дату выкупа.

В случае если день выкупа выпадает на нерабочий день, выкуп осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем, по цене, приходящейся на дату выкупа. Проценты на сумму облигаций, выкупаемых Банком, за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

Для продажи облигаций Банку владелец облигаций должен:

- не позднее пяти рабочих дней до даты выкупа предоставить в Банк заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:

наименование владельца облигаций;

наименование ценной бумаги;

количество облигаций, предложенных для продажи;

банковские реквизиты счета для перечисления денежных средств за проданные облигации (в случае если выкуп облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке);

согласие с условиями приобретения облигаций Банком, которые изложены в настоящей Краткой информации;

юридический адрес (место нахождения) и контактные телефоны заявителя;

подпись уполномоченного лица и печать заявителя – юридического лица.

- при выкупе облигаций на внебиржевом рынке:

обеспечить в порядке и сроки, определенные соответствующим договором купли-продажи, перевод указанных в заявлении облигаций со счета «депо» заявителя – юридического лица на счет «депо» Банка;

при необходимости предоставить в Банк карточку с образцами подписей, заверенную в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

- при выкупе облигаций на биржевом рынке:

в день выкупа перевести в соответствии с законодательством Республики Беларусь указанные в заявлении облигации на соответствующий раздел своего счета «депо» для участия в торгах на Бирже.

В случае несоблюдения владельцем облигаций сроков предоставления заявления о выкупе и (или) перевода указанных в заявлении облигаций – выкуп облигаций не осуществляется.

Банк имеет право осуществлять в соответствии с законодательством Республики Беларусь:

- продажу приобретенных облигаций Банка;
- иные действия с приобретенными облигациями Банка.

7.15. Дата и номер государственной регистрации облигаций

Облигации девяностого выпуска зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 29.12.2010, регистрационный номер 5-200-02-0949.

8. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрещении выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь

В случае запрета выпуска облигаций Банк в месячный срок с момента принятия такого решения Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь возвращает владельцу облигаций денежные средства, полученные в счет оплаты облигаций с уплатой процентов за пользование денежными средствами по ставке процентного дохода, равной ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения), уменьшенной на 0,5 (Ноль целых пять десятых) процентных пункта за текущий период начисления дохода, в котором принято решение о запрете выпуска облигаций.

9. Информация об обеспечении облигаций: состав и стоимость имущества, выступающего в качестве залога, основная сумма долга по кредитам, выданным банком на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости (жилищное строительство), сведения о поручительстве, банковской гарантии

Выпуск облигаций осуществляется без обеспечения по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь при условии, что общий размер обязательств по таким облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка (подпункт 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».

По состоянию на 01.11.2010 нормативный капитал Банка составляет 4 675 119,7 млн. бел. рублей.

10. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций)

С более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций) можно ознакомиться в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени.

Адреса филиалов Банка и телефоны, по которым можно получить справку о продаже облигаций:

г. Брест, ул. Воровского, 11, тел. (8-0162) 27-06-61, 27-06-01,
г. Витебск, ул. Димитрова, 31, тел. (8-0212) 35-00-21, 37-23-14,
г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, тел. (8-0232) 79-26-89, 79-26-33,
г. Гродно, ул. Советских Пограничников, 110, тел. (8-0152) 52-25-87,
г. Могилев, пр-т Мира, 55, тел. (8-0222) 29-37-50,
г. Минск, пр-т Победителей, 91, тел. (8-017) 209-77-91, 209-77-73,
г. Минск, ул. Ольшевского, 24, тел. (8-017) 228-59-02, 228-65-35,
г. Минск, пр-т Жукова, 3, тел. (8-017) 218-57-11.

Заместитель
Председателя Правления
ОАО «Белагропромбанк» **С.П. Чугай**

Главный бухгалтер
ОАО «Белагропромбанк» **М.А. Шаповалова**

Телефон Контакт-Центра Банка – 136
8.00–20.00 – рабочие дни, 8.00–18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Як спіш — так і жыць будзеш!

777

БРАЗІЛЬСКІЯ псіхолагі прааналізавалі позы, якія прымаюць пары падчас сну, і зрабілі адпаведныя высновы, паставіўшы кожнай пары дыягназ. Як высветлілася, мова цела красамоўна распавядае аб узаемаадносінах мужчыны і жанчыны, асабліва яскрава гэта праяўляецца ў сне, калі раскрываецца наша падсвядомае.

Абдымкі мядовага месяца. Пара ляжыць абняўшыся, літаральна сплёўшыся канечнасцямі. Гэта тыповая поза першых месяцаў адносін, вельмі эмацыянальная, але зусім нязручная і яе практычна немагчыма вытрымаць на працягу доўгага часу. Гэта ўдзячнасць за інтымную блізкасць, якая

толькі што адбылася. Такая поза азначае: «Кахаю цябе», «Хачу быць часткай цябе», «Мне падабаецца займацца з табой сэксам» (малюнак №1).

Краб. Калі вы ноччу заўважылі, што ляжыце на самым краю ложка, быццам бы адпаўзаючы ад партнёра (ёсць нават такія, хто спіць, паклаўшы свае ногі на галаву партнёра), то варта задумацца, бо адносіны знаходзяцца пад пагрозай. Аднак часам такая поза можа азначаць толькі тое, што вы — чалавек творчы, крэатыўны і ваша падсвядомасць выбірае лепшую ідэю (малюнак №2).

Шанэль. Сцёгны датыкаюцца, але кожны адварочваецца ў свой бок , фарміруючы позу, якая нагадвае эмблему маркі «Шанэль». Гэтая поза ўласціва партнёрам, якія ўжо ма-

юць пэўны вопыт сумеснага жыцця. Адносіны ў пары стабільныя, але ёсць імкненне да аднаўлення страчанай асабістай прасторы. Дотык да партнёра ў раёне «пятай кропкі» гаворыць: «Мы разам, але кожны — асоба» (малюнак №3).

Лыжачка ці коўшык. Пара спіць шчыльна, прыціснуўшыся адзін да аднаго, галовамі ў адным кірунку. Такая поза сцвярджае: «Мы дапаўняем адно аднаго» (малюнак №4).

«Калі вы любіце спаць ці засынаць у такой позе — вы намагаецеся наладзіць адносіны, верагодна, пасля пэўнага ахаладжэння», — каментуе спецыяліст па сямейнай псіхалогіі, аўтар кнігі «Мова цела і сямейная псіхалогія», псіхолаг Маркус Кардозу.

Пропасць. Кожны спіць на сваёй палове ложка, адвярнуўшыся. Хоць сама па сабе гэтая поза не з'яўляецца сінонімам крызісу ў адносінах, але калі партнёры пастаянна спяць спінай адзін да аднаго, прытрымлі-

ваючыся дыстанцыі, то гэта сведчыць аб існаванні праблем і нежаданні іх абмяркоўваць (малюнак №5).

Дах. Абодва партнёры спяць на спіне, адзін другога абдымае за плечы ці галаву. Гэтая пазіцыя дэманструе блізкасць, але адсутнасць сэксуальнай цікавасці, паколькі няма кантакту ў галіне сцёгнаў.

Гэта ж сімвалізуюць рукі партнёраў: кожны нацягвае прасціну, быццам бы імкнецца прыкрыць інтымную частку цела (малюнак №6).

Калыска. Дзяўчына спіць на грудзях у

мужчыны, які яе абдымае. Тыповая поза, характэрная для ўстойлівага саюзу. Рука жанчыны ляжыць на грудзях партнёра, ён абдымае яе, іх галовы датыкаюцца. Гэтая поза сведчыць аб гарманічных адносінах. Дзяўчына адчувае сябе за сваім мужчынам, як за каменнай сцяной. А ён цэніць яе за падтрымку і клопат. (малюнак №7)

Праследаванне. Поза, адваротная позе «коўшык». Жанчына альбо з'яўляецца лідарам у адносінах, альбо намагаецца ім стаць. Паколькі галава мужчыны імкнецца

пазбегнуць дотыку, можна меркаваць, што ён хоча захаваць ці павялічыць асабістую прастору (малюнак №8).

У пошуках кампрамісу. Жанчына адвярнулася ад мужчыны і спіць на сваім баку ложка. «Пакінь мяне ў спакоі, ва ўсялякім выпадку, на нейкі час», быццам заяўляе яна. Поза мужчыны — з нахілам галавы ў бок партнёркі і рукой, якая датыкаецца да яе пляча, — гаворыць аб тым, што ён гатовы чакаць, калі яна заспакоіцца (малюнак №9).

«Абдымкі» нагой. Рука жанчыны знаходзіцца пад целам мужчыны. Гэта сігнал аб тым, што партнёрка хоча адваяваць прастору. Пазіцыя нагі на назе партнёра гаворыць аб спробе навязаць сваю волю, выкарыстаць сваю ўладу, у тым ліку і сэксуальную. Поза дэманструе: адзін з партнёраў (той, хто кладзе нагу на партнёра) актыўна заваёўвае яго, спрабуе падпарадкаваць сабе (малюнак №10).

На думку Кардозу, гэтыя позы адлюстроўваюць наш эмацыянальны стан, аднак на працягу ночы чалавек інстынктыўна імкнецца заняць фізіялагічна больш зручную позу. І калі яна няправільная, то яму могуць сніцца кашмары, а пасля сну — балець галава, узнікаць пачуццё разбітасці і г.д. З рознымі варыяцыямі можна вылучыць тры галоўныя позы.

Спецыялісты аднадушны ў тым, што **поза на жываце** — самая дрэнная. Пры такой пазіцыі перакручаная шыя сціскае горла і артэрыю, што праходзіць у раёне ключыцы. Гэта ўскладняе дыханне і забеспячэнне арганізма кіслародам. Апроч таго, напружанне шыйнага аддзела пазваночніка стварае рызыку развіцця астэахандрозу і праблем з нервовай сістэмай.

Поза на спіне — не ідэальная, паколькі правакуе парушэнне рытму дыхання, вядзе да храпу і вядомая як «поза раптоўнай смерці» з-за спынення дыхання. Калі аддаяце перавагу ёй, то спецыялісты раяць спаць на невысокай падушцы ў форме валіка.

Рэкамендуецца спаць **у позе на баку** з адным удакладненнем: рукі павінны знаходзіцца ніжэй за плечавы пояс. У такім выпадку галава і пазваночнік застаюцца ў натуральным для сябе палажэнні. Калі ж рукі знаходзяцца ў палажэнні «пад шчочкай», то гэта прыводзіць да іх дрэннага кровазабеспячэння і зацякання. Лепш паклапаціцца аб добрай падушцы. У гэтай позе карысна заціснуць паміж ног коўдру, што адразу расслабіць мускулатуру ног і таза, і вы хутка засняце.

Іна АРЭХАВА.

У МАГІЛЁВЕ ПРАХОДЗІЦЬ ЕПАРХІЯЛЬНЫ ТУРНІР ПА МІНІ-ФУТБОЛЕ

У Калядным турніры бяруць удзел выхаванцы трох нядзельных школ пры цэрквах Магілёва і Магілёўскага раёна і ўдзельнікі двух праваслаўных ваенна-патрыятычных клубаў. У міні-футбол гуляе таксама і запрошаная каманда «Днепр-Stars». Матчы праходзяць у фізкультурна-аздараўленчым комплексе «Магілёўаблдарбуда». Арганізатары Каляднага турніру лічаць, што самае галоўнае — аб'яднанне дзяцей на аснове здаровага ладу жыцця і хрысціянскіх каштоўнасцяў.

Алена КАЗЛОВА.

Усміхнемся

— Што вы збіраецеся рабіць?! Нельга падчас руху з аўтобуса скакаць!

— Ды я ў бальніцу спяшаюся!

— А, ну тады добра...

☺

Пасля таго, як маленькі Віця навучыўся лічыць, тату давялося дзяліць пельмені пароўну.

☺

— Таварыш лейтэнант, вось вы ў акадэміі вучылі вышэйшую матэматыку. А яна вам у жыцці як-небудзь дапамагае?

— Ну вядома. Вось, напрыклад, дротам, сагнутым у выглядзе інтэграла, вельмі зручна даставаць агуркі з трохлітровага слоіка...

☺

Ці ведаеце вы, што для таго, каб у коле блізкіх сяброў вас паважлівa звалі «прафесар», неабавязкова шмат гадоў вучыцца ва ўсякіх акадэміях? Дастаткова вельмі дакладна разліваць паўлітра на траіх.

☺

У метро ў гадзіну пік:

— Вой, не цісніце так моцна, я і так скажу, што ела на сняданак!

☺

Калі ў жанчыны звоніць хатні тэлефон, яна абавязкова паглядзіцца ў люстэрка і паправіць прычоску, перш чым зняць трубку.



СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ДРУГАЯ КУЦЦЯ

Увечары 13 студзеня спраўляюць Другую — «багатую», або «шчодрую», куцю — Шчадрэц. Да стала рыхтуюць не менш за дванаццаць страў, каб «шчодра» жыць на працягу ўсяго года.

● Лічылася, калі гаспадыня напячэ перад багатай куццёй бліноў, то ў яе гаспадарцы жывёла будзе «гладкай» (здаровай).

● У «шчодрую» кашу гаспадыня клала пярсцёнак. Калі яго на пачатку вячэры выявіць гаспадар, то ўвесь год сям'я будзе жыць багата.

● Добра кармілі ў гэты дзень і свойскую жывёлу.

● Разбіўся посуд — бяда прыб'ецца.

● Да куцці трэба вярнуць усе пазыкі, каб не мець іх на працягу года.

● Вечарам 13 студзеня да заходу сонца трэба вынесці з хаты навагоднюю ёлку, а разам з ёю — усю адмоўную энергетыку, якую яна збірала ў хаце на працягу двух тыдняў.

● Лішак або нястача, спакой або спрэчкі ўказваюць на тое, што чакае чалавека на працягу года: «З чым застаў Новы год — з тым і застанешся».

Пералічаная мела дачыненне як да 1, так і да 14 студзеня. Залатое правіла нашых продкаў — «спачатку багам». Раней верылі ў «магію пачатку». Практычна любое першае дзеянне, звязанае з распачынаннем якой-небудзь адказнай справы, заслугоўвала асаблівай увагі і павагі. А распачынанне новага каляндарнага года — яшчэ якая адказная справа. Так што нашы дзеянні ў вышэйназваныя дні маюць асаблівае, сімвалічнае значэнне.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

Па гарызанталі: Рускамоўка. Ананас. Кайф. Рыба. Лема. Удоў. Аніс. Рыба. Шампіньён. Ядловіна. Ягад. Лар. Эпас. Цыганка. Ягнё. Кайф. Рыба. Дыяр. Ліда. Ягня. Тарзан.

Па вертыкалі: Аўдыторыя. Ананас. Ліра. Ягня. Ада. Ліда. Ягад. Ягня. Ананас. Ліра. Ліда. Ягня. Ліра. Ліда. Ягня. Ліра. Ліда. Ягня